# ARCHE Зьмест № 2’2000 СКАРЫНА


1. Зьмест / Уводзіны
2. Першы смех. Вацлаў Гавэл у ARCHE-Skaryna 2(7)-2000. "...Некалькі тыдняў таму, калі чэшская нацыянальная зборная перамагла на хакейным чэмпіянаце свету, на вуліцах нашай краіны прайшлі велічэзныя святкаванні..."
3. Каляндарык для кастрата. Валерка Булгакаў у ARCHE-Skaryna 2(7)-2000. "...Ніва..."
4. Яўрэйскі погляд на „жыдоўскі нумар“. Вольф Рубінчык у ARCHE-Skaryna 2(7)-2000. "...6 снежня 1999 г. выйшаў у свет „жыдоўскі нумар“ газеты „Наша Ніва“ (№ 33). Ён не зусім „жыдоўскі“, а напалову: на асвятленне яўрэйскай тэмы ў ім адведзена прыкладна пяць палос з 12. Тым не менш, з'ява гэтая неардынарная для сучаснай беларускай прэсы..."
5. Час імпэрыяў мінуўся. Андрэй Екадумаў у ARCHE-Skaryna 2(7)-2000. "...Прадмова да расейскага перакладу кнігі знакамітага экс-саветоляга Зьбігнева Бжэзінскага „Вялікая шахматная дошка“, прысьвечанай палітыцы ЗША і NATO на мяжы XX і XXI стагодзьдзяў, напісана генэрал-маёрам Юр’ем Кабаладзэ, прадстаўніком па сувязях з грамадзкасьцю Службы замежнай выведкі Расеі..."
6. Вісячыя Вертаграды. Вянок на магілу Семяжона Полацкага. Андрэй Хадановіч у ARCHE-Skaryna 2(7)-2000. "...Сутыкнуўшыся з баярынаўскай паэзіяй упершыню, я быў узрушаны, захоплены перадусім яе непадобнасьцю да ўсяго, з чым у нас трывала асацыююцца беларускія вершы..."
7. Дапісацца да міленіюму. Людміла Рублеўская ў ARCHE-Skaryna 2(7)-2000. "Крыніца, Некляеў, Станкевіч, Гётэ, Шніп, Бембель, Баярын, Наша Ніва, Васіль Быкаў, Дубавец, Арлоў, Дынько, Роўда, Бабіна, Булгакаў, Харэўскі, Бартосік, Прасаловіч, Скурко, Балахонаў, Глёбус, Адамовіч, Полымя, Дудараў, Баравікова, Барадулін, Іпатава, Далідовіч, Маладосць, Шамякін, Адамчык, Бум-Бам-Літ, Дамашэвіч, Казлоў, Літаратура і

мастацтва, Федарэнка, Першацвет, Калосьсе, Мінскевіч, Кавалёў, Nihil"

8. Босьнія становіцца нашаю, пакуль ёй баліць. Кшыштаф Чыжэўскі ў ARCHE-Skaryna 2(7)-2000. "...Я чытаю кнігу Роджэра Коэна „Жорсткасьць, што ўзрасла ў сэрцах: сагі Сараева“ ў аўстрыйскім Грацы, у старой вежы з гадзіньнікам: краявід зь яе працягнуўся далёка, аж да мяжы з Вугоршчынай ды Славеніяй. Ніжэй, на Закштрасэ 18, знаходзіцца будынак, які называлі раней домам Конрада ды ў якім 13 сакавіка 1863 году зьявіўся на сьвет Франц-Фэрдынанд, нашчадак трону Габсбургаў..."
9. Жыццё і смерць героя. Лоўрэнс Уэсклер у ARCHE-Skaryna 2(7)-2000. "...Ён быў вялікім чалавекам з вялікімі жаданнямі. „Чалавечыска-гара“, як апісаў яго на памінках Арыя Нэер, кіраўнік сорасаўскага Інстытуту Адкрытага Грамадства, па чыёй просьбе К'юні распачаў сваю місію дапамогі ў Сараеве, што стала ўжо легендарнай..."

[image]
**ARCHE - SKARYNA Зьмест 2(7)–2000**
[image]
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
2[image]–[image]2000
Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі
[image]
[image]

# ЗЬМЕСТ

**Вацлаў Гавэл:**
**Першы смех**
„Некалькі тыдняў таму, калі чэшская нацыянальная зборная перамагла на хакейным чэмпіянаце свету, на вуліцах нашай краіны прайшлі велічэзныя святкаванні. Мушу прызнацца: я глядзеў рэпартажы з гэтых святкаванняў з даволі змяшанымі пачуццямі, што часта здараецца са мной у такіх выпадках...“
**Валерка Булгакаў:**
**Каляндарык для кастрата**
„Адрыўны каляндар (ёсьць нешта пікантнае ў гэтым словазлучэньні — *адрыўны каляндар*) „Родны край" спраўляе свае дзесяцігадовыя ўгодкі. Ёсьць над чым паразважаць, ёсьць што згадаць, ёсьць нагода падзяліцца сваімі няпростымі меркаваньнямі...“
**Вольф Рубінчык:**
**Яўрэйскі погляд на „жыдоўскі нумар“**
„6 снежня 1999 г. выйшаў у свет „жыдоўскі нумар“ газеты „Наша Ніва“ (№ 33). Ён не зусім „жыдоўскі“, а напалову: на асвятленне яўрэйскай тэмы ў ім адведзена прыкладна пяць палос з 12. Тым не менш, з'ява гэтая неардынарная для сучаснай беларускай прэсы: на маёй памяці ўпершыню беларускамоўная газета падае аб яўрэях некалькі артыкулаў запар...“
**Андрэй Екадумаў:**
**Час імпэрыяў мінуўся**
„Прадмова да расейскага перакладу кнігі знакамітага экс-саветоляга Зьбігнева Бжэзінскага „Вялікая шахматная дошка“, прысьвечанай палітыцы ЗША і NATO на мяжы XX і XXI

стагодзьдзяў, напісана генэрал-маёрам Юр'ем Кабаладзэ, прадстаўніком па сувязях з грамадзкасьцю Службы замежнай выведкі Расеі. Як вядома, найбольш запамінальныя часткі нейкага паведамленьня — пачатак і канец...“

**Андрэй Хадановіч**:

**Вісячыя Вертаграды**

„Дзіўную рэч прапаноўваю я табе, аматар беларускай паэзіі, — рэцэнзію, якая спазьнілася больш чым на год. Сёньня дзьвюхтысячны, а яшчэ ў 1998-м у наяўнасьці меліся ажно два наклады — адзін самаробны, другі з „фрагмэнтаўскай“ сэрыі „Галерэя Б“ — кнігі вершаў „Шалёны вертаградар“, пра якую й пойдзе гаворка...“

**Людміла Рублеўская**:

**Дапісацца да міленіюму**

„1999 год, апошні перад прыходам таямнічага „міленіюму“ (слоўца ўплішчылася ў нашу мову з хуткасцю інфернальнага паразіта), не стаўся мяжою якаснага пераходу беларускай літаратуры ў іншы стан. Магія лічбаў не можа каталізаваць ні культурнае, ні тым больш эканамічнае жыццё. Выпілі ў навагоднюю ноч шампанскага, спалілі пару бенгальскіх агнёў, павесяліліся і ляглі спаць...“

**Кшыштаф Чыжэўскі**:

**Босьнія становіцца нашаю, пакуль ёй баліць**

„Я чытаю кнігу Роджэра Коэна „Жорсткасьць, што ўзрасла ў сэрцах: сагі Сараева“ ў аўстрыйскім Грацы, у старой вежы з гадзіньнікам: краявід зь яе працягнуўся далёка, аж да мяжы з Вугоршчынай ды Славеніяй. Ніжэй, на Закштрасэ 18, знаходзіцца будынак, які называлі раней домам Конрада ды ў якім 13 сакавіка 1863 году зьявіўся на сьвет Франц-Фэрдынанд, нашчадак трону Габсбургаў...“

**Лоўрэнс Уэсклер**:

**Жыцьцё і сьмерць героя**

„Я вячэраў з Фрэдам К'юні ў ягоны апошні вечар у Нью-Ёрк-Сіці. Была сярэдзіна тыдня і сярэдзіна сакавіка 1995 году. Як потым высветлілася, вячэраў ён у той дзень не з адным мною. Праз некалькі месяцаў на памінальнай сустрэчы ў Вашынгтоне прысутныя нібыта спаборнічалі ў пошуку самай трапнай характарыстыкі К'юні: нехта называў яго добрым анёлам, нехта — постімперскім, посткаланіяльным Лоўрэнсам Аравійскім,

нехта — гаспадаром над Катастрофамі...“

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]
**ARCHE зьмест 2(7)–2000 .** [image]

да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** [image] Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
[image]Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
[image]**Апошняе абнаўленьне: 8-04-2000**

да Зьместу 2(7)-2000 **Вацлаў Гавэл**

# Першы смех

Прамова прэзідэнта Чэхіі Вацлава ГАЎЛА
пад час атрымання ім прэміі „Адкрытае Грамадства“,
што прысуджаецца Цэнтральнаеўрапейскім універсітэтам.
*Будапешт, 1999 год*

**ВАЦЛАЎ ГАВЭЛ**
драматург, дысыдэнт пад час савецкай акупацыі Чэхаславаччыны, ад 1989 году — прэзыдэнт Чэхаславаччыны, пасьля — Чэхіі. Прамову „Першы сьмех“ мы перадрукоўваем паводле *The New York Review of Books*, 1999 з ласкавай згоды часопіса.

**Н**екалькі тыдняў таму, калі чэшская нацыянальная зборная перамагла на хакейным чэмпіянаце свету, на вуліцах нашай краіны прайшлі велічэзныя святкаванні. Мушу прызнацца: я глядзеў рэпартажы з гэтых святкаванняў з даволі змяшанымі пачуццямі, што часта здараецца са мной у такіх выпадках.
З аднога боку, я быў у захапленні. Чэшскае грамадства, звычайна схільнае да апатыі і скептыцызму, усё яшчэ можа атаесамляць сябе са сваімі нацыянальнымі камандамі, а значыць, з усёй краінаю. Я быў рады бачыць, што ў людзях усё яшчэ жыве нейкі першасны патрыятызм; што яны дагэтуль могуць узбуджацца, выходзіць на вуліцы, каб пацешыцца з добрых вестак, хоць ім самім ад гэтых вестак няма непасрэднай карысці.
З іншага боку, я адчуваў патрэбу задумацца над парай даволі непрыемных пытанняў. Напрыклад, калі людзі на вуліцах крычаць „Мы перамаглі!“, дык ці не прысвойваюць яны сабе дасягненні іншых, ці не шукаюць яны ў гэтай перамозе неапраўданага пацверджання сваёй уласнай вышэйшасці? Хто

на самой справе перамог у чэмпіянаце? Усе „мы“, у тым ліку й тыя, хто святкаваў на вуліцах? Ці толькі гульцы каманды, што рэпрэзентавала Чэшскую Рэспубліку? Ці быў гэты трыумф сапраўдным выяўленнем шчырай радасці з прычыны поспеху групы нашых суграмадзянаў, дасягнення, якое праславіла краіну? Ці гэта было, прынамсі, шмат для каго, проста нагодай папесціць ілюзіі наконт саміх сябе? А можа, гэтыя масавыя святкаванні былі ўсяго толькі праявай нежадання браць на сябе адказнасць за свет, а значыць, і праявай патрэбы змяшацца са статкам, каб раздзяліць калектыўнае пачуццё гонару і безадказнасці? Ці не былі яны проста сполахам змрочнай архетыповай любові да ўласнага племя, якое здаецца нам лепшым з усіх магчымых плямёнаў толькі таму, што нам выпала належаць да яго? А тыя, што пад час гэтых святкаванняў даводзілі выключнасць сваёй нацыі, нападаючы на людзей з іншым адценнем скуры, — хіба гэта не відавочны парастак чагосьці менш відавочнага, але нашмат больш небяспечнага, таго, што дрэмле ў нетрах эйфарыі? Магчыма, барацьба паміж адкрытым грамадствам і яго ворагамі, пра якую пісаў Попэр, таксама адбывалася пасярод натоўпу, што абмываў гэтую хакейную перамогу, і, магчыма, у пэўным сэнсе, у душы кожнага, хто быў там.

Не магу не прызнаць, што Гегель, якога Попэр (цытуючы Шапэнгаўэра) лічыў непісьменным шарлатанам, мабыць, у адным меў рацыю: рэальнасць ёсць дваістай. Фактычна, вельмі цяжка вызначыць мяжу паміж эйфарычнай і сапраўднай салідарнасцю, якая існуе ў дадзенай супольнасці (нацыянальным грамадстве, напрыклад), і статкавай ментальнасцю, пры якой тысячы і мільёны баязлівых і залежных „я“ хаваюцца за „мы“, што аўтаматычна пазбаўляе іх усялякай асабістай адказнасці. Дзе сканчаецца патрыятызм і пачынаюцца нацыяналізм і шавінізм? Дзе сканчаецца грамадская салідарнасць і пачынаецца інстынкт племя? Дзе сканчаецца міжвольнае і чыстае захапленне значным спартовым дасягненнем суграмадзянаў і пачынаецца прыўлашчванне плёну нечых здабыткаў безыдэйным і безадказным натоўпам?
Апроч гэтага, вельмі цяжка праводзіць межы іншых феноменаў, якія, тым ці іншым чынам, закранаюць ідэал адкрытага

грамадства. Як, напрыклад, пазнаць той момант, калі комплекс жывых ідэй пераўтвараецца ў мёртвую ідэалогію? Як зразумець, калі прынцыпы, меркаванні і надзеі пачынаюць камянець, ператвараючыся ў непадатную масу тэзаў, догмаў і інтэлектуальных стэрэатыпаў? Як даведацца, калі сапраўдная прага да ведання праўды пра свет саступае месца банальнаму памкненню да прэстыжу й празмернай ганарлівасці, дзеля якіх ён не можа адысці ні на трошкі ад аднойчы сфармуляваных думак? Або як вы пазнаяцй той момант, калі абстрактная думка, без якой не можа быць добрай палітыкі, пачынае ператварацца ў сацыяльную інжынерыю, марныя намаганні планаваць жыццё грамадства з дапамогай розуму?
Адкрытае грамадства (ці грамадства свабодных і свабодна аб'яднаных людзей, якія кіруюцца не нейкай ідэалогіяй ці нейкай асаблівай інтэрпрэтацыяй гісторыі і яе ўяўных законаў, але проста імператывам чалавечага здаровага сэнсу і асноўных маральных прынцыпаў), прадугледжвае адкрытых людзей з адкрытымі думкамі. Тое, што гэта прадугледжваецца, і дапамагае фармаванню і стварэнню такога грамадства.
Але зноў жа: як даведацца, калі вы свабодна выбіраеце і ўбіраеце ў сябе ўсё, стваранае вашым светам, а калі вы, наадварот, пачынаеце развівацца са сваёй свабодай, аддаючыся ў палон сваіх цёмных жаданняў, забабонаў, спрошчаных, але магутных ідэалагічных узораў, перастаяцй крытычна ставіцца да звабы дэмагогаў і папулістаў? Як пазнаць той момант, калі палітык перастае выказваць нашы натуральныя пачуцці і эмоцыі і пачынае ўжываць іх і злоўжываць імі для сваёй уласнай карысці?
Недзе ў вытоках цяперашняга вітку балканскіх жахаў, як мы цяпер ужо ведаем, ляжыць агрэсіўны энтузіязм сербскіх і харвацкіх футбольных фанатаў. Як мы можам вызначыць, у які момант нешта настолькі прыемнае і натуральнае, як падтрымка мясцовага спартовага клубу, незаўважна трансфармуецца ў змрочную прэлюдыю да этнічнай нянавісці, этнічных чыстак, этнічных войнаў і этнічных зверстваў?
Еўропа не здолела распазнаць той момант, калі гэта адбылося, і таму, са спазненнем на дзесяць год, мусіла самым непапулярным чынам навязваць тое, што, мабыць, яна магла нашмат лягчэй забяспечыць, калі б у пару распазнала прыкметы пагрозы і зрабіла адпаведныя высновы.

Гэтага не адбылося, і ў пэўным сэнсе фіяска Еўропы можна зразумець. Бо ж рэальнасць дваістая, і як ты разбярэш розныя яе абліччы і зараз жа прызнаеш той пункт, за якім бяскрыўдная радасць спартовых фанатаў раптам становіцца шаленствам скалечаных і нізкіх душаў?
Усё ж такі зараз мы ўваходзім у эру, калі здольнасць рабіць гэткія адрозненні будзе станавіцца ўсё больш і больш важнай, бо, улічваючы глабальную сутнасць сённяшняй цывілізацыі, любая, самая нязначная ўспышка нянавісці можа лёгка прывесці да ўсясветнай катастрофы. Чым тут кіравацца? Як праводзіць гэтыя адрозненні?
Дакладных прынцыпаў не сфармулюеш. Магчыма, увогуле не існуе ніякіх прынцыпаў. Адзінае, што я магу цяпер рэкамендаваць, гэта пачуццё гумару, здольнасць бачыць у рэчах смешнае і абсурднае, смяяцца з іншых і з сябе, магу рэкамендаваць іранічнае стаўленне да ўсяго ў гэтым свеце, што выклікае смех. Іншымі словамі, я магу прапанаваць толькі перспектыву і дыстанцыю. Свядомасць усіх небяспечных відаў пыхі, як у іншых людзях, так і ў нас саміх. Цвярозы розум. Сціплую ўпэўненасць у значэнні рэчаў. Удзячнасць за дар жыцця і мужнасць адказнасці за яго. Пільнасць духу.
Тыя, хто захавалі здольнасць усведамляць сваю смешнасць ці нават бязглуздасць, не могуць быць ганарлівымі й не могуць быць ворагамі адкрытага грамадства. Вораг — гэта чалавек з зацята сур'ёзным тварам і агнём у вачох.
*Пераклала з ангельскай*
*Аляксандра Андрыеўская*
паводле *The New York Revue of Books, 1999.*

---

**Мікалай Улашчык**
**Краязнаўства: Нататкі пра бадзяньні ў 1924-1929 гадах. З рукапіснай спадчыны**
Менск, Пейто, 1999
Рукапіс, што захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (перададзены аўтарам на пачатку 70-х), быў падрыхтаваны да друку Я.Кісялёвай і В.Скалабанам. А напісаны тэкст быў у 1937-1941 гадах, у пэрыяд між двума арыштамі.
„Краязнаўства" беларускага гісторыка дае багаты матэрыял для дасьледчыкаў гісторыі Беларусі 20-х гадоў XX стагодзьдзя. У ім

падрабязна, жыва і ярка апісаная дзейнасьць краязнаўчага таварыства Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Аматары прыгожага беларускага слова знойдуць калярытныя замалёўкі са студэнцкага, камсамольскага і вясковага жыцьця, майстарскія характарыстыкі многіх вядомых дзеячаў беларускай навукі й культуры. Асабліва цікавыя зробленыя з натуры замалёўкі Тураўшчыны.
За апошнія месяцы ў краязнаўчай сэрыі выдавецтва „Пейто“ „Ведаць свой край Беларусь“ зьявіліся таксама краязнаўчыя нарысы Н.Вайцяховіча „Шацак“ і А.Махнача „Нізок“ (накладам 1000 асобнікаў). „Краязнаўства“ Ўлашчыкава, на жаль, выйшла накладам толькі 150 асобнікаў.
Даведацца пра кнігі выдавецтва можна па тэл. **(017) 232 31 98, 232 04 52**

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 12-04-2000**

да Зьместу 2(7)-2000 **Валерка Булгакаў**

# Каляндарык для кастрата

*Родны край. Адрыўны каляндар на 2000 год. Менск, „Беларусь“, 1999.*

**ВАЛЕРКА БУЛГАКАЎ**
галоўны рэдактар часопіса ARCHE, аўтар эсэ „Мой Багушэвіч. Дыялектыка клясычнага тэксту“ („Фрагмэнты“, 1998). Апошняя ягоная публікацыя — артыкул „Блізіня нуля: пра філязофію і „філязофію“ беларускіх думаньнікаў“ (ARCHE—Паталёгіі грамадзтва).

Адрыўны каляндар (ёсьць нешта пікантнае ў гэтым словазлучэньні — *адрыўны каляндар*) „Родны край“ спраўляе свае дзесяцігадовыя ўгодкі. Ёсьць над чым паразважаць, ёсьць што згадаць, ёсьць нагода падзяліцца сваімі няпростымі меркаваньнямі. Прычым зусім неабавязкова трымацца ў пастаце казённай урачыстасьці, выдаваць флюіды надзвычайнай захопленасьці, бо мы падводзім рысу, адзначаем прамежкавы фініш на шляху з пункту А ў пункт Б. Сапраўдная радасьць моманту не павінна быць азмрочана няўклюднымі воклічамі і робленымі заклікамі.

Шмат што і шмат кім прамоўлена пра каляндар, але, нягледзячы на гэта, за ім непазьбежна крыецца пэўная загадка. Дзіва што, асявая лінія календара заходзіць так далёка, туды, куды ня дадзена зазірнуць ніводнаму сьмяротнаму. Каляндар як бы парадкуе нашу найбліжэйшую будучыню, па-чалавечаму сыстэматызуе хаатычную хаду часу, спрабуе забясьпечыць стабільнасьць і пасьлядоўнасьць нашай гісторыі. Таму каляндар — гэта нешта вельмі чалавечае, амаль жывое, прасякнутае людзкім духам, як спрацаваныя рукі бабулі. Каляндар, выходзячы з паўсюднага стаўленьня да яго, ня

проста рэч, а хутчэй брама ў добра невядомае, якое дзякуючы яго магічнай сіле якраз і стаецца добра вядомым. Каляндар ня проста кніга, і таму яго не чытаюць — у яго ўзіраюцца, нібы прагнучы за сухімі фармулёўкамі і банальнымі выразамі адшукаць толькі адно, праўду, праўду давяроную. Мабыць, дзеля таго што людзі надзяляюць каляндар праўдай — праўдай пра тое, што было, і пра тое, што будзе — адны баяцца яго, а другія паважаюць. Бы містычнае мігатлівае шкельца, каляндар робіць нябачнае бачным, даючы празрысты адказ на пытаньне, што такое вечнасьць і куды яна рухаецца.

Можна доўга гаварыць, чым стаў адрыўны каляндар „Родны край“ для масаў, у чым палягае фэномэн ягонай прыцягальнасьці. Кожны тут называе сваё: Грыша — чытэльнасьць, Міша — агульнадаступнасьць, Тоня — інфармацыйнасьць, Валодзя — павучальнасьць і нізкую цану, а Іван — займальнасьць і вялікі тыраж. Даводзілася чуваць і больш разгорнутыя рэплікі. Сёй-той кажа, што гэта адзіны каляндар такога фармату на нашай мове (дарма што летась зьявіўся патэнцыйна небясьпечны канкурэнт — „Каляндар агародніка і садавода“, выдадзены выдавецтвам „Ураджай“), а з гэтага, уласна, і вынікае ягоная неаспрэчная вартасьць. Вартасьць, трэба дадаць, вельмі беларуская і да болю знаёмая. У дадзенай сувязі, аднак, нас будзе ня столькі займаць пошук і фармуляваньне вартасьцяў (прысутнасьць іх відавочная, хаця і матываваная пераважна пачуцьцёва) календара „Родны край“, колькі знаходжаньне слабых месцаў ці, выкарыстоўваючы савецкі канцылярыт, недапрацовак у ім. Іншымі словамі, задамося пытаньнем, чым жа ён усё-такі ня стаў, нягледзячы на дзяржаўную падтрымку і мэтавае фінансаваньне.
Пачнем з назову „Родны край“. Ён ляжыць у рэчышчы рустыкальна-нацыянальна-рамантычнай традыцыі першай паловы XX стагодзьдзя беларускіх адраджэнцаў і кнігавыдаўцоў сялянскага паходжаньня. Да таго ж, стваральнікі календара тут неарыгінальныя, аднайменная газэта выдавалася ў Горадні ўлетку 1919 году. Зрэшты, ня гэта галоўнае.
На працягу свайго існаваньня аўтарскі калектыў календара перажыў досыць важкія зьмены. Былі часы, калі ў каляндар пісалі вядучыя прадстаўнікі беларускай нацыянальнай эліты. Дастаткова згадаць, напрыклад, мовазнаўцу і грамадзкага

дзеяча Вінцука Вячорку, філёзафа і астранома Сяргея Санька, гісторыка Алега Дзярновіча, знаўцу беларускіх архіваў і чалавека глыбокай гуманітарнай эрудыцыі Вольгу Бабкову. Цяпер, нарэшце, аўтарскі калектыў „Роднага краю“ стабілізаваўся. Яго робяць 11 чалавек тэхнічнага пэрсаналу на чале з складальніцамі Валянцінай Хайрулаўнай Балвановіч і Валянцінай Яўгенаўнай Кудзінай і кола аўтараў, якое ўтвараюць (падаем у аўтэнтычным „разнабойным“ напісаньні) Н.Е.Болсун, Янка Саламевіч, А.Вячорка, Аляксей Ненадавец, А.І.Аўдзеева, Лідзія Фарботка, Эдуард Самусенка, Т.У.Лапкоўская, Алена Васілевіч, Н.Г.Сакалоўская, Алег Фомчанка, Андрэй Болатаў, В.С.Цітоў, Т.В.Кекелева, Людміла Трэпет, Л.Л.Кароткая, У.Юрэвіч. Гэтыя аўтары ў масе сваёй пішуць пераважна на тэмы літаратуры, гісторыі, права, і толькі Эдуард Самусенка расказвае пра сабак, кажаноў і грыбы.
Каб зрабіць каляндар больш рэспэктабэльным і прэзэнтатыўным альбо каб стварыць уражаньне большай разнастайнасьці ў творчым калектыве, некаторыя аўтары, збольшага з акадэмічнага інстытуту літаратуразнаўства і выдавецтва „Беларуская Энцыкляпэдыя“, пішуць ужо які год пад квяцістымі псэўданімамі Я.Ацоўклы, Я.Волат, А.Валошка, Яніслаў Салам-бей, Я.Асіна, Я.Гарчыца (такому пісаць бы пра кулінарыю), Н.І.Матэматык, Я.Бярозкін, Ян Самадзейнік, Б.Янчук, А.Альбатрос, Я.Уніят, Я.Школьнік, Я.Бабура, Б.Анатолеў. Гэткія мянюшкі таксама належыцца ўспрымаць выходзячы з памянёнай рустыкальна-нацыянальна-рамантычнай парадыгмы — кожны больш-менш абазнаны ў беларускай літаратурнай традыцыі чалавек згодзіцца, што шэраг пералічаных псэўданімаў існаваў ужо раней, а мянюшка Волат страчалася нам на старонках беларускай калябарацыйнай прэсы ў другую сусьветную вайну. Што ж, такі аўтарскі выбар.
Будова календара наўпрост прадвызначана дадзеным творчым калектывам. Нагадаем для тых, хто ня ведае, што „Родны край“ складаецца з трох тэкстава-тэматычных блёкаў — найвялікшы зь іх становяць ананімныя перадрукі з расейскіх навукова-папулярных часопісаў і нейкіх іншых крыніцаў у рубрыках накшталт „Гэта цікава“, „Каляндар агародніка“, „Каляндар садавода“, „Ваша здароўе“, „Кулінарныя рэцэпты“, „Народная медыцына“, „Пакаёвыя расліны“, „Жывы куток у доме“,

„Абарані сябе сам“. Паказальна, што калі раней напрыканцы артыкульчыка ў гэткім блёку стаяла пазначэньне таго, адкуль ён быў узяты, напрыклад, паведамлялася, што тэкст падрыхтаваны паводле часопіса „Химия и жизнь“ альбо „Наука и техника“, то цяпер гэтага ня робіцца немавед зь якой прычыны, ці то каб чытача ня мучыць лішняй інфармацыяй, ці то наша інтэграцыя з Расеяй зайшла так далёка. У другім тэкстава-тэматычным блёку зьмяшчаюцца зацемкі названага вышэй аўтарскага кола. Трэці блёк ахоплівае перадрукі вядомых твораў вядомых пісьменьнікаў (толькі адзін раз, здаецца, рэдакцыя календара пайшла на экспэрымэнт і апублікавала графаманскі верш пра родную мову і гістарычныя сымбалі народу якогась свайго дапісчыка ў рубрыцы „Творчасць нашых чытачоў“), прычым зусім няясна, паводле якіх крытэраў адбываецца адбор. Напэўна, і няма тут ніякіх крытэраў, а ўсё вырашае імя. Імёны Васіля Зуёнка, Ніла Гілевіча, Міколы Федзюковіча, Генадзя Бураўкіна, Сяргея Дзяргая, Максіма Багдановіча, Уладзімера Караткевіча, Раісы Баравіковай, Максіма Танка, Леаніда Галубовіча і фігуруюць у гэтым блёку, прыносячы жывым ганарары, а памерлым — несьмяротнасьць.

Асобна вылучым інфармацыю, якая плаўна перацякае з выпуску ў выпуск. Яна датычыць астранамічных зьвестак, мянінаў і мяніньнікаў. Дарма што ўсё гэта паўтараецца з году ў год і нават з старонкі на старонку, праблема ўсё роўна не здымаецца. Рэч у тым, што веды аб беларускай мове ў складальнікаў календара, відаць, няпоўныя і фрагмэнтарныя; інакш бы яны не дапусьцілі такога страшнага хаосу, які трывала ўладзіўся ў іхным калектыўным творы.
Пачнем з таго, што для складальнікаў існуюць наступныя „асноўныя фазы Месяца: маладзік, першая квадра, поўня, апошняя квадра“. Цьверджаньне гэтае абсурднае па вызначэньні, бо ўяўляе сабой тэрміналягічны нонсэнс: зьмяшэньне беларускіх народных назваў (*маладзік*, *поўня*, *сход*, *ветах* (*вятох*) фазаў Месяца зь іх больш кніжным пазначэньнем (*першая*, *другая*, *трэцяя*, *чацьвертая квадра*). Дзікасьць гэтая ўпарта тыражуецца на працягу ўсёй гісторыі календара фактычна на кожнай ягонай старонцы. З году ў год пры падачы астранамічных зьвестак таксама тыражуецца няўцямнае

словазлучэньне „ранішняя зара“ („абедзве планеты з’яўляюцца ў промнях ранішняй зары“) — літаральны пераклад расейскага „утренняя заря“, тымчасам як па-беларуску адвеку было, ёсьць і будзе „заранка“.

Ня менш сумна справа стаіць зь беларускім іменьнікам. Таварышам складальнікам цяжка даецца беларуская мова, і таму каляндар ператвараецца ў суцэльны рэбус. Так, у лістку ад 20 верасьня апавядаецца пра *Плацыда* Янкоўскага, а ўжо 5 кастрычніка сярод мяніньнікаў пазначаны *Пляцыд* (тут і далей вылучана мною; назвы падаюцца ў арыгінальным напісаньні. — **Аўт.**). Лісток ад 21 верасьня гаворыць пра каталіцкія мяніны *Матэвуша* і *Мацея* (а можа, гэта адно і тое ж імя ў розных фанэтычных формах?). Складальніцкая нядбайнасьць асабліва выразна праяўляецца на „каталіцкай“ частцы іменьніка — тут *Шыман* (бел. *Сымон*, што, мабыць, па памылцы, і засьведчана ў лістку ад 18 лютага; у „праваслаўнай“ частцы іменьніка ёсьць нейкі дзіўны *Сіман*) суседнічае зь *Сцяпанам* (чаму ўжо ня з Стэфанам?), *Іаанна* (бел. *Яніна*, зірні лісток ад 24 мая, 21 жніўня etc.) з *Галенай* (лісток ад 22 мая), *Геленай* (лісток ад 13 жніўня) і нарэшце *Аленай* (падаецца ў каталіцкай частцы іменьніка ў лістку ад 2 сакавіка), *Юдзіта* (адсюль недалёка да *Юдзіфі*) з *Руфінай* (у лістку ад 7 красавіка гэта чамусьці мужчынскае імя), *Эдуард* (кат. *Эдвард*) зь *Ежы* (бел. кат. *Юры*), *Лявон* (ці ня лепш ужо *Леан*, таварышы?) з *Катарынай*. У межах адной і той жа тэкставай прасторы суіснуюць *Нікіфар* і *Нічыпар*, *Піліп* і *Філіп*, *Крыстына* і *Хрысціна*, *Беніямін* і *Веньямін*. Слова *Ежы* для складальнікаў календара — нескланяльны назоўнік, а вось імя Бруна, чамусьці, скланяецца так, як у польскай мове, у Р.скл. маем *Брунона* (лісток ад 17 мая; зрэшты, мы гатовы паверыць, што, на думку складальнікаў, існуе каталіцкае хрышчонае імя Брунон). Для іх праваслаўнаму *Іосіфу* адпавядае каталіцкі *Юзаф* (тут складальнікам трэба аддаць належнае, праведзена гэтая ўстаноўка пасьлядоўна), а гаротны беларускі *Язэп* узумеў прабіцца ў каляндар толькі аднаго разу, у якасьці казачнага пэрсанажа ў „бываліцы“ Лідзіі Фарботкі „Ножкі“ (гл. лісток ад 5 красавіка). Нават з канчаткамі ў каталіцкіх імёнах аўтарам цяжка вызначыцца, не гаворачы ўжо пра перадачу грэцкай „тэты“: побач зь *Мяфодзіем* (больш лягічна было б, прызнацца, падаць форму Мятод) стаіць *Цэзар*, *Банафац*, *Апалінар* (нулёвы канчатак). Паўсюль прысутны *Амяллян* так і

ня здолеў дамагчыся, каб вытворнае імя па бацьку загучэла як Амяллянавіч. Не, нашто жарсьці разводзіць, у лістку ад 23 лістапада маем *Дзмітрыя Емельянавіча*.
Пасьля такога лексычная неўнармаванасьць „Роднага краю“ ўспрымаецца чымсь натуральным, каб не сказаць заканамерным. Пагатоў, што для гэтага існуе выдатная база — акадэмічны інстытут мовазнаўства ўсю сваю працяглую, па беларускіх мерках, гісторыю толькі тым і займаецца, што разбурае ўсякую сыстэмнасьць у беларускай мове, дашчэнту выпальваючы рэшткі Богам ёй дадзенай самабытнасьці (іншымі словамі, замест таго, каб культываваць культуру мовы, ён прызначаны ажыцьцяўляць каляніяльны кантроль над мовай). Хочаш пісаць *карандаш*, пішы *карандаш*. Хочаш пісаць *апасна*, пішы *апасна*. А наш аўтарскі калектыў інакш ужо ня тое што ня хоча — ня можа пісаць, бо, праўдападобна, думкі-згадкі пра беларускую мову ў яго зьяўляюцца ў стамляльных перапынках паміж вязаньнем на працоўным месцы і расьпіцьцём танізуючых напіткаў там жа. Таму мы абстрагуемся ад таго, як можна пісаць згодна з устаноўкамі нашых афіцыйных моўных аўтарытэтаў (а гэтага так дужа ў календары, тут і „фруктовы чай“, і „хітруга“, і „лаханка“, і „бугаркі“, і „мяшочкі“, і „болт“, і „састаў“, і „попусту“, і „кафейная гушча“, і „сметанковае масла“, і „цвятная капуста“, і „варка і смажэнне“, і „ачагі паражэння“, і „няўступчывы“, і „няўжыўчывы“, і „грэчаскі“, і шмат-шмат іншага), і зьвернемся да таго, як нават у адпаведнасьці зь іхнымі рэкамэндацыямі пісаць нельга. Балазе, што і такіх прыкладаў тут густа. „А *сталешніцу* пажадана да іх не прыбіваць...“ (лісток ад 27 жніўня) — па-беларуску будзе *стальніца*. „Супраць раздражнення прымяняйце „*Лунную* санату“ Бетховена...“ (12 лістапада) — па-беларуску будзе „*Месячная* саната“. „Кіслую капусту перабраць, вялікія кавалкі *змяльчыць*“ (19 лютага) — па-беларуску *здрабніць*, *патаўчы*. „1 сталовая лыжка семя заліваецца 1 *стаканам* гарачай вады...“ (20 кастрычніка) — па-наску будзе *шклянка* (пара б ужо запомніць!). „3 гэтай задачай выдатна справяцца чорны перац, мускатны арэх, *гваздзіка*...“ (17 студзеня) — па-беларуску будзе *гвазьдзік* (мужчынскі род). „Пасля мыцця напоўніце ракавіну гарачай вадой з дабаўленнем 3-4 лыжак *хлоркі*...“ (23 сакавіка) — нават паводле „наркомаўскай“ кадыфікацыі будзе *хлёрка*. „Медыцынскія *банкі*... Каб паставіць *банкі*, патрэбна пэўнае

ўменне“ (28 кастрычніка) — па-наску будзе *банькі*.

Асобнай гаворкі заслугоўваюць стылёвыя памылкі і фактычныя недакладнасьці ў гэтым выданьні, якія таксама збольшага вынікаюць з элемэнтарнай неахайнасьці і неадчуваньня нутраной сутнасьці мовы, ейнага іства. „...На Берасцейскім *вольным* сойме Жыгімонт І Стары перадаў уладу...“ (лісток ад 4 лютага) — ведама, маецца на ўвазе *вальны сойм*, але таварышы складальнікі разам з таварышамі карэктарамі вырашылі, праўдападобна, на ўсякі выпадак перастрахавацца. „Пацукі не адчуваюць хуткай гібелі карабля і *часцей* ідуць на дно разам з суднам“ (6 красавіка) — тут і далей, як кажуць, без камэнтароў. „Ірына Канстанцінаўна *плануе* большую частку атрыманай прэміі менавіта на *гэтыя мэты*“ (14 мая). „Беларус ... не проста апрацоўвае зямлю, а бадай што *свяшчэнна дзействуе* ў кожным сваім земляробчым акце“ (7 мая). „*Вечназялёныя кусты* з прадаўгавата-эліптычным цёмна-зялёным бліскучым лісцем у залаціста-жоўтыя плямы, за што *атрымала* назву „залатое дрэва“ (лісток ад 30 сакавіка). „Яшчэ адным моцным захапленнем былі шахматы. *Іграў* ён выдатна, і калі трапляўся дастойны партнёр, то мог *гуляць* гадзінамі“ (лісток ад 22 лістапада). „Літаратурная дзейнасць Сваяка стала прадаўжэннем яго клопатаў духоўніка“ (лісток ад 19 лістапада). „Электрапліта — найбольш энергаёмкі прыбор з усіх прымяняемых сёння ў хатняй гаспадарцы... Справа ў тым, што цяпло ад паверхні *канфорак* да *дна посуду* павінна перадавацца за кошт іх шчыльнага прылягання *адзін да аднаго*“ (лісток ад 4 сьнежня). „...малады беларускі пісьменнік Змітрок Астапенка на пачатку Вялікай Айчыннай вайны *ўцёк* з лагера на фронт“ (лісток ад 23 лістапада).

Стыхія цьмянасьці і блытаніны навальваецца на чытача ад самага пачатку календара. Вот, напрыклад, трапляеш на лісток ад 4 студзеня і чытаеш зацемку аўтарства Н.Е.Болсун пра палымяную рэвалюцыянэрку XIX ст. Марыю Ўладзіміраўну Багушэвіч, якая нарадзілася ў вёсцы *Цацэрка* Слуцкага павету і мела „партыйную мянушку *Венера*“. Разгортваеш пасьля першы том „Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі“ і бачыш артыкул пра тую ж самую асобу, напісаны В.М.Чарапіцам[1]. І аказваецца, што Марыя Багушэвіч нарадзілася ў вёсцы *Цапэрка*, а мянюшка ейная была *Вянеда*. Або іншая праява. У лістку ад 3 лістапада

Янка Саламевіч вядзе аповед пра польскага рэвалюцыянэра XIX стагодзьдзя Зыгмунта Глогера, які нарадзіўся ў вёсцы Камёнка Ломжынскага павету і скончыў Кракаўскі ўнівэрсытэт. Тымчасам Генадзь Каханоўскі ў „Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі“[2] сьцьвярджае троху іншае: Зыгмунт Глогер прыйшоў на сьвет у вёсцы КамЕнка Падляская і ўнівэрсытэт скончыў ня Кракаўскі, а Варшаўскі. Згодна з інфармацыяй, пададзенай у календары ў лістку ад 21 чэрвеня, беларускі мастак Браніслаў Залескі нарадзіўся ў 1820 годзе ў мястэчку Вызна на Случчыне. Тымчасам „Энцыкляпэдыя літаратуры і мастацтва Беларусі“ настроена на іншы лад, а наймя, што гэты самы мастак нарадзіўся ў 1819 годзе і ў вёсцы Рачкавічы[3].
Каму верыць, да каго апэляваць?
У сваім насьледаваньні расейскім першаўзорам аўтары календара заходзяць так далёка, што губляецца тонкая, але відавочная грань паміж рацыянальным і ірацыянальным, камічным і трагічным, велічным і мізэрным. Давайце разам учытаемся ў лісток ад 20 лютага: *„само слова „абцас“ утварылася ад турэцкага „кахблук“, якое ў сваю чаргу пайшло ад арабскага „каб“ — пятка*“.
Што гэта, сэнсацыйны пераварот у этымалягічнай ведзе або скандальны ляпсус, які тлумачыцца мэханічным пераносам расейскіх рэаліяў на беларускі грунт? Зразумела, другое, і толькі застаецца ціха дзівавацца, куды глядзелі рэдактары, карэктары, а таксама тэхнічныя работнікі.

Зрэшты, годзе прыкладаў. Надыходзіць час рабіць абагульненьні.
Гаворачы на пачатку пра фэномэн календара, мы забыліся прамовіць яшчэ адну вельмі важную рэч. Нездарма людцы кажуць, што існуе *каляндарны* год. Каляндарны год у найменшых драбніцах прадвызначаецца календаром. Больш за тое, у мове атрымалі паўнапраўнае грамадзянства паняцьці палітычнага календара, культурнага календара, календара падзеяў, спартовага календара, рэлігійнага („праваслаўнага“) календара, аграрнага („агародніка і садавода“) календара, краязнаўчага календара. Каляндар „Родны край“ арыентуе нас на будучыню, якая ёсьць люстраным адбіткам мінуўшчыны — нездаровай, бяззорнай і *мешкаватай*, пазбаўленай далёкасяжных арыенціраў і нутраной працягласьці, будучыні, у

якой плюсы будуць пераблытаныя зь мінусамі, а людзі — зь іхнымі ценямі.
У дасканаласьці авалодаць майстэрствам пачынаць з нуля і канчаць нулём беларускай інтэлігенцыі дапамагае адмысловая этыка. Не, гаворка зусім ня йдзе пра прыстасавальніцтва ці прыслужніцтва. Яна тычыцца таго, як трэба быць. А каб ня страціць давер і захоўваць магчымасьці службовага росту ў нашай дзяржаве, якую язык не павернецца назваць нацыянальнай дзяржавай беларусаў, мусова выконваць пэўныя „залатыя“ правілы. Правіла першае можна сфармуляваць так: рэгулярна глядзець беларускае тэлебачаньне і слухаць беларускае радыё, у палітыку не мяшацца, г.зн. быць дастаткова цікаўным, каб праглядаць ці праслухоўваць выпускі навінаў, але рабіць з гэтага адзіны правільны вывад, што „ўсё роўна падмануць“. Правіла другое: не рабіць штучных адрозьненьняў паміж Беларусяй і сумежнымі дзяржавамі СНД, „бо мы былі, ёсьць і будзем разам“. Правіла трэцяе: беларускую мову ўжываць толькі за рабочым сталом, і рабіць у ёй як мага больш памылак/непасьлядоўнасьцяў, бо „інакш людзі не зразумеюць“. Правіла чацьвертае: паважаць тое, што ёсьць, заўсёды трымацца напагатове і праяўляць пільнасьць, каб нэўтралізаваць варожыя вылазкі. Правіла пятае: займаць увогуле прынцыповую пазыцыю, але закрываць вочы на асобныя недахопы і пралікі. Правіла шостае: абярняся наракаць на быт, але не праяўляць поўнага расчараваньня ў жыцьці. Правіла сёмае: выступаць за адзінства і калектывізм, і справядліва сумлявацца ў эфэктыўнасьці дзейнасьці паасобку. І, нарэшце, правіла восьмае: не дэманстраваць, у выпадку наяўнасьці, сваю перавагу — ня важна, якую — над асобамі „кіруючага саставу“, пастаянна пацьвярджаць сваю прафнепрыгоднасьць альбо абмежаваную прафпрыгоднасьць, ствараючы тым самым надзейны працоўны мікраклімат у калектыве, а саму працоўную дзейнасьць ператвараючы ў эратычна афарбаваную гульню.
Гэтая абмежаваная прафпрыгоднасьць стаецца сапраўдным крыжам крыжаваць Беларусь — ілжэвыкладчыкі зь дзяржаўных і недзяржаўных унівэрсытэтаў у нас суседнічаюць з ілжэпісьменьнікамі з „Бум-бам-літу“ і з ілжэпалітыкамі з народнага фронту, ілжэнавукоўцы з Акадэміі навук — з ілжэдактарамі з платных і бясплатных паліклінік, а нядбайныя

будаўнікі і мэталюргі — з фальшывымі прарокамі. А ў абсягу рэчаў, матэрыяльных і нематэрыяльных субстанцыяў — ілжэкалендары без мэталёвых „мацакоў“, каб хоць да сьцяны іх прычапіць, з ілжэвойскам, ілжэнародная гаспадарка — з ілжэсыстэмай ілжэнароднай асьветы, ілжэўсенароднае волевыяўленьне — з ілжэнацыянальнай сымболікай. Над усім гэтым высіцца постаць першага прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, ілжэпрэзыдэнта *par excellence*, свойскага ў дошку. Апошняе пытаньне, якое патрабуе неадкладнага адказу, будзе гучаць так: што такое „Родны край“ для складальнікаў календара? Назоў календара больш як двухсэнсоўны. Згодна з афіцыйным моўным стандартам ці, хутчэй, этыкетам[4], слова „край“ мае тры значэньні: „1. Канечная лінія, якая абмяжоўвае якую-н. паверхню, а таксама частку паверхні, што прылягае да гэтай лініі; 2. Вобласьць, мясцовасьць, што вылучаюцца па якой-н. характэрнай прыкмеце; 3. Буйная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў СССР“. Дзеля таго што трэцяе „афіцыйнае“ значэньне слова „край“ адразу адпадае зь ведамых усім прычынаў, нам даводзіцца канстатаваць, што пад „родным краем“ тут маецца на ўвазе ўзьмежны ўскраек вялікай паверхні-прасторы, які выклікае нейкія асабіста матываваныя перажываньні і эмоцыі ў пэўнай групы асобаў. Як правіла, так зразуметы „родны край“ адпавядае клясычнаму вобразу „малой радзімы“, ён ляжыць наводшыбе вялікай айчыны, падданымі якой і ўяўляюць сябе міжвольныя яго сымпатыкі. „Край“ як „малая радзіма“ адчуваецца сэрцам, і таму асацыюецца зь нечым хірлявым і няўстойлівым, залежным ад нечай прыхамаці. Айчына ж, „вялікая радзіма“, гэта стабільнасьць і грунтоўнасьць, працягласьць і ўдзячнасьць, свайго роду ахоўная грамата, тэрмін дзеяньня якой бясконцы.
„Родны край“ з складальнікамі календара ў нас, відаць, аднолькавы, а вось „айчыны“ ў нас, безумоўна, розныя. На гэта наводзіць наступны пасаж (гл. лісток ад 6 сьнежня):
„І.І.Ходзька з’яўляўся ганаровым членам Рускага геаграфічнага таварыства і Французскага альпійскага клуба, членам-карэспандэнтам Парыжскага геаграфічнага таварыства, адстойваў інтарэсы айчыннай навукі на Міжнародным геаграфічным кангрэсе ў Парыжы ў 1875 годзе. Яго імя насілі дзве прэміі, устаноўленыя Каўказскім аддзелам Рускага геаграфічнага таварыства за лепшыя работы па апісанні

Каўказа“. Кожны ўбачыць у гэтым выказваньні тое, што захоча. Мы спасьцерагаем у ім амаль усьвядомленую шызафрэнію — жыць у незалежнай дзяржаве, мець і адчуваць зь ёй тонкую эмацыйную сувязь, але перажываць яе як частку вялікшай прасторы, шукаючы і знаходзячы ў апошняй прыкметы „айчыны“.

Акурат у такім „Родным краі“ жывуць і працуюць тыя, для каго прызначаны каляндар, — людзі аграрнага цыклю. Тут мы сустрэнем самотных садаводаў і летуценных пчалаводаў, нашаму позірку адкрыюцца асобы з вышэйшай адукацыяй, агароднікі па натуры, перад намі зьявяцца людзі з прафэсарскімі пасадамі, грыбнікі ў душы, пачуюцца глухія ўпэўненыя крокі вясковых астраномаў, кулінараў і аграномаў. Адным словам, тых, хто і садзіць, і гародчык палівае, есьці варыць і сьвіньням дае, лекцыі чытае і градкі акучвае, карчы карчуе і нябёсныя сьветлы назірае, а сьвету ўсё ‘дна ня бачыць.

[1] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Том 1. Менск, 1993. С.275.
[2] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Том 3. Менск, 1996. С.47.
[3] Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Том 2. Менск, 1985. С.479—480.
[4] Гл. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Том 2. Менск, 1978. С.719.

*З набору паштовак „Беларускія прыказкі і прымаўкі“, 1981. Мастак Р.Рыбчонак*

---

**Гісторыя беларускага жыдоўства**
**http://beljewhist.virtualave.net**

Сайт „Гісторыя беларускага жыдоўства“, першы адмысловы сайт па гісторыі жыдоў Беларусі, робіцца Аляксандрам Фрыдманам (студэнт БДУ, гісторык, выкладчык у беларускім аддзяленьні Адкрытага ўнівэрсытэту Ізраілю) і яго братам Віталем (web-дызайнэр). Сваю місію яны бачаць у адраджэньні й захаваньні памяці пра „перакрэсьленую цывілізацыю" літоўска-беларускіх жыдоў. Таму і ўзялі сабе за дэвіз словы выдатнага жыдоўскага гісторыка пачатку XX ст. Сямёна Дубнава, родам з Амсьціславу: „У мінуўшчыне жыдоўскага народу захоўваюцца дзіўныя гаючыя сілы для стомленай

жыдоўскай душы…“
Бадай, культурна-асьветніцкія мэты чымсьці абмяжоўваюць далягляды сайту, але ён усё адно ўражвае. У расійскамоўнай вэрсіі ёсць таксама матэрыялы на беларускай мове. Тут мы маем наступныя разьдзелы: „Яны нарадзіліся ў Беларусі“, „Адметныя жыдоўскія гісторыкі“, „Лёсы“, „Галерэя“, „Галакост: памятайце пра гэта“, „Гарады“, „Дынастыі“, „Паэзія“, „Бяз рэтушы“, „Рознае“, „Мае работы“, „Публікацыі“, „Сіянізм“, "Праекты“, „Гісторыя Беларусі“, „Сусьветная гісторыя“. На сайце ствараецца энцыкляпэдыя штэтлаў, г.зн. „мястэчак“. Цікавая, але пакуль небагатая: „Бабруйск“, „Лунінец“, „Лёс вёскі Эрштэрмай“, „Возера Князь (Жыд)“, „Менск жыдоўскі“, „Пінск жыдоўскі“.
Зьмест англамоўнай часткі дапаўняе расійскамоўную. Тут знаходзяцца збольшага вытрымкі з энцыкляпэдый. Каб англамоўнаму наведніку было лягчэй арыентавацца ў беларускім топасе, для яго створаны спэцыяльны разьдзел Belarusian maps.

---

**Wasil Bykau**
**Sciana**
Bialystok 1999
Выдадзеная беластоцкімі беларусамі польскамоўная эдыцыя славутай „Сьцяны“ Васіля Быкава не зьяўляецца люстраным адбіткам беларускага арыгіналу. У ёй, з зразумелых прычынаў, апушчана быкаўская прадмова і колькі другарадных апавяданьняў.
Польскамоўную „Sciane“ рыхтаваў да друку і выдаў як прыватны выдавец Аляксандар Максімюк. Пераклалі ж кнігу на польскую мову незраўнаныя Ян Максімюк і Чэслаў Сэнюх. Рэдактарскую працу ажыцьцявіла супрацоўніца „Literatury na swiecie“ Яанна Рахань, а вокладку спраектаваў менскі мастак Міхал Анемпадыстаў.
Выданьне было фінансава падтрыманае „Цэнтрам Грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь“, „Камітэтам Навуковых Дасьледаваньняў“ і „Беларускім Саюзам у Рэспубліцы Польшчы“. Маральную падтрымку выданьню аказала Катадра беларускай культуры Беластоцкага ўнівэрсытэту.
У Менску кнігу можна купіць у **сядзібе БНФ** (вул.Варвашэні, 8) або замовіць яе беспасярэдне **ў выдаўцоў** праз **e-mail**

septo@sitech.pl

**А.М.Булыка**
**Слоўнік іншамоўных слоў**
**Тамы 1-2**
Мінск „Беларуская Энцыклапедыя“ 1999
„Слоўнік іншамоўных слоў“ Аляксандра Булыкі, выдадзены ў 1999 годзе выдавецтвам „Беларуская Энцыкляпэдыя“, па сутнасьці зьяўляецца пашыраным і перапрацаваным варыянтам той самай кнігі, якая ўпершыню пабачыла сьвет у 1993 у выдавецтве „Народная Асьвета“.
Абыймо працы, зьдзейсьненае аўтарам за нейкія 6 год, уражвае: калі „Слоўнік іншамоўных слоў“ узору 1993 зьмяшчаў 5600 чужаземных словаў, то яго пазьнейшы двухтомны аналяг дае тлумачэньне і этымалягічную даведку ўжо 25000 лексэмам, якія былі пазычаныя з блізкіх і далёкіх моваў у беларускую. Выданьне мае дыхтоўную цьвёрдую вокладку і будзе цікавае і карыснае ўсім, каго займае пытаньне паходжаньня беларускай лексыкі.
Яго традыцыйная загана, як і загана пераважнай бальшыні працаў прадстаўнікоў каляніяльнай школы беларускага мовазнаўства, накшталт Булыкі, мае мэтадалягічную прыроду і палягае ў канфармісцкім атаесамленьні пазычаньняў у расейскую мову з пазычаньнямі ў беларускую мову, з аднаго боку, і падвядзеньні супольных лексычных рэсурсаў польскай і беларускай моваў пад польскі моўны грунт, з другога.
„Слоўнік іншамоўных слоў“ прадаецца ў цэнтральных кнігарнях Менску,
а таксама ў фірмавай кнігарні выдавецтва **„Беларуская энцыкляпэдыя“**
(вул. Акадэмічная,15а).

---



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі**

**наконт гэтага сайту**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-04-2000**

да Зьместу 2(7)-2000 **Вольф Рубінчык**

# Яўрэйскі погляд на „жыдоўскі нумар“

*Наша Ніва, № 33/1999, Менск.*

**ВОЛЬФ РУБІНЧЫК**
асьпірант РІВШ, палітоляг.

**6** снежня 1999 г. выйшаў у свет „жыдоўскі нумар“ газеты „Наша Ніва“ (№ 33). Ён не зусім „жыдоўскі“, а напалову: на асвятленне яўрэйскай тэмы ў ім адведзена прыкладна пяць палос з 12. Тым не менш, з’ява гэтая неардынарная для сучаснай беларускай прэсы: на маёй памяці ўпершыню беларускамоўная газета падае аб яўрэях некалькі артыкулаў запар. Акрамя колькасці матэрыялаў, варта адзначыць і іхнюю разнастайнасць. У нумары магчыма ўмоўнае вылучэнне наступных блокаў (ці, як модна цяпер казаць, „сюжэтаў“):

• вынікі нядаўнага перапісу насельніцтва (каментары рэдакцыі і прадстаўнікоў інтэлігенцыі);

• гісторыя яўрэяў Беларусі, мінуўшчына і сучаснасць (С.Харэўскі „Перакрэсьленая цывілізацыя“, С.Паўлоўскі „Рыса аселасьці“, А.Шпунт „Габраі Вялікага Княства ад Вітаўта да Станіслава-Аўгуста“, А.Дынько „Беларусы і жыды ў паралельным вымярэньні“…);

• лінгвістычныя вышукі (С.Шупа „Жыды“, С.Паўлоўскі „Рыса аселасьці“);

• антысемітызм і Катастрофа (А.Лейзераў „Па-за межамі гета“, пераклад з расійскай, А. П. „Смак

альбанскага хлеба“, А.Аблажэй „Жыд — вечны“);

• узаемадачыненні і паралелі паміж яўрэямі і беларусамі (С.Квяткоўскі „У Ізраілі па-беларуску“, С.Х. „Радзіма чалавека, які адрадзіў мову“, таксама ўжо ўзгаданыя артыкулы С.Паўлоўскага, А.Дынько);

• рознае (гумарэска В.Шэндэровіча „Жыцьцё масона Цыпяровіча“, малюнкі, фотаздымкі А.Клешчука ды іншае).

Разгледзьма некаторыя блокі больш падрабязна. Менавіта вынікі перапісу лютага 1999 г., паводле якіх на Беларусі засталося каля 30000 яўрэяў[1] , стала своеасаблівым лейтматывам нумару. Каментары да лічбы 30000 розныя: ад здзіўлення й недаверу (пазіцыя Э.Іофе) да шкадавання. Шкадаванні з нагоды змяншэння колькасці яўрэяў выказвае ў сваёй прамове Р.Барадулін, С.Паўлоўскі піша: „Іх няма. Няма і нас“, гэта й агульная канцэпцыя нумару: „Страціўшы іх, мы страцілі і сябе“. С.Квяткоўскі прапануе такое вытлумачэнне працэсу эміграцыі: „Ці можна вінаваціць чалавека за жаданьне зьехаць з краіны, *дзе панує дыктатура* (курсіў мой. — **В.Р.**), у багацейшую, дзе слова „жыд“ азначае толькі адно — нацыянальную прыналежнасьць?“ Ці мае аўтар рацыю? Часткова — безумоўна. Але факты сведчаць пра тое, што асаблівасці праўлення А. Лукашэнкі не з’яўляюцца вызначальным фактарам эміграцыі яўрэяў — прынамсі, у Ізраіль. Асноўная хваля „алііі“ прыпадае на 1990—91 гг., калі з’ехала прыкладна 40 тысяч чалавек. У наступныя гады паказчык эміграцыі ў Ізраіль складаў ад 2,5 да 4,5 тыс. чалавек у год, да таго ж у 1997 г. ён зменшыўся ў параўнанні з мінулым (з 4407 да 3363 чалавек)[2]. Такім чынам, наўрад ці адпавядаюць рэчаіснасці словы А.Кебіка: „Наша Ніва“ цэлы нумар зрабіла пра тое, што за Лукашэнкам колькасьць жыдоў у Беларусі зьменшылася ўтрая — ад 100 да 28 тысячаў“[3]. Ужо ў 1994 г. яўрэяў заставалася значна меней, чым 100 тысяч[4], дый цяперашнюю лічбу „28000“ можна аспрэчыць (што і робіць Э.Іофе, прапануючы павялічыць яе на 25—30 тыс. чалавек), хаця да 100 тыс., узгаданых Лукашэнкам пад час візіту ў Ізраіль, яна

ўсё роўна не дацягне. Але ці так ужо вінаваты А.Л.? Рэч у тым, што да самага апошняга часу тутэйшыя яўрэйскія арганізацыі цешыліся гэтай круглай лічбай: ды зноў жа, я б не стаў ні з кога кпіць, бо падлічыць яўрэяў заўсёды надзвычай складана. Ёсць спосаб савецкі — „яўрэй — гэта той, у каго ў пашпарце запісана, што ён яўрэй“, традыцыйны юдэйскі — „той, у каго маці яўрэйка, альбо той, хто перайшоў у юдаізм“, ліберальны — „той, хто настойвае, што ён яўрэй“ (гэты падыход і быў выкарыстаны пад час перапісу). Ні ў Ізраілі, ні дзе-небудзь яшчэ агульназадавальняючай дэфініцыі „яўрэя“ не выпрацавана. Таму, дзіўным чынам, рацыю, як у тым анекдоце, маюць усе, ці амаль усе — аднак дамінуе ўсё ж такі традыцыйны падыход.

„Сярэднестатыстычных“ (у тым ліку „няпашпартных“ яўрэяў у Беларусі можа жыць каля 50 тыс., калі ж улічваць усіх, хто мае права на іміграцыю ў Ізраіль (гэта мужы і жонкі яўрэяў, а таксама іх нашчадкі да другога калена), дык тут не выключана, што іх будзе й больш за 100 тысяч. Аднак з вялікай доляй упэўненасці можна зазначыць, што колькасць яўрэяў на Беларусі, нават пры адсутнасці эміграцыі, будзе памяншацца ў выніку міжнацыянальных шлюбаў, нізкага каэфіцыенту нараджальнасці ды адносна сталага ўзросту гэтай катэгорыі насельніцтва. Аўтары „Нашай Нівы“ не ўваходзяць ва ўсе гэтыя дэталі і, на маю думку, правільна робяць, бо чытачам газеты было б, напэўна, сумнавата ад залішку дэмаграфічных дадзеных. Дастаткова ведаць, што „жыдоў, габрэяў ці як яны там завуцца“[5] менш за 1%, а 0,3% ці 0,5%, з гэтага пункту гледжання не так ужо істотна. Тут вельмі падыходзяць словы Зэева Жабацінскага, вядомага сіянісцкага дзеяча пачатку XX ст. (родам з Украіны): „Кожны чалавек, у асаблівасці чалавек сур’ёзны і спраўны, аддае ўвагу ўласным надзённым інтарэсам і не абавязаны прыдзяляць яе інтарэсам іншых“[6]. Таму ці з іншых прычынаў, аўтары „НН“ разглядаюць яўрэяў Беларусі збольшага як адзіны стан, а калі й дзеляць, дык па ўласных крытэрыях: „нашыя“ й „не нашыя“. Гэтае дзяленне праводзіцца і ў гістарычнай перспектыве, і ў тым, што датычыць сённяшняга дня. Як гэта выглядае ў першым выпадку?
„…Большасьць тых, што засталіся тут, цяжка назваць жыдамі беларускімі. Беларускіх выбілі ў вайну, а гэтыя прыехалі сюды пасьля вайны, і іхная беларускасьць ня большая, чым

„адэскасьць“ адэскіх ці „крымскасьць“ крымскіх“ (А.Дынько „Беларусы і жыды ў паралельным вымярэньні“). Гэта — не што іншае, як міф, але, як кожны міф, ён адсылае да нейкай рэальнасці. Сапраўды, большая частка беларускіх яўрэяў была знішчана[7], але „нехта“ ўсё ж застаўся. Паводле М.Трэйстэра[8], выратаваліся на тэрыторыі Беларусі (былі ў партызанах альбо схаваныя Праведнікамі) не менш за 20 тысяч чалавек. Вярнуліся з эвакуацыі, па ўспамінах тых, хто яе перажыў, каля 80% уцекачоў, гэта складае больш за 100 тыс. чалавек (хаця С.Харэўскі сцвярджае, што такіх быў „мізэр“). Да гэтага неабходна прыплюсаваць і пэўную колькасць беларускіх яўрэяў, якія вярнуліся з фронту ды з лагероў. Невядома, колькі яўрэяў прыехала пасля вайны з Украіны й Расіі, але іх заўсёды была меншасць[9].

Здагадацца, чаму аўтары „НН“ сумняваюцца ў „беларускасці“ тутэйшых яўрэяў, няцяжка: апошнія ў асноўным расійскамоўныя. Сярод інтэлігенцыі ёсць і выняткі (напрыклад, паэты Э.Агняцвет, Ф.Баторын, Н.Гальпяровіч), але гэта — менавіта выняткі, што могуць застацца незаўважаныя. Насамрэч, яўрэйскія выданні з іўрыцкімі назвамі, якія пералічвае А.Дынько, — спрэс на расійскай мове, мерапрыемствы ладзяцца, як правіла, на расійскай. Так што словы С.Квяткоўскага („У Ізраілі па-беларуску“) „І калі ў нашых крамах зьявяцца шыльдачкі „гаварыце па-беларуску“, вернуцца і нашыя жыды. Вернуцца на Радзіму“ з’яўляюцца, хутчэй за ўсё, прыгожай ілюзіяй.

Як растлумачыць гэтае расійскамоўе? Агульнавядома, што ўзровень адукацыі і культурныя запатрабаванні яўрэйскага насельніцтва даволі высокія. М.Членаў заўважыў у сярэдняга савецкага яўрэя „арыентацыю на сацыяльныя характарыстыкі і сістэму каштоўнасцей савецкай інтэлігенцыі“[10]. Прыкладна тое ж піша С.Харэўскі: „Паваенныя жыды былі ўжо часткаю савецкай інтэлігенцыі“. Але нават у дарэвалюцыйныя часіны яўрэі асіміляваліся праз адукацыю: „Яны імітавалі расейцаў, таму што школа тады была расейскамоўная“[11]. Расійская мова для значнай часткі яўрэяў СССР стала не толькі сродкам далучэння да „вышэйшай“, г.зн. суб’ектыўна ўспрыманай, як такая, культуры, але й мовай унутранай камунікацыі. Яшчэ ў 1918 г. Змітрок Бядуля пісаў, што „інтэлігентныя масы жыдоўства ні могуць яшчэ пазбыцца сукцэсаў расійскаго тут

уладаньня і ўсё ішчэ служаць праваднікамі русіфікацыі“[12]. Але не думаю, каб тады і цяпер крыўда на яўрэяў, якія не размаўляюць між сабою па-беларуску (шмат хто мову ведае[13]) была абгрунтаваная. Поспех беларускага адраджэння залежыць, перш за ўсё, ад волі і жадання саміх беларусаў. Яўрэі, як нацыянальна-рэлігійная меншасць, мусяць ісці крыху ззаду: патрабаваць ад іх быць большымі раялістамі, чым кароль, бессэнсоўна, нават (і асабліва) праз сілавы націск. Памыляўся Бядуля, калі пісаў, што „гісторыя іх [яўрэяў] так вышколіла, што … па большасьці, яны арыентуюцца толькі грубай сілай. Чый верх — таго і праўда…“[14]. Прыстасаванцаў хапала заўсёды (на жаль, у іх лік трапіў і сам Бядуля, калі пайшоў супрацоўнічаць з бальшавікамі), але — на шчасце — „мы такі народ, з якім нельга размаўляць, трымаючы бізун у руках“[15].

Усе гэтыя разважанні даволі абстрактныя. Якая будучыня чакае беларускіх яўрэяў, ніхто не ведае. Здаецца ўсё ж, што нейкая колькасць яўрэяў застанецца тут і надалей. Аўтары „Нашай Нівы“ ў прагнозах вельмі асцярожныя і звяртаюцца болей да мінуўшчыны. Гістарычны блок прадстаўлены цікавым нарысам А.Шпунта, які абдымае перыяд ад 1388 да 1795 гг. Зразумела, што гэта кароткі (газета ўсё ж) агляд падзей: пералічаны прывілеі Вітаўта яўрэйскім суполкам, узгадваюцца іншыя юрыдычныя дакументы, пра якія мала хто ведае. Закранаецца і ўнутраны лад жыцця яўрэйскіх суполак, гэтаксама як і тэма іх узаемаадносінаў з вонкавым светам. Дарэчы, факты, прыведзеныя ў гэтым матэрыяле, абвяргаюць словы Бядулі „на Беларусі ніколі жыдоўскіх пагромаў ні было“[16]. Разбураюць яны і ідылічную карцінку, намаляваную С.Паўлоўскім („Рыса аселасьці“): „Не любіць жыдоў у Беларусі не было падставаў ніколі. Нелюбоў прыйшла разам з русіфікацыяй“. Што казаць: і ў ВКЛ яўрэяў не надта любілі, ды і ў ХХ ст. не толькі сярод русіфікатараў сустракаліся антысеміты. Такія „культавыя“ сярод свядомых беларусаў постаці, як Ю.Віцьбіч, Ф.Аляхновіч ці Антон Адамовіч, паўдзельнічалі пад час вайны ў антысеміцкай прапагандзе.

Не ўсё ў гісторыі пішацца ружовымі — ці, наадварот, чорнымі — фарбамі, ад гэтага не ўцячы. І артыкул „Смак альбанскага хлеба“ (аўтар А.П.), хоць і змяшчае шэраг найцікавейшых фактаў, што датычаць высакародных учынкаў албанцаў у гады

другой сусветнай вайны, пабудаваны на міфе: „Пад час гітлераўскага генацыду альбанскі народ прытуліў у сваёй невялічкай краіне сотні жыдоў зь Югаславіі, Нямеччыны, Аўстрыі ды Баўгарыі. Альбанцы здолелі так схаваць жыдоў, што ніводзін зь іх — ані мясцовы, ані прышлы — не патрапіў у рукі нацыстоўскіх акупантаў“. Мае звесткі, на жаль, крыху іншыя: „Пасля нямецкага ўварвання ў Югаславію шмат яўрэяў з Сербіі і Харватыі схавалася ў тых раёнах Югаславіі, якія былі перададзены пад кантроль Албаніі. Мясцовае насельніцтва ды італьянскі гарнізон добра ставіліся да ўцекачоў, але па патрабаванні гітлераўцаў частка ўцекачоў была пераведзена ў Бялград і знішчана…“[17].

Зрэшты, міф можа лічыцца адной з галоўных формаў будавання рэчаіснасці[18]. Нараджэнне новых міфаў — з’ява непазбежная. Наўрад ці можна цалкам пазбавіцца як аўта- , так і гетэрастэрэатыпаў (успрымання сябе ці іншых праз прызму міфаў), асабліва ў выпадку з яўрэямі, якія ў масавай свядомасці „ператварыліся з этнічнай групы ў нейкую сацыяльна-міфалагічную ролю“[19].

Падсумаваць разважанні пра яўрэяў на Беларусі ў „НН“ можна было б фразай „Няма таго, што раньш было“. У сучасным жа становішчы яўрэяў А.Дынько слушна выпукліў галоўнае: „Беларуская жыдоўская грамадка жыве незаўважным чужому воку паралельным жыцьцём“. Далей пералічваюцца некаторыя мерапрыемствы ды арганізацыі. Незаўважным і „паралельным“ гэтае жыццё застаецца, галоўным чынам, з-за малой колькасці яўрэяў, а часткова і таму, што яўрэі здаўна былі народам, які „жыве асобна“. Сапраўды, яўрэі цяпер мала ўплываюць як на эканамічнае, так і на грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі. Расійскія даследчыцы міжнацыянальных зносінаў сцвярджаюць наступнае: „Яўрэі маюць добрасуседскія стасункі з беларусамі. Іхняе стаўленне да палітычных падзей, што адбываюцца на Беларусі, даволі стрыманае“[20]. Мне здаецца, што гэткая стрыманасць (адносная, канечне)[21] зараз і ёсць найлепшай стратэгіяй. У гісторыі здаралася, што непрапарцыянальна вялікі ўдзел яўрэяў у тым ці іншым палітычным руху не йшоў на карысць нікому, і перадусім самім яўрэям, у поўнай адпаведнасці з афарызмам „Рэвалюцыю робяць Троцкія, а расплочваюцца за яе Бранштэйны“. Тым не менш, не хацелася б, каб яўрэі Беларусі разглядаліся выключна як рэлікты, чыя

будучыня цалкам залежыць ад іншых. Зусім згодны з беларускім яўрэйскім вучоным, які дэкларуе: „Я, як грамадзянін прававой дзяржавы, хачу мець усе правы і магчымасці незалежна ад таго, колькі стагоддзяў продкі тут жылі, што стварылі і г. д. У гэтым кантэксце мяне зусім не цікавіць унёсак пісьменніка З.Бядулі, скульптара З.Азгура і нават лаўрэата розных прэмій архітэктара Л.М.Левіна“[22]. Тут варта звярнуць увагу на яшчэ адзін міф, даволі распаўсюджаны сярод яўрэяў і неяўрэяў. Гутарка йдзе пра нібыта выключную таленавітасць яўрэйскага народу. У газеце „Берега“, што выдаецца Юдэйскім рэлігійным аб’яднаннем у Мінску, гэткія сцвярджэнні і „доказы“ на іх карысць завуцца „загінаннем пальцаў“ („Маркс быў яўрэем, Эйнштэйн таксама...“). Вядома, яўрэйскі народ не апошні ў сусветнай культуры, але й не першы. Жабацінскі казаў пра гэта так: „Калі б не было яўрэяў, культурны свет таксама б цяпер не ў лапцях хадзіў“[23]. Таму не магу пагадзіцца з накірункам думкі А.Аблажэя („Жыд — вечны“): „Бадай ніякі іншы народ ня можа пахваліцца такой колькасьцю таленавітых людзей ва ўсіх сфэрах дзейнасьці...“. Вось з гэтай нагоды аўтар выступае супраць антысемітызму, ды яшчэ таму, што: „У такой ролі „хлопчыка для біцьця“, „ахвярнага казла“, першапрычыны ўсіх бедаў Жыд — сапраўды вечны. І калі б яго ня стала — давялося б кагось прызначыць выконваючым яго абавязкі“. Дзякуй аўтару за спагаду, але нешта не карціць мне выконваць гэткія абавязкі, ды яшчэ — вечна. Паміжволі ўзгадваюцца словы ізраільскага пісьменніка Амоса Оза: „Я сіяніст, бо не хачу і не магу быць крупінкай нейкага сімвалу ў свядомасці іншых. Ані сімвалам хітрага і адоранага паразіта, ані сімвалам патэтычнай ахвяры, якую вядуць да ахвярапрынашэння“[24]. Няма жадання быць апрыёры прадстаўніком, кажучы словамі А.Дынька, „слабасільнага народу скрыпачоў, шахматыстаў і артыстаў“. Самаідэалізацыя некаторых яўрэяў у вышэйзгаданым рэчышчы ёсць праявай аб’ектыўнага жадання падавацца лепшымі, чым насамрэч, але часам абапіраецца й на дрэнна зразуметую ідэю „абранага Богам народу“ (на гэтую абранасць часцяком накідваюцца і антысеміты). На самой справе, абранасць Богам значыць толькі павелічэнне абавязкаў, накладзеных на народ, у абмен на выратаванне калі-небудзь у будучым. Ніякага дачынення да „вышэйшай“, „лепшай“ расы яўрэі, як і іншыя

народы, не маюць. Дарэчы, доля дурняў ды хамаў сярод нашчадкаў Шэма (Сіма) прыкладна тая ж, што і сярод усіх астатніх.

Нарэшце, надышоў час для кароткай тэрміналагічнай дыскусіі. „Яўрэі“ ці „жыды“? Аўтары „НН“ вырашаюць пытанне проста: апошняе найменне — традыцыйнае для беларускай мовы (пра гэта пішуць С.Паўлоўскі, С.Шупа), а „яўрэй“ гучыць куртата. Так, прыхільнікі „жыда“ могуць спаслацца на Ф.Багушэвіча, Янку Купалу, Змітрака Бядулю ды іншых, але, як мне здаецца, не ўсё з мінуўшчыны мае аднолькавую вартасць. Калі назва „яўрэй“ прыжылася, у тым ліку ў беларускай літаратуры, ці патрэбна ізноў вяртацца да архаічнай формы? С.Шупа ўзгадвае і пра тое, што слова „жыд“ выклікае ў сённяшніх людзей балючыя асацыяцыі, бо ўжывалася калабарацыяністамі пад час другой сусветнай вайны. Ён нават канстатуе: „Слова „жыд“ загінула ў полымі Галакосту“ — але ўсё ж яго выкарыстоўвае. Тут я бачу некаторую непаслядоўнасць, якую не магу патлумачыць.

Цікава, што дылема, пра якую піша сп.Шупа, турбавала людзей яшчэ да абвяшчэння БССР. Вось што піша „беларус з Магілёўшчыны Сымон Дзякоў“ у рэдакцыю газеты „Вольная Беларусь“: „Пакуль слово „жыд“ будзе існаваць, покуль яно будзе ўжывацца у друку і гутарцы, да тых часоў астанецца жывучым атрутны корань антысемітызму... Замяніце гэтае слово вельмі зычным словам „еўрэй“. Што ж адказвае рэдакцыя? „Слово „жыд“ ні мае у сабе нічога ганебнаго і жыдоўская маса у нас ні абражаецца ад гэтае назвы. Мы, беларусы, ні можам браць на сябе адпаведальнасьці за грэхі вялікарускай нацыі“[25]. Тады ў гэтых словах, канечне, прысутнічала доля праўды, але час змяніўся. Перафразуючы А.Жданава, „мы ўжо не тыя, і Беларусь у нас не тая“[26].

Адам Мальдзіс, абапіраючыся на аўтарытэт нябожчыка акадэміка Ліхачова, прапаноўваў[27] замяніць „яўрэя“ на „габрэя“. Гэтак часам і пішацца ў беларускіх выданнях, ды яшчэ, паводле С.Шупы, „прыхільнікі клясычнага правапісу часта, каб пазьбегнуць канфрантацыі, ужываюць словы гэбрай, гэбрайскі“. У рэшце рэшт, размаітасць назваў нейкім чынам адлюстроўвае шматлікія ідэнтыфікацыі яўрэяў дыяспары і ўскосна сведчыць пра ненадзейнасць іхняга статусу. Што з усяго гэтага выйдзе, пакажа, безумоўна, час. Хоць апошняе

сцвярджэнне гучыць вельмі трывіяльна, ім пакуль што варта абмежавацца, бо лёс этнонімаў залежыць не толькі ад волі большасці носьбітаў мовы ці нават ад экспертаў, але і ад гістарычных абставінаў ды палітычных падзей, што разгортваюцца паводле сваіх законаў.
Асаблівым кур'ёзам была для мяне аб'ява ў „НН", што запрашае на Хануку ад імя „габрэяў". Справа ў тым, што віноўнікі ўрачыстасцяў, гэтак званыя юдэахрысціяне, да юдаізму бадай што ніякага дачынення не маюць, бо юдэйская рэлігія не сумяшчаецца з верай у Ісуса-мэсію. Слушна заўважыла даследчыца А.Верашчагіна: „Месіянства — гэта ўжо пратэстанцкая плынь, якая захоўвае пэўныя рысы юдаізму... і знаходзіцца ў цеснай сувязі зь пяцідзясятнікамі"[28]. Калі пратэстанты выстаўляюць сябе за прадстаўнікоў яўрэяў і юдэяў, гэта, мякка кажучы, дзіўна выглядае.
Падвядзем вынікі. Нумар атрымаўся цікавы менавіта па прычыне сваёй неадназначнасці і шчырага, як мне падалося, жадання ягоных складальнікаў паразважаць аб „неад'емнай частцы беларускага народу". У той жа час шэраг матэрыялаў прасякнуты міфамі, адзін з якіх зводзіцца да пэўнай ідэалізацыі (ці „ідылізацыі"?) мінулага, „сапраўдных" беларускіх яўрэяў, іхняй культуры і беларуска-яўрэйскага суіснавання. Нумар аздоблены рупліва падабранымі малюнкамі (адзін з іх, праўда, не зусім карэктна размешчаны) і фотаздымкамі. Здымкі ілюструюць, што пасуе да зместу, перш за ўсё мінулае беларускага яўрэйства.
І пры рэшце. Хаця артыкул азагалоўлены „Яўрэйскі погляд...", ягоны аўтар выступае толькі ад сваёй асобы. Гэта — „адзін погляд". Калі б у беларускай мове былі артыклі, то перад словам погляд стаяў бы артыкль няпэўны.

[1] У нумары за 20.12.1999 „Наша Ніва" ўдакладняе: 28000.
[2] Э.Иоффе „Страницы истории евреев Беларуси", Минск, 1996, с. 203; сайт Міністэрства абсорбцыі Ізраіля www.moia.gov.il.
[3] „Наша Ніва", 10.01.2000, с. 6.
[4] Прыкладам, у зборніку „Antisemitism Worldwide '1994"(Tel-Aviv, 1995, p. 132) цытуецца лічба „прыкладна 72500 яўрэяў".
[5] З водгуку на гэты нумар B.Harbac'a ў Інтэрнеце, у кнізе водгукаў на сайце „НН" http://members.xoom.com/Nasa_Niva

(13.12.99).
[6] В.(З.)Жаботинский, „Избранное“, Иерусалим, 1989, с. 43-44.
[7] Па розных падліках, ад 700 тыс. чалавек (М.Батвінік) да 810 тыс. (Э.Іофе) з 900—1000 тыс.
[8] Старшыня Беларускай асацыяцыі яўрэяў-былых вязняў гета. Гутарка 12.01.2000.
[9] Пасля прачытання „НН“ я пачаў наўздагад пералічваць яўрэяў, сваіх знаёмых. На 90% яны (і іхнія бацькі) нарадзіліся ў Беларусі.
[10] Цыт. у: А.Львов „В поисках „русского еврея“// „Еврейская школа“, январь-июнь 1996 г., с. 176.
[11] И. Домальский „Новое в антисемитизме“// „Антисемитизм в СССР, его корни и последствия“, Иерусалим, 1977, с. 288-289.
[12] З. Бядуля „Жыды на Беларусі“, Менск, 1918 (рэпр. выданне — Мн., 1992), с. 24.
[13] Паводле А. Трусава, старшыні ТБМ: „На працягу ўсяго свайго існавання, да пачатку Вялікай Айчыннай вайны 1941 г., усе мясцовыя яўрэі цудоўна валодалі беларускай мовай…“ („Народная воля“, 13.01.2000, с. 3). Вядома ж, тыя, хто валодаў, не развучыліся й пасля вайны.
[14] Op. cit., с. 30. Пазней Бядуля паўтарыў гэтую думку ў сваім артыкуле, прысвечаным сіянісцкай канферэнцыі ў Менску (газета „Беларусь“, студзень 1920 г.)
[15] З. Жаботинский, op. cit., с. 114.
[16] Op. cit., с. 16. Бядуля спаслаўся на „прэдстаўнікоў розных жыдоўскіх партый“, якія віталі беларусаў на Усебеларускім з’ездзе ў 1917 г.
[17] „Краткая еврейская энциклопедия“, т. 1. Иерусалим, 1976, слупкі 73-74.
[18] Пра гэта гл., напрыклад: Л.Ионин „Социология культуры“, М., 1996, с. 157 і далей; Т.М.Алпеева „Социальный миф: сущность, структура, функции“, Мн.,1992.
[19] Л.Гудков, А.Левинсон „Отношение населения СССР к евреям“// Вестник Еврейского университета в Москве, №1. М., 1992, с. 34.
[20] Р.А.Григорьева, М.Ю.Мартынова „Межнациональные отношения и национальная политика в Белоруссии“//„Новые славянские диаспоры“, М., 1996, с. 175.
[21] Яўрэйскія арганізацыі неаднаразова пратэставалі супраць антысемітызму: гэта таксама ўдзел у палітыцы.

[22] Л.Лук „К вопросу о выдающемся вкладе еврейского народа...“// „Евреи Беларуси“, выпуск 1. Мн., 1997, с. 152.
[23] З. Жаботинский „Странное явление“ (1912) //Op. cit., с. 155.
[24] Цыт. у: „Pensйes sur Israлl“// „Alya“, guide de poche, 5-иme йdition, Jйrusalem, 1995.
[25] „Вольная Беларусь“, Менск. 7.01.1918, с. 7.
[26] У сваёй сумна вядомай прамове летам 1946 г. ён гэтак казаў пра расійцаў і Расію.
[27] Выступленне на адкрыцці Грамаднага фестываля яўрэйскай кнігі ў Мінску, 10.10.1999.
[28] „Этнаканфэсійныя групы Беларусі ў кантэксьце сучаснага рэлігійнага жыцьця“// Форум, №3 (вясна 1996 г.), с. 21.
*Навучанне ў Менскай сінагозе. Фота Анатоля Клешчука. Фота Аляксандра Ліціна.*

---



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 12-04-2000**

да Зьместу 2(7)-2000 **Андрэй Екадумаў**

# Час імпэрыяў мінуўся

*Zbigniew Brzezinski. The Grand Chessboard. American Primacy and Its Geostrategic Imperatives. HarperCollins Publishers, 1997.*
*Бжезинский Збигнев. Великая шахматная доска. Господство Америки и его геостратегические императивы. — М.: Междунар. отношения, 1999.*

**АНДРЭЙ ЕКАДУМАЎ**
кандыдат філязофскіх навук, выкладчык філязофіі і лёгікі ў БДУ. Апошняя публікацыя — эсэ “Пад апекай сярэдняга брата” (ARCHE—Паталёгіі грамадзтва).

**П**радмова да расейскага перакладу кнігі знакамітага экс-саветоляга Зьбігнева Бжэзінскага „Вялікая шахматная дошка“, прысьвечанай палітыцы ЗША і NATO на мяжы XX і XXI стагодзьдзяў, напісана генэрал-маёрам Юр’ем Кабаладзэ, прадстаўніком па сувязях з грамадзкасьцю Службы замежнай выведкі Расеі. Як вядома, найбольш запамінальныя часткі нейкага паведамленьня — пачатак і канец. Прадмова стварае ўстойлівае першае ўражаньне ад кнігі, здольнае ўраўнаважыць уражаньні ад заключэньня, зробленага пры канцы „Шахаўніцы“ самім Зьбігневам Бжэзінскім.

Аўтар „Вялікай шахматнай дошкі“ раскладае на гэтай самай эўразійскай дошцы нешта накшталт пасьянсу з магчымых сцэнароў сусьветнага разьвіцьця ў залежнасьці ад таго, як будзе прасоўвацца мадэрнізацыя ў трэцім і другім сьвеце, і выкладае, па сутнасьці, вядомыя ісьціны пра дамінаваньне захаду, амэрыканскае лідэрства і ўмовы гэтага лідэрства. Ісьціны гэтыя даюцца ў дастаткова сыстэматызаваным і абагульненым выглядзе.

Бжэзінскі пачынае з аналізу існых у мінулым рэгіянальных

звышдзяржаваў, вядомых гісторыі імпэрыяў, выдзяляючы крытэры, якія дазваляюць казаць пра краіну як пра звышдзяржаву. Аўтар налічвае чатыры такія крытэры: ваенная моц; эканамічная магутнасьць; тэхналягічнае лідэрства; культурнае разьвіцьцё і прыцягальнасьць. Супастаўляючы Амэрыку і яе становішча ў сучасным сьвеце зь дзяржавамі, якія адыгрывалі ролі лідэраў у мінулым, Бжэзінскі робіць выснову аб гістарычна ўнікальным характары лідэрства Злучаных Штатаў як сусьветнай дзяржавы сучаснасьці. Пры гэтым адрозьненьне ад папярэдніх дзяржаваў-лідэраў заключана ня толькі ў глябальным маштабе амэрыканскага дамінаваньня — усе папярэднія звышдзяржавы, так ці інакш, не выходзілі за межы рэгіянальнага лідэрства, — а ў самім характары амэрыканскага сусьветнага ўплыву. Злучаныя Штаты — гэта краіна, якая знаходзіцца наперадзе па ўсіх чатырох паказчыках у маштабах усяго сьвету, і нават у пэрыяд халоднай вайны Савецкі Саюз ня быў эквівалентным ЗША полюсам сусьветнага панаваньня, бо рэальна канкураваў з Амэрыкай толькі ў галіне ваеннай сілы, прайграючы па астатніх трох паказчыках. Амэрыканскае панаваньне ішло значна далей і глыбей за межы ваеннай сілы.

Прывядзем словы самога Бжэзінскага. „Хаця амэрыканскае панаваньне ў міжнародным маштабе непазьбежна выклікае думкі пра падабенства з былымі імпэрскімі сыстэмамі, разыходжаньні ўсё ж істотнейшыя. Яны выходзяць за межы пытаньня аб тэрытарыяльным абсягу панаваньня. Амэрыканская магутнасьць выяўляецца праз глябальную сыстэму амэрыканскага кшталту, якая адлюстроўвае ўнутраны амэрыканскі досьвед. Цэнтральнае месца ў гэтым унутраным досьведзе займае плюралістычны характар як амэрыканскага грамадзтва, так і ягонай палітычнай сыстэмы“. У адрозьненьне ад імпэрыяў, створаных арыстакратычнымі палітычнымі элітамі, Амэрыка зьяўляецца дэмакратычнай краінай, якая распаўсюджвае свой уплыў праз распаўсюджаньне дэмакратычных прынцыпаў і інстытутаў, падмацоўваючы яго панаваньнем у галіне глябальных камунікацыяў і масавай культуры і адчувальнай тэхналягічнай перавагай. Міжнароднае лідэрства Амэрыкі — вынік дэмакратычнай арганізацыі грамадзтва, плюралістычнай культуры і эфэктыўнай арганізацыі эканомікі. Пасьля распаду СССР

Амэрыка аказалася ў становішчы адзінага магутнага полюсу сілы, які ўзначальвае блёк дэмакратычных заходнеэўрапейскіх і мадэрнізаваных цэнтральна- і неэўрапейскіх дзяржаваў, і супрацьстаіць як у ваенным, так і ў сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурным пытаньні краінам зь недэмакратычнымі рэжымамі, здольным прэтэндаваць максымум на рэгіянальнае лідэрства. У выніку, у першую чаргу менавіта на Амэрыку кладзецца адказнасьць за забесьпячэньне стабільнасьці ў сьвеце і забесьпячэньне ягонага паступовага пераходу да такой сыстэмы бясьпекі і супрацоўніцтва, калі ніводная дзяржава, у тым ліку і Злучаныя Штаты, ня будзе мець такога вялікага сусьветнага ўплыву, як тыя ж Штаты на сучасным этапе эвалюцыі сусьветнай сыстэмы. На апошні пункт варта зьвярнуць асаблівую ўвагу. Як піша Зьбігнеў Бжэзінскі ў заключэньні сваёй кнігі: „Урэшце ў сусьветнай палітыцы абавязкова стане ўсё больш неадпаведнай канцэнтрацыя ўлады ў руках адной дзяржавы. Значыць, ЗША ня толькі першая і адзіная звышдзяржава ў сапраўды глябальным маштабе, але, верагодна, і апошняя“.

**Ці аднапалюсны сучасны сьвет**

Здавалася б, несупастаўляльныя аб’ёмы — цэлая кніга Бжэзінскага супраць дзьвюх старонак прадмовы генэрал-маёра Кабаладзэ, але колькі інфармацыі ў гэтых дзьвюх старонках папераджальнага адказу чытачам на развагі аналітыка аб ролі Амэрыкі ў сучасным сьвеце.

Адзін з разьдзелаў кнігі Бжэзінскага называецца „Чорная дзірка“. У ім Бжэзінскі піша пра Расею як пра пераходную дзяржаву ў прасторы між імпэрскім мінулым і верагоднай, лепшай дэмакратычнай будучыняй. Пры гэтым аўтар „Дошкі“ ўвесь час гаворыць пра пагрозу адраджэньня Расейскай імпэрыі ў форме СССР альбо нечага аналягічнага. Дэімпэрызацыя Расеі наўпрост прапарцыйная ейнай дэмакратызацыі як унутры, так і на міжнароднай арэне. У гэтым працэсе асаблівае месца Бжэзінскі адводзіць палітыцы ЗША ў дачыненьні да новых незалежных дзяржаваў, у мінулым — саюзных рэспублік СССР. Заахвочваючы іхную самастойнасьць, Амэрыка папярэджвае ўзнаўленьне імпэрыі. Умацаваньне дзяржаўнасьці новых краінаў, што паўсталі на тэрыторыі Савецкага Саюзу, таксама

блякуе адраджэньне Расеі па шляху імпэрыі. І хаця дзяржавы ў „Вялікай шахматнай дошцы“ выглядаюць нейкімі пэрсаніфікаванымі сутнасьцямі, Бжэзінскі ўсё ж адрозьнівае краіну як геапалітычнае ўтварэньне, і насельніцтва краіны, зьвяртаючыся да ідэі правоў чалавека і рэклямуючы між радкоў дэмакратычныя перавагі Захаду.

З тэксту генэрал-маёра-рэцэнзэнта „Шахматнай дошкі“, магчыма, з-за сьцісласьці прадмовы, адрозьненьні людзей і краінаў не праглядаюцца. Дарэчы, гэта характэрна для расейскіх дзяржаўных дзеячоў, што, у адрозьненьне ад амэрыканскіх, не спалучаюць ідэю велічы сваёй радзімы з ідэямі дэмакратыі. Крытыкуючы ідэю Бжэзінскага — не дапускаць адраджэньня вялікай эўразійскай імпэрыі, спрыяць павароту Расеі да Эўропы і эўрапейскіх каштоўнасьцяў — Ю.Кабаладзэ піша: „Канечне, канцэпцыі шматполюснага сьвету чужыя Бжэзінскаму па самой ягонай прыродзе“. Але калі адарвацца ад загадкавай прыроды Бжэзінскага і ўважліва пачытаць саму ягоную кнігу, заўважна якраз адваротнае — Бжэзінскі піша пра шматполюсны сьвет, у якім перакрыжоўваюцца розныя інтарэсы, якія ў комплексе фармуюць тэндэнцыі сусьветнага разьвіцьця. Задачу Амэрыкі аўтар бачыць не ў ператварэньні ўсяго астатняга сьвету ва ўскраіну Амэрыкі, а ў выкананьні ролі сусьветнага пасярэдніка, амартызатара і часта арбітра, які не дазваляе ачагам супрацьстаяньня перарасьці ў ачагі ўзброеных канфліктаў, спрыяе станаўленьню сыстэмы глябальнага супрацоўніцтва і бясьпекі.

Тут неабходна зрабіць адступленьне па пытаньні самой ідэі шматполюснасьці. Трэба дакладна і назаўсёды разьвесьці разуменьне шматполюснасьці як культурнай поліфаніі, суіснаваньня розных этна- і субкультурных масіваў, і шматполюснасьці як суіснаваньня прынцыпова адрозных у сваіх базавых прынцыпах сацыяльных сыстэмаў, сацыякультурных мадэляў, увасобленых у канкрэтных грамадзкіх і дзяржаўных інстытутах. Шматполюснасьць сьвету ў апошнім варыянце, г.зн., калі побач з адкрытым грамадзтвам канкуруюць іншыя сацыяльныя мадэлі, забясьпечаныя сучаснымі сродкамі зьнішчэньня і рэпрэсіўнага кантролю, але якія ніяк не прадугледжваюць захаваньня правоў чалавека, магчымая, але надта непажаданая. Можна распачынаць гвалт,

крычучы пра дыктатуру дэмакратыі, спадчыннае права народаў на рытуальнае людажэрства і складаньне ахвяры людзьмі, але выбар стаіць рубам: альбо ўнівэрсальная мадэль, якая прапаноўвае — калі некаму падабаецца такая назва — дыктатуру дэмакратыі, альбо дыктатура алігархіі, жрацоў, партыі, кляну, правадыра.
У культурным пляне сучасны сьвет застаецца шматполюсным, але ў пляне насьледаваньня пэўнай сацыяльна-эканамічнай і палітыка-прававой мадэлі сьвет усё больш манапалярызуецца — у бок той самай мадэлі, якую адстойваюць ЗША і разьвітыя эўрапейскія краіны. У Бжэзінскага гэта прапісана дастаткова выразна, але гэтая канстатацыя — зусім не падстава бачыць у Амэрыцы сусьветную імпэрыю, а ў разьвітых краінах — адданых імпэрскіх васалаў.
Пра што ж кажа Ю.Кабаладзэ ў сваёй прадмове? Ён пастулюе непрымальнасьць натаўска-амэрыканскага дамінаваньня ў новым сьвеце і выступае за роўнае стратэгічнае партнэрства. Але ён не паказвае галоўнага: якім чынам можа рэалізоўвацца роўнае партнэрства між багатым, моцным Захадам, які вызнае дэмакратычныя прынцыпы, і краінай зь неразьвітай крымінальна-бюракратычнай эканомікай, якая толькі нядаўна дэкляравала пераход да дэмакратыі.

**Ці зьяўляецца Амэрыка імпэрыяй**
Тыповай для імпэрскага мысьленьня застаецца звычка бачыць у апанэнце, рэальным ці ўяўным, іншага такога ж, як сам. Імпэрскі штурмавік будзе бачыць перад сабой імпэрскага штурмавіка, нават калі мае справу зь мірным гандляром. Гэты злы жарт геапалітычнай оптыкі таталітарызму яўна прасочваецца пры параўнаньні тэксту кнігі і камэнтара прадмовы. Калі чытаеш стараньне-крытычную прадмову, іншы раз ствараецца ўражаньне, што ў халоднай вайне перамог іншы Савецкі Саюз, і цяпер гэты Амэрыканскі Саюз Савецкіх Злучаных Штатаў круціць сьветам, як СССР круціў сваімі сацыялістычнымі эўрапейскімі сатэлітамі, што Вашынгтон кіруе эўрапейскімі краінамі, як Масква — сваёй нутраной і вонкавай імпэрыяй. А між іншым, Бжэзінскі ў сваёй кнізе сьцьвярджае, што Амэрыка стаіць на чале прынцыпова іншай сыстэмы разьмеркаваньня ўлады ў сьвеце. „У адрозьненьне ад

былых імпэрыяў, гэтая вялізная і складаная сыстэма не зьяўляецца гіерархічнай пірамідай“.
Абвінавачваньні ЗША ў імпэрскіх амбіцыях будуюцца на вераломнай пасылцы, быццам бы ЗША — імпэрыя, а не рэспубліка, тыранія, а не дэмакратыя. Асабліва бездапаможна выглядаюць гэтыя абвінавачваньні (выйдзем за рамкі прадмовы) з боку нядаўняга савецкага істэблішмэнту, нядаўняй імпэрскай адміністрацыі, незадаволенай падзеньнем свайго ўплыву на міжнароднай арэне, адміністрацыі, якая ня здольная і не жадае на месцы Імпэрыі Зла ствараць прававую дзяржаву і грамадзянскую супольнасьць. У выніку, у дакладнасьці паводле культавага сучаснага расейскага пісьменьніка Віктара Пялевіна, Імпэрыя ўсё больш прыпадабняецца да бананавай рэспублікі зла, якая імпартуе бананы зь Фінляндыі.
Што тычыцца пошуку Бжэзінскім новай стратэгіі сусьветнага панаваньня ЗША, трэба адзначыць: па-першае, ня трэба прымаць папулярную публіцыстычную працу за ваенную альбо палітычную дактрыну, а па-другое, і гэта важна, самаўсьведамленьне амэрыканскага грамадзтва ніколі не будавалася на базе глябальных мэсіянскіх ідэяў. Гэта посткастрычніцкая Расея ў чаканьні сусьветнай рэвалюцыі, дый перадрэвалюцыйная ў панславісцкіх парывах, грашылі мэсіянскімі фантомамі. Паводле статыстыкі, якую прыводзіць Зьбігнеў Бжэзінскі ў заключэньні „Вялікай шахматнай дошкі“, толькі 13% амэрыканцаў выступаюць за захаваньне Амэрыкай пазыцыі адзінага сусьветнага лідэра-звышдзяржавы, і 74% апытаных аддаюць перавагу таму, каб ЗША вырашалі сусьветныя праблемы побач з астатнімі дзяржавамі.

**Расея — „Чорная дзірка“**
Уяўляе цікавасьць дэталь дызайну вокладкі расейскага выданьня „Вялікай шахматнай дошкі“ — кружок у правым ніжнем куце з выяваю тэўтонскага шлема і рускага шалома з надпісам: „Вялікае процістаяньне“. Ня ясна, чаму вялікае, бо Савецкі Саюз зьнік, а Вялікая Расея — толькі міталягічнае мэнтальнае ўтварэньне, вялікае хіба тэрыторыяй і ядзерным патэнцыялам (рэальная моц якога, магчыма, моцна перабольшваецца).
Прастора, на якой раскінулася сучасная Расейская Фэдэрацыя, у Бжэзінскага называецца „Чорнай дзіркай“. Крыўдна, можа,

але факт застаецца фактам: гэта тэрыторыя, якая ўсё яшчэ застаецца ў дастатковай ступені непрадказальнай (і цяпер, і на момант напісаньня кнігі ў 1997 годзе). Хаця і мімаходзь, у разьдзеле, прысьвечаным постсавецкай Расеі, указваецца на спэцыфіку сучаснай расейскай дзяржаўнасьці, дагэтуль недастаткова асэнсаваную элітамі краінаў-суседзяў Расеі.
Расея, зь якой мы маем справу, існуе ня больш за дзесяць год, і гэта толькі прамежкавая форма, зь якой у пэрспэктыве можа атрымацца стабільная дэмакратычная дзяржава. Гэтую новую, цяжкатрансфармоўную Расею і ў самой Расеі, і ў Беларусі многія ўспрымаюць як пераемніцу СССР і Вялікай Расейскай імпэрыі. Але ні па этнічным складзе, ні з пункту гледжаньня сацыяльна-палітычнай арганізацыі, ні ў эканамічным пляне гэта не Расейская імпэрыя і не паменшаны СССР. Гэта ўжо *ня тая Расея*, як адзначае Бжэзінскі, гэта новая эўразійская дзяржава, але з у значнай ступені, на жаль, старымі палітычнымі элітамі. Менавіта гэтыя эліты і асацыююцца, і самі сябе асацыююць зь Вялікай Расеяй мінулага, у абліччы СССР альбо Імпэрыі, зь *Вялікай Мітычнай Расеяй*.
Крыўда за дзяржаву, а не людзей, якія яе насяляюць, характэрная для экс-савецкіх вярхоў, што культывуюць антызаходнія настроі. Але рэальна дэмакратычнай Расеі яшчэ няма, а імпэрскай — ужо няма. І няма сэнсу, як гэта робіць Ю.Кабаладзэ, зьдзіўляцца або абурацца, што Бжэзінскі піша аб ілюзорнасьці ўяўленьняў аб раўнапраўным стратэгічным партнэрстве між ЗША і недааформленай, маргінальнай Расеяй, значная частка вярхоў якой тужыць па імпэрскім статусе. На забесьпячэньне максымальнага ўдзелу Расеі ў сусьветных справах Бжэзінскі ўказвае як на *абавязковы этап* у станаўленьні новага сусьветнага парадку, стварэньні трансэўразійскай сыстэмы бясьпекі, калі Амэрыка паступова перастане дамінаваць, а сьвет стане дастаткова стабільным і інтэграваным. І ўсё ж, гэты неабходны этап можа быць ажыцьцёўлены толькі пры забесьпячэньні дэмакратызацыі і стабілізацыі самой Расеі.
Пакуль што для багатай Амэрыкі і Заходняй, ды ўжо ў немалой ступені і Цэнтральнай Эўропы забесьпячэньне раўнапраўнага партнэрства з Расеяй азначала б уласнаручную дэстабілізацыю сусьветнай абстаноўкі, чаго яны, натуральна, дазволіць сабе ня могуць. Сучасная Расея надта нестабільная, надта

карумпаваная, усё яшчэ надта індактрынаваная, ня кажучы ўжо аб тым, што яна зьяўляецца свайго роду ўзорам парушэньня правоў чалавека. Так што канца гісторыі (паводле Фукуямы) у Расеі, як і ў сатэлітнай Беларусі, і азіяцкіх дзяржавах СНД, чакаць давядзецца яшчэ доўга. ЗША апынуліся ў ролі адзінай сусьветнай звышдзяржавы, і цяпер вымушаныя зыходзіць акурат з свайго гістарычна ўзьніклага статусу, як на тое ўказвае Бжэзінскі, а не з ідэяў абстрактнай геапалітычнай справядлівасьці або пашаны да пачуцьцяў прыгнечанай імпэрскай годнасьці расейскіх вярхоў.

**Расейскае Пуэрта-Рыка**

Расейскі ўплыў у Беларусі зноў нарастае, але адбываецца гэта на фоне ўзмацненьня амэрыканскага і заходнеэўрапейскага ўплыву ў сьвеце ў цэлым.

Як гэта ні парадаксальна, але значная частка беларускай эліты, не жадаючы інтэграцыі з Расеяй, не жадае гуляць і па амэрыканска-эўрапейскіх правілах. Пад узьдзеяньнем расейскіх мас-мэдыяў, якія фармуюць беларускі погляд на міжнародныя падзеі, мноства беларусаў, і ня толькі расейскамоўных, глядзіць на сьвет расейскімі вачыма. Краіна, дзякуючы пасьлядоўнай палітыцы кіраўніцтва, паразытуе на расейскіх рэсурсах, у дакладнасьці на ўзор савецкай і новарасейскай элітаў, якія рабавалі і рабуюць расейскія нетры. Мёртва прымацаваная сучасным рэжымам да Расеі, але юрыдычна сувэрэнная Беларусь знаходзіцца ў становішчы гэткага расейскага Пуэрта-Рыка, і падпісаньне ўсё новых „саюзных“ дамоваў спрыяе замацаваньню гэткага статусу. Толькі ў адрозьненьне ад Пуэрта-Рыка, Беларусь рухаецца ў авангардзе расейскага імпэрскага рэваншу.

Аналіз ідэяў, выкладзеных у кнізе Бжэзінскага, актуальны для нас настолькі, наколькі цяперашняя беларуская замежная палітыка — гэта расейская замежная палітыка ў найбольш імпэрскім варыянце. Гэткі парадокс беларускай дзяржаўнасьці на мяжы тысячагодзьдзяў. Сваёй уласнай замежнай палітыкі, якая б адлюстроўвала беларускія нацыянальныя інтарэсы, а не інтарэсы расейскай алігархіі, у сучаснай Беларусі няма. Цяперашняя Беларусь у сваёй міжнароднай гіпастазіі — фарпост нават не сучаснай Расіі, якая перажывае

мадэрнізацыю, а зьніклай Расейскай імпэрыі, яе выспачка ў гісторыі. Усё пытаньне ў тым, наколькі магчымае адраджэньне Расеі ў якасьці якраз Расейскай Імпэрыі, чаго так баіцца Бжэзінскі (а таксама і расейскія заходнікі). Праблематычнасьць такога адраджэньня, новага збору земляў, крыецца ў самым мэханізьме адраджэньня Расеі, здольным забясьпечыць яе моцай для такога збору.

Мэханізм расейскага адраджэньня (як, у прынцыпе, і беларускага) можа быць толькі той самы, што і ў пасьляваенных Нямеччыны і Японіі, а менавіта засваеньне эканамічных, палітычных і сацыяльна-культурных стандартаў, якія вызнаюць краіны эўраатлянтычнай цывілізацыі. Праблема імпэрскага рэнэсансу пры пасьпяховай мадэрнізацыі расейскага, беларускага або ўкраінскага, як і якога іншага грамадзтва з імпэрскай мінуўшчынай палягае ў самой пасьпяховасьці такой мадэрнізацыі як зарукі адмовы ад імпэрскага шляху. Забесьпячэньне свабоды прадпрымальніцтва, правоў чалавека, рэальнага фэдэралізму і мясцовага самакіраваньня здольныя стварыць неабходныя матэрыяльныя рэсурсы для імпэрскага аднаўленьня, але зьмяняюць саму структуру разьмеркаваньня рэсурсаў, выстаўляючы эканамічныя, палітычныя і культурныя заслоны, што перашкаджаюць імпэрскай цэнтралізацыі. Перадумовы пасьпяховай мадэрнізацыі — дэмакратыя плюс рынак. Але спалучэньне демакратыі і рынку ў сучасным сьвеце робіць немагчымым імпэрскае разьвіцьцё краіны, што даводзіць прыклад Злучаных Штатаў або пасьляваеннай Японіі. У такім ракурсе перасьцярогі Бжэзінскага з нагоды імпэрскай будучыні Расеі выглядаюць крыху інэрцыйнымі.

Афіцыйная Беларусь, прытрымліваючыся формулы „імпэрыя мінус дэмакратыя і рынак“, апынаецца ў становішчы правінцыі, ня згоднай з распадам мэтраполіі, фактычна — прыдаткам Расеі, але ня ўсёй, а той, што ўсё яшчэ захоўвае сувязь з імпэрскім мінулым, бо цяперашняя Расея і палітычна, і эканамічна неаднародная. Каронны козыр расейскіх ультралевых і ультраправых — вялікая мітычная імпэрская мініўшчына — выкарыстоўваецца беларускімі вярхамі для ціску на расейскія эліты, якія або вымушаныя лічыцца з таталітарнай спадчынай Расеі, як лібэралы з Саюзу правых сілаў, або напоўніцу на ёй спэкулююць, накшталт камуністаў ці

групы Жырыноўскага. Інтэграцыйная рыторыка, якая ўсцяж прадукуецца афіцыйнай Беларусьсю, задае правілы гульні і расейскім заходнікам, якія ў барацьбе за выбарца абавязкова спасылаюцца на адзінства гістарычных лёсаў Беларусі і Расеі, хоць цалкам відавочна — ніякіх рэальных дывідэндаў ні простым расійцам, ні расійцам ва ўладзе аб'яднаньне ня дасьць. Значна больш выгадна бясконца доўга аб'ядноўвацца, у патрэбны момант распальваючы інтэграцыйны ажыятаж для павышэньня рэйтынгу і пераключэньня ўвагі грамадзтва зь іншых, больш важных, праблемаў.
Беларусь у гэтай гульні, як і Пуэрта-Рыка, застаецца заштатным штатам, у нашым выпадку — пазаштатнай расейскай губэрняй з усімі атрыбутамі аўтаномнай дзяржаўнасьці. Аднак, нягледзячы на спэцыфічную рыторыку кіраўніцтва і на асаблівасьці нацыянальнай індыфэрэнтнасьці, гэта адно толькі краіна-сатэліт, а ня першая вернутая правінцыя і не этап у зьбіраньні земляў наўкола Масквы. Сьвет радыкальна зьмяніўся. Час імпэрыяў мінуўся.
У расейска-імпэрскім пасьянсе, што раскладвае на эўразійскай шахматнай дошцы Зьбігнеў Бжэзінскі, беларуская карта выглядае ня больш як шасьцёрка, да таго ж неказырная. Але ў нас, беларускіх шасьцёрак, грамадзянаў юрыдычна ўсё яшчэ незалежнай дзяржавы, ёсьць некаторая, дарма што слабая пакуль, перавага над імпэрскай мінуўшчынай, якая замінае Расеі адмовіцца ад хімэраў нязбытнай самабытнасьці і духоўнай дамінацыі. Гэтая перавага палягае ў адсутнасьці або слабасьці імпэрскага сындрому ў большай часткі беларускіх элітаў. Як бы сучаснае беларускае кіраўніцтва ні эксплюатавала стэрэатыпы імпэрскай сьвядомасьці, посьпех імпэрскай рыторыкі ўсярэдзіне Беларусі зьніжаецца непазьбежна падпарадкаваным статусам беларусаў у этнасацыякультурнай прасторы Расейскай Імпэрыі.

**Нацыянальная веліч**
**і правы чалавека**

Разважаньні аб нацыянальнай велічы, якая часта атаесамляецца зь дзяржаўнай, пэрсаніфікуюць дзяржавы, але дэпэрсаніфікуюць людзей, якія ў іх жывуць. Амэрыканская ідэалягічная пляцформа злучае дзяржаўную палітыку і ацэнку дзяржавы ў цэлым з ацэнкай выкананьня правоў чалавека —

г.зн. з ацэнкай становішча кожнага канкрэтнага чалавека. Усе астатнія ідэалягічныя пляцформы дзяржаўнага будаўніцтва пры канцы XX стагодзьдзя аказваюцца хісткія і нетрывалыя. Але яны могуць зашкаджаць пабудове гуманнага грамадзтва, што грунтуецца на правах чалавека. Блякуючым зьвяном расейскай самасьвядомасьці застаецца міталягема Вялікага гістарычнага мінулага Расеі. Дыскрэтнае гістарычнае мінулае выдаецца за бесьперапыннае і мэтанакіраванае. Ад імені гэтага міталягічнага мінулага новыя/старыя расейскія эліты спрабуюць процістаяць дамінаваньню ЗША. Ад яго ж імені будуе сваю ўнутраную і замежную палітыку афіцыйны Менск. У кнізе Бжэзінскага паказана, чаму менавіта Амэрыка аказалася сусьветным лідэрам і чаму яна ім застаецца, а таксама чаму ў сьвеце ў цэлым дамінуе Захад. Прадмова да расейскага выданьня яшчэ раз даказвае, што Расея пакуль цьвёрда сябе з Захадам не атаесамляе.

---

**WWW.KAVKAZ.ORG**

Расейскамоўны сайт чачэнскіх незалежнікаў мае сталыя рубрыкі „Навіны“, „Фотаздымкі“, „Аналітыка“, „Іслам“, „Гісторыя“, „Архіў“ і іншыя, спасылкі на іншыя інфармацыйныя рэсурсы. Пэрыядычнасьць выхаду навінаў - раз у суткі. Нядаўна на ім распрацаваныя дадатковыя моўныя опцыі, цяпер „гарачыя“ навіны дублююцца па-ўкраінску, ангельску, швэдзку, фінску і басьнійску.

Сайт адлюстроўвае афіцыйную пазыцыю чачэнскага ваеннага камандаваньня і працуе ў рэжыме „прапагандысцкай вайны“: штовыпуск падаюцца яўна завышаныя зьвесткі пра страты „ў жывой сіле і тэхніцы“ праціўніка, а мова паведамленьняў вельмі нагадвае адпаведны „канцылярыт“ расейскіх генэралаў, толькі тут фігуруюць расейскія „найміты“, „так званыя спэцназаўцы“ і „расійскія крымінальна-тэрарыстычныя банды“. Сайт хуткадзейны, і праца зь ім дасьць задавальненьне кожнаму цікаўнаму.

---

**XIX стагоддзе**
**Навукова-літаратурны альманах**
**кніга першая**
Менск БДУ 1999
Першая кніга навукова-літаратурнага альманаху „XIX

стагодзьдзе“ сваім зьяўленьнем ад пачатку і да канца абавязана літаратуразнаўцу і перакладніку, кандыдату філялягічных навук Міколу Хаустовічу, які самахоць узваліў на сябе цяжар і тэхнічнай падрыхтоўкі выданьня, і перакладніцка-рэдактарскіх абавязкаў.
Альманах складаецца з артыкулаў на літаратуразнаўчую і агульнагуманітарную тэматыку самога ўкладальніка („Нараджэньне беларушчыны“, „Апалёгія беларускае польскамоўнае літаратуры“, „Пясьняр ліцьвінскае шляхты“, „Цяпер маскаль пяе мудрагелікі свае“ і г.д.), зь вершаў Адама Міцкевіча, Яна Баршчэўскага, Тадэвуша Лады-Заблоцкага ў польскім арыгінале і ў перакладах на беларускую мову, зробленых Рыгорам Барадуліным, з публікацыяў у аўтэнтычным графічным выкананьні раней недаступных чытачу архіўных матэрыялаў - „Hutarki staroho dzieda“ і „Kryudy i Praudy“, „Krotkiego zebrania nauki chrzescianskiej“, а таксама зь перакладной прозы пісьменьнікаў, якіх укладальнік залічае - і зусім слушна робіць - у прадстаўнікі беларускай польскамоўнай літаратуры (Марцін Асорыя „Нешта тут сабакам сьмярдзіць“, Ігнат Ходзька „Успаміны Квэстара“, Генрык Равускі „Князь Радзівіл Пане Каханку“, Францішак Карпінскі „Падарожжа па зачараваным краі“, Юзаф Ігнат Крашэўскі „Кунігас“, Аляксандар Гроза „Нечаканы госьць“).
Альманах быў выдадзены коштам Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту.
Даведкі наконт выданьня можна атрымаць
на катэдры гісторыі беларускай літаратуры
азначанага ўнівэрсытэту.

---

**Леонид Смиловицкий**
**Евреи Беларуси: из нашей общей истории, 1905-1953 гг.**
Менск, Арты-Фэкс, 1999
Аўтар, навуковы супрацоўнік Інстытуту габрэйскай дыяспары пры Тэль-Авіўскім унівэрсытэце, зрабіў спробу асьвятліць найбольш важныя этапы разьвіцьця гісторыі жыдоў Беларусі за паўстагодзьдзя. Ён спыняецца на розных баках габрэйскага жыцьця.
Асаблівая ўвага надаецца гісторыі Галакосту і палітыцы нямецкага генацыду, удзелу жыдоў у партызанскім руху, беларускім „праведнікам“, што ратавалі жыдоў у вайну з рызыкай для ўласнага жыцьця. Аўтар зьбівае міт пра „пакору“

жыдоў нацыстам.
Упершыню дасьледуецца рэлігійнае жыцьцё беларускіх жыдоў у 1944-1953 гадох. Каму трэба, знойдзе ў кнізе вялікі даведачны матэрыял. Фактычна, кніга - вынік дасьледчай працы аўтара ў беларускіх, расійскіх і ізраільскіх архівах пасьля выезду зь Беларусі ў Ізраіль у 1992 годзе.
Прадмову да кнігі напісаў прафэсар Ерусалімскага жыдоўскага ўнівэрсытэту Шаўль Штампфэр. Выдала кнігу прадстаўніцтва „Джойнту“ ў Беларусі.

---

**Мішпаха**

Выйшаў шосты нумар часопіса-альманаха „Мішпаха“ - сапраўднай візытоўкі сучаснага беларускага габрэйства.
Часопіс „Мішпаха“ выходзіць у Віцебску з 1995 году, цяпер - 2 разы на год.
Ягоны заснавальнік - Саюз беларускіх жыдоўскіх грамадзкіх арганізацыяў і суполак, а спансаруе American Jewish Joint Distribution Committee. Галоўны рэдактар часопіса - Аркадзь Шульман. Наклад - 1400 асобнікаў. Распаўсюджваецца ён у жыдоўскіх асяродках Беларусі, а таксама сярод эмігрантаў зь Беларусі ў Амэрыцы, Эўропе, Ізраілі, цешыцца вялікай папулярнасьцю ў Расеі.
У нумары зьмешчаны фрагмэнты аповесьцяў Аляксандра Чарніцкага „Каханьне Голды Мэір“, Аркадзя Крумэра „Бабулін двор“, апавяданьне Сямёна Злотнікава „Лялечка“, вершы Галіны Левінай, Яфрэма Баўха, Міхаіла Рубіна, Елізаветы Палеес.
Эсэ Іны Герасімавай „Родам з Моталя“ апавядае пра нашага зямелю, першага прэзыдэнта Ізраіля Хаіма Вэйцмана. Слынны беларускі пісьменьнік і публіцыст Уладзімер Мехаў у рубрыцы „Імя“ піша пра Хаіма Мальцінскага і Рыгора Шыфрына.
Былы рэдактар газэты „Авіў“ Міхаіл Нардштэйн публікуе сваё эсэ „Узьняцца й выстаяць“ пра сьмелых актывістаў менскага сыянісцкага руху 70-х гадоў Лява Аўсіцэра, Навума Альшанскага і Яфіма Давідовіча.
Шэраг артыкулаў пра габрэяў-эмігрантаў зь Беларусі (у папярэдніх нумарах распавядалася пра ЗША і Вялікую Брытанію) працягвае гутарка пра беларускіх жыдоў у Францыі.
Шматлікія матэрыялы прысьвечаныя гісторыі, этнаграфіі, культуры жыдоў Беларусі, друкуюцца артыкулы, нарысы і ўспаміны пра знаных артыстаў, пісьменьнікаў, кампазытараў,

філёзафаў. Для аматараў архіўных адкрыццяў цікавымі будуць дасьледаваньні Аркадзя Лейзерава, Міхаіла Кемерава, Валер'я Шышанава.
У падборцы „Прозьвішча - Шульман“ друкуюцца эсэ Жанны Маркоўскай-Шульман пра сям'ю асьветнікаў, пісьменьнікаў, музыкаў, зь якой выйшаў слынны сьпявак Зіновій Шульман, эсэ Міхаіла Шульмана - „Мы - людзі школьныя“, артыкул вядомай мастачкі Ліі Шульман пра сваіх бацькоў, дасьледнікаў марской фаўны.
У часопісе друкуецца безьліч лістоў, згадак і мэмуараў, дасланых у рэдакцыю з усіх чатырох канцоў сьвету.
У падрыхтоўцы нумару дапамагалі Якаў Басін і Май Данцыг.
Часопіс выходзіць па-расейску, але цалкам прысьвечаны лёсам і творчасьці беларускага жыдоўства. Сваёю цеплынёй і чуласьцю ён нагадвае сямейны альбом, са старонак ягоных паўстае непаўторнае жыцьцё й дух беларускага жыдоўства.
А рэдакцыя ягоная сядзіць у Віцебску на вуліцы Калгаснай, 4.
Можна рэкамэндаваць найшыршаму колу чытачоў.
Толькі што створаны сайт „Мішпахі": www.mishpoha.org.
Адрас для карэспандэнцыі:
210001 Беларусь Віцебск а/с 22
E-mail mishpoha@aport.ru

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-04-2000**

да Зьместу 2(7)-2000 **Андрэй Хадановіч**

# Вісячыя Вертаграды
# Вянок на магілу Семяжона Полацкага

*Міхась Баярын. Шалёны вертаградар (Вянок на магілу Ёзэфа Кнэхта).*
*— Менск: БГАКЦ (па замове Эўрофоруму), 1998.*
*Міхась Баярын. Senectutes. — Менск: Крыніца, №55.*
*Міхась Баярын. Umbrae. — Менск: Nihil, 1999.*

**АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ**
паэт, перакладчык паэзіі і гуманістыкі,
выкладае замежную літаратуру ў БДУ.

Усе вы, паэты
для паэтаў, што
пішуць вершы
пра паэзію,
Усе вы, паэты
паэтычных
сэмінараў…
Усе вы,
бяздомныя Эзры
Паўнды…
*Лорэнс Фэрлінгеці*
Ня крыўдзі
хлопчыкаў,
не дражні іх
словамі з
энцыкляпэдыі.

Хлопчыкі такія
датклівыя,
а ты завеш іх
„качканосамі“ й
„мурашкаедамі“.
*Ален Баске*

**Дзі**ўную рэч прапаноўваю я табе, аматар беларускай паэзіі, — рэцэнзію, якая спазнілася больш чым на год. Сёньня дзьвюхтысячны, а яшчэ ў 1998-м у наяўнасьці меліся ажно два наклады — адзін самаробны, другі з „фрагмэнтаўскай“ сэрыі „Галерэя Б“ — кнігі вершаў „Шалёны вертаградар“, пра якую й пойдзе гаворка. Прозьвішча аўтара кнігі воляй лёсу таксама пачынаецца зь літары „Б“, што сымбалічна. Гэта прыгожае, „паэтычнае“ прозьвішча, якое магло б цалкам пазбавіць (як сьведчыць практыка, так і не пазбавіла) яго носьбіта пошукаў непатрэбных псэўданімаў. У спазьненьні рэцэнзіі былі свае прычыны: у 1998 аўтар гэтых радкоў ужо ведаў пра іншыя, пазьнейшыя тэксты Міхася Баярына — „*Senectutes*“ ды „*Umbrae*“, якія падабаліся яму значна больш за сабраныя ў кніжцы. Калі параўноўваеш „Шалёны Вертаградар“ з двума апошнімі творамі, бачна, што ён збольшага — зь яскравым выняткам „Лістоў да беларускага сябра“ — складаецца зь літаратурных штудыяў паэта-пачаткоўца, вельмі таленавітага, але ж пачаткоўца, які хутчэй абяцае зьяўленьне праўдзівай паэзіі, чым дэманструе яе. Дзьве ж апошнія баярынаўскія публікацыі, у часопісе „Крыніца“ (№55) і альманаху „Nihil“ (не даяце веры — можаце набыць ды спраўдзіць самі!), пераканаўча паказалі, што абяцаньне гэтае паэт покуль стрымлівае. Гэта дае нам поўнае права корпацца ў спробах і памылках „шалёнага вертаградара“, аддзяліўшы яго, нібы цень, ад сьветлай постаці Міхася Баярына — лідэра маладых беларускіх паэтаў. Корпацца бяз страху пашкодзіць ягонай літаратурнай рэпутацыі — ёй, дзякаваць Богу, нічога не пагражае. Не нанесла ж істотнага ўдару па рэпутацыі Віславы Шымборскай зьяўленьне па-беларуску ейных раньніх сацрэалістычных вершаў у згаданым „Nihil’і“ зь ведама згаданага Баярына, — народ мусіць ведаць пра сваіх герояў усё!

Сутыкнуўшыся з баярынаўскай паэзіяй упершыню, я быў узрушаны, захоплены перадусім яе непадобнасьцю да ўсяго, з

чым у нас трывала асацыюцца беларускія вершы. Я ня ўпэўнены, што векапомнае пушкінскае сьцьвярджэньне, так бы мовіць, паэтычная „формула адзін“ — „паэзія мусіць быць дурнаватаю“ — пайшла на карысьць расійскай літаратурнай традыцыі, але бадай што нідзе яна не нарабіла столькі шкоды, колькі тут, у нас, дзе кожны „загад па войску мастацтваў“ выконваўся з дакладнасьцю. Чытач, які спадзяецца, што паэт будзе цешыць ягоную душу прыгожым словам і ня будзе турбаваць мозгу, — ня дзеля трэніроўкі ж зьвілінаў вынайшлі паэзію, яна ж не крыжаслоў! — непрыемна расчаруецца. Менавіта рацыянальнага ўспрыманьня гэтыя тэксты часам і вымагаюць. Мы прызвычаіліся, што паэзія, напісаная сэрцам і прызначаная не для абдумваньня, а для пачуцьцяў, сапраўднейшая. Таму паэт-інтэлектуал мусіць наперад апраўдваць сам факт свайго існаваньня. А ці варта?
Калі, чытаючы той ці іншы тэкст Баярына, трапляеш у інтэлектуальную пастку, дык вінаваты ў гэтым найхутчэй не Баярын, а нехта іншы (здагадайся, хто).
Расчаруецца сярэднестатыстычны чытач і яшчэ ў дзьвюх рэчах: у сваім нібыта-дасканалым валоданьні беларускай мовай і ў сваёй нібыта-глыбокай літаратурнай эрудыцыі. Наконт першага прасьцей: шчыра раю ўзброіцца слоўнікамі Ластоўскага і перадусім Байкова-Некрашэвіча. Ня ўзрушыць паэзія Баярына, дык прынамсі павялічыш свой пэрсанальны лексычны запас. Сустрэўшы тое ці іншае дагэтуль невядомае ўласнае імя, таксама можна зьвярнуцца па літаратурную даведку да пэўнай першакрыніцы, ад акадэмічнай энцыкляпэдыі да трывіяльнага чытва ў стылі фэнтэзы (Гамэр і Жэлязны тут амаль суаўтары, роўныя ў аўтарскіх правох як міжсобку, так і з паэтам Міхасём Баярыным). Не атрымаеш катарсысу, дык хаця б пашырыш культурны далягляд.
Значна цяжэй угледзець у сустрэтым словаспалучэньні прыхаваную цытату, пагатоў далёка ня кожны аб’ект цытаваньня адной табе належыць, Беларусь мая! І тут ужо ніякага даведніка не параіш. Мусіцьмеш далучацца да сусьветнай літаратуры як такой, кожнага разу вырашаючы для сябе пакутлівую праблему: на якой мове чытаць тое, чаго па-беларуску проста не існуе (такіх выпадкаў — пераважная бальшыня). Мяркуючы па кнізе, Міхася Б. гэтая праблема ня надта абыходзіць. Напэўна, я не памылюся, сьцьвердзіўшы, што

пэрыяд „Шалёнага вертаградара“ прайшоў для Баярына-чытача пад знакам беларускіх слоўнікаў — і расійскамоўных перакладаў замежнай літаратуры. Ня трэба далёка хадзіць па довады, вось, да прыкладу, радок зь „Перадапошніх хімэрычных баляд“: „Зьніклі Кот, Брандашмыг, Бармаглот“. Натуральна, пазнаецца Кэрал, але Кэрал расійскі, Кэрал дэмураўска-маршакоўска-седакоўскі. Так, можна згадаць, што „Бармаглот“ у сябе на радзіме завецца „The Jabberwocky“, у Нямеччыне — „Der Jammerwoch“, у Францыі — „Le Jaseroque“, у Польшчы — „Dziaberliada“. Ну, а ў нас покуль, на вялікі жаль, як у Баярына. Зь іншага боку, выдумай беларускую назву — не пазнаюць, дзякуй, калі шчэ Бармаглота ведаюць. Бляск ды мізэрнасьць інтэртэкстуальнасьці па-беларуску! Нават назва кнігі апэлюе часткова да расійскае літаратурнае традыцыі — да расійскамоўнай кнігі вершаў паэта, якога ў нас часьцяком скарачаюць як С.Полацкі (ці не фаміліянт, выпадкам, Э.Полацкай?), кнігі „Вертоград многоцветный“. „Вертаград“ — гэта, ведама ж, „сад“, а „шалёны вертаградар“, адпаведна, — ці то „звар’яцелы садоўнік“, ці то „разьюшаны садыст“.
Мае жарты, магчыма, выходзяць за межы баярынаўскай задумы, але добра выяўляюць сутнасьць ягонага творчага мэтаду (калі можна скарыстаць з старасьвецкага тэрміну „творчы мэтад“). Свайго часу паэт Эзра Паўнд, ведамы Баярыну й нават перакладзены ім у памеры дзьвюх першых „Песень“ із славутых „Cantos“ (Крыніца, №57), прапанаваў сусьветнай паэзіі свой „ідэаграфічны мэтад“. Сутнасьць мэтаду вось у чым: як кітайцы могуць аб’ядноўваць два розныя гіерогліфы ў трэці, сэнс якога ня ёсьць простай сумай двух зыходных, так і паэт можа злучыць два (ці больш) вобразы, дзьве, тры й г.д. цытаты, колькі топасаў у пэўным самастойным мастацкім адзінстве, а калі культурная вартасьць таго, што атрымалася, вытрымлівае канкурэнцыю із сваімі літаратурнымі складнікамі, дык гонар ды пашана гэтаму паэту. Элемэнтарны прыклад: „Лісты да беларускага сябра“ ў сваёй амаль элегічнай вэрсыфікацыйнай пабудове проста ня могуць ня выклікаць асацыяцыяў зь лістамі да сябра рымскага (хай Марцыял ды Бродзкі даруюць мне зьнікненьне двукосься, а адукаваныя чытачы — тлумачэньне „агульных месцаў“), а пры канцы ператвараюцца ў лісты з-пад шыбеніцы, што не замінае ім застацца тымі самымі лістамі. Вось жа, ёсьць у кнізе топасы й іх „ідэаграфічныя“

кантамінацыі, без выяўленьня якіх тапаграфічная мапа баярынаўскай творчасьці будзе недакладнай. Апрача садысцкага альбо несадысцкага вертаградарства варта адзначыць матыў вяртаньня Адысэя-Ўліса. (Карыстаючыся аказіяй, адзначу, што Баярын — рэдкі ў нашай культуры аўтар, які ведае, як правільна ставіць націск у слове „Уліс“. Але артаэпічную веду можна й трэба пашыраць: так, Міхасю, націск у слове „Тартар“ падае ня так, каб зручней было ўставіць слова ў радок, а па-ранейшаму на першы склад.) Ёсьць адысэеўскія ноткі ў голасе лірычнага героя „Лістоў да беларускага сябра“, але „соплі лазуры й хмар“ — о радасьць пазнаваньня! — неаспрэчна даводзяць, што Адысэеў карабель (у Баярына тут і паўсюль ён чамусьці называецца „жагляром“, хоць „Старабеларускі лексікон“ Прыгодзіна і Ціхановай тлумачыць „жегкляръ“ як „марак“) у нас на вачох ап’янеў, як ня мроілася нават выхаванаму на капітане Нэма шарлевільскаму аматару прыгодніцкага чытва, чыё прозьвішча ў нас звычайна вымаўляюць так, што гэта нагадвае зусім іншы прыгодніцкі жанр. Але мэтамарфозы на гэтым не канчаюцца. У спадарожнікі да героя, натуральна, трапляе Харон, і ўсё ўстае на свае месцы. Ладзьдзя Роспачы паўз Сцылу й Харыбду, паўз „зорныя архіпэлягі“ й „багны Левіятана“ плыве ў Аід-Гадэс-Тартар, а непадрыхтаванага чытача апаноўвае нелітаратурная роспач — надта ўжо складаную „ідэяграфічную“ партыю вядзе Баярын. Бавіцца інтэлектуальнымі гульнямі ў вісячых вертаградах Баярына — гэта вам ня ў шахматы ізь сьмерцю гуляць! Там, дзе Караткевіч здольны „запазычыць“ адно сюжэтны ход у Бэргмана (глядзі фільм „Сёмая пячатка“), аўтар „Лістоў“, не сумеўшыся, па-бэндэраўску „сьцягне“ з дошкі шахматную фігуру, якою, цалкам магчыма, будзе акурат ладзьдзя роспачы (хай Караткевіч ды Баярын даруюць мне зьнікненьне двукосься, а адукаваныя чытачы — чарговае тлумачэньне банальнасьцяў).

Дарэчы, шматкроць тут згаданыя „Лісты да беларускага сябра“ могуць стацца добрай нагодаю для разваг пра ўласна вэрсыфікацыйны бок баярынаўскай паэзіі. Нетрадыцыйнасьць верша (ход не пра вершаваны твор, а пра рытмічную пабудову асобнага радка) прыемна вылучае ягоныя тэксты на фоне сучаснай айчыннай паэзіі. Калі казаць пра апошнюю, дык яна збольшага існуе ў двух варыянтах. У першым выпадку

складаецца ўражаньне, што аўтары сумленна карыстаюцца „азамі“ тэорыі вершаскладаньня, набытымі шчэ ў школе, з тае пары ня надта пасунуўшыся наперад, альбо наагул лічаць ніжэйшым за свой гонар памятаць пра такую драбязу. Навошта? Лепш кіравацца натхненьнем ды інтуіцыяй, якія калі й каго падмануць, дык калег па рамяству — гэта яны, няздары, хай памятаюць пяць мудрагелістых назоваў; ім гэта ўсё адно не дапаможа, а мне, генію, маўляў, няма чаго пераймацца. Другі дыягназ — павальнае захапленьне вэрлібрам. Гэта ўвогуле не вымагае ніякага рамяства й нічым не абмяжоўвае вольнага лёту творчай думкі. Галоўнае ўмець нестандартна мысьліць, а там драбі сабе сказы на кавалкі, запісваючы іх „у слупок“ (плацяць у нас па-ранейшаму за радкі!). Да таго ж, калі прыйдзе час міжнароднага абмену культурнымі набыткамі, замежныя калегі з большай ахвотаю возьмуцца перакладаць менавіта цябе.

Паэтычныя спробы Баярына ня ўпісваюцца ў гэтыя сцэнары вэрсыфікацыйных паводзінаў. Тое, што паміж рэгулярным вершам і вэрлібрам існуе безьліч пераходных стадыяў, паэту, на шчасьце, добра ведама. Да таго ж, можна карыстацца сыстэмамі вершаскладаньня, якія выпрацавалі культуры, старажытнейшыя за нашую. Да прыкладу, антычнымі — мусілі ж нечаму навучыць на клясычным аддзяленьні філфаку! Навошта насьледаваць ізь сьляпою дакладнасьцю? Досыць зрабіць тонкую стылізацыю. Стылізуй верш пад антычнае элегічнае двухрадкоўе, пэнтамэтар, нешта ў рытме спрасьціўшы, але пакінуўшы агульны калярыт, — і атрымаеш акурат рытм „Лістоў да беларускага сябра“. Ёсьць, аднак, у „Лістох“ адзін элемэнт паэтыкі, які немагчыма сустрэць у элегіях Авідыя, Прапэрцыя ды Тыбула, элемэнт барбарскі, сярэднявечны. Уважлівы чытач заўважыць, што канчаткі ўсіх цотных радкоў сугучныя міжсобку, то бок 71 радок сканчаецца тым самым галосным [а]. Цяжка назваць гэта скразным рымам, надта ўжо недакладная гэтая рымоўка. Згадваецца хутчэй старажытнафранцускі эпас („Песьня пра Ралянда“), дзе ў кожным кавалку тэксту, так званай лесе, альбо тырадзе, усе вершаваныя радкі маюць адзін і той самы канцавы галосны. Гэта асанансная рымоўка, досыць архаічны паэтычны сродак, які, дзякуючы нашаму паэту, атрымлівае сваё другое жыцьцё. (Колькі разоў можна ажывіць, здавалася б, незваротна

памерлае, з дакладнасьцю ведаюць адно паэты ды, бадай што, яшчэ аматары кампутарных гульняў!)
Хаўтурны вянок, якім аўтар зычлівым жэстам Мэльпамэны аздабляе магілу Ёзэфа Кнэхта, прымушае згадаць пра недаступную сьвіньням суцэльна кашэрную гульню шкляных пэрлаў, таму краіна на нашай мапе, згодна з воляю Гесэ, магла б насіць назву „Касталія“.
Хоць усе хібы і няўдачы кнігі ўраўнаважваюцца несумнеўнымі ўдачамі, немагчыма, аднак, устрымацца й не прывесьці тут колькі баярынаўскіх „шкляных пэрлаў“, пару-тройку найвыдатнейшых прыкладаў таго, да чаго вядзе нічым не ўтаймаваная прага моўнага пурызму й не зусім крытычнае стаўленьне да сваёй паэтычнай прадукцыі.

*У падземных сутарэньнях*
*майго дома*
*Працуюць, што ў пекле,*
*качкн (sic!).*

Магчыма, апошняе загадкавае словаўжываньне на сумленьні не пазначаных у кнізе рэдактара й карэктара (барані мяне, Божа, сьцьвярджаць, што іх проста не было!), а нам цікавейшыя „падземныя сутарэньні“. Цалкам зразумелае жаданьне гаварыць прыгожа й не выкарыстоўваць словаў, якія б нагадвалі расійскія альбо беларускую мову „зьвяздоўскага“ кшталту. Але ж усяму ёсьць мяжа! „Сутарэньне“ — гэта ад французскага „*souterrain*“, што ўжо азначае „падземны“. З роўным посьпехам можна было б напісаць і „падземны андэграўнд“. (Трэ было зьвярнуць увагу на гэты выпадак яшчэ й таму, што нешта падобнае да „падземных сутарэньняў“ мільгае і ў пазьнейшых творах „сталага“ Баярына.) А „ачавістыя віжы“, „канцавосныя калянасьці“ (ці не на адной бачыне слоўніка аўтар пэўнага дня знайшоў абодва словы й хуценька ўставіў у верш, каб не забыцца на каштоўны лексычны набытак?), „зеркі“, „зіркі“ ды „пазоры“, якія апускае лірычны герой, трохі перашкаджаюць пад час чытаньня ды псуюць уражаньне ад добрых, па вялікім рахунку, вершаў. Так, ёсьць прэцэдэнты зафіксаванага ўжываньня слова „пазор“, але ў сэнсе „чароўнасьць“ (слоўнік Я.Станкевіча ды інш.), а не „пагляд“, да таго ж — ці ня досыць лексычных дублетаў для выражэньня таго самага панятку? Ці не пакінуць гэтае слаўцо ў яго міжмоўнай шматзначнасьці расійцам, чэхам ды палякам? Лепш карыстацца знаходкамі

пурыстаў дзеля таго, каб закрываць „белыя плямы“ ў нашай лексыцы — іх покуль хапае! Што ж да „зерак“-„зірак“, дык добра было б, каб аўтар выпрабаваў іх жыццяздольнасьць, назваўшы так прыўкрасныя вочы сваёй абраньніцы — так хутчэй вучышся ашчаднасьці словаўжываньня!

Некалі, гартаючы тую ці іншую кнігу вершаў альбо праглядаючы яе зьмест, мы цешыліся забаваю — складалі ў адзінае цэлае колькі першых радкоў пазначаных „зорачкамі“ твораў. Цікавыя атрымліваліся рэчы. Вось, прыкладам, у Мандэльштама сьледам за „Я не слыхал рассказов Оссиана“ літаральна карціць паставіць „Я не увижу знаменитой Федры“, а радкі „Выхожу один я на дорогу“ (Лермантаў), „Выхожу я в путь, открытый взорам“ (Блок) і „Гул затих. Я вышел на подмостки“ (Пастэрнак), на маю думку, проста створаныя адзін для аднаго. Урэшце атрымлівалася нешта накшталт: „Дано мне тело — что мне делать с ним//В разноголосице девического хора?//Как этих покрывал и этого убора//В морозном воздухе растаял легкий дым!“ — такая вось эротыка на марозе, змайстраваная зь першых радкоў чатырох розных твораў Мандэльштама! Кажуць, нечым такім займаліся свайго часу ваганты. Калі так, дык у вас ёсьць магчымасьць адчуць сябе патэнцыйным вагантам. Досыць набыць баярынаўскі „Шалёны вертаградар“ ды перагарнуць колькі першых бачынаў. „Калі конь вырываецца з стайні…“, „Калі прыціхае вецер…“. Можа, выпадковасьць? Ды не. „Калі мяне нарадзілі…“. Тры зь першых пяці тэкстаў. Вось жа, амаль паводле Кіплінга, паэт пачынае як праўдзівы вязень замка „If“! Паказальна, што беларускае „калі“ выражае ня толькі час, але й умоўнасьць, таму ёсьць спакуса паставіць пад пытальнік сапраўднасьць усяго, пра што тут апавядаецца. „Калі мяне нарадзілі…“ Паспрабуйце перачытаць тэкст у гэтым ключы. А ў галаве ўсплывае ці то з Караткевіча, ці то з Хлебнікава: „Калі паміраюць дрэвы… калі паміраюць жывёлы… калі паміраюць гарады… калі паміраюць плянэты… калі памірае каханьне — пяюць песьні“.
Аднойчы мне паталаніла: я пачуў, як Баярын пяе ўласныя вершы, акампануючы сабе на гітары. Сказаць, што Міхась ня мае слыху й дрэнна валодае музычным інструмэнтам — гэта нічога не сказаць! Але было нешта, што прымусіла мяне задушыць у горле гамэрычны рогат. Напэўна, гамэраўскі патас

— сьмешная й велічная перакананасьць аэда-рапсода, што адзіная годная форма апавядаць пра істотнае, адзіная запарука праўдзівасьці ў абодвух сэнсах гэтага слова — менавіта сьпеў. Так, усе мы ведаем, што можа здарыцца, калі вуха музыкі сустракаецца зь лёгкай ступою выхаванца смаргонскай акадэміі, але ў паэтаў свой унутраны слых, які ня мае з музычным амаль нічога супольнага. Пагатоў, ёсьць яшчэ непарушнае права паэта чытаць свае творы ўголас, якім Баярын карыстаецца адмыслова. Ягоная дэклямацыя, самадастатковая, безь відочнага жаданьня спадабацца публіцы, прызначана хутчэй для камэрных паэтычных чытаньняў, чым вялікіх заляў, стадыёнаў альбо мітынгаў („у вузкім сямейным кодле“, — як пажартаваў бы сам паэт). У расійцаў ёсьць калямбур: для таго каб цябе „*слушали*“, трэба, каб цябе „*слышали*“. Гэта пастулят для прамоўцаў (ад слова „promotion“), што працуюць зь вялікаю аўдыторыяй. Беларуская мова падказвае прынцыпова іншую формулу: каб цябе напраўду *слухалі*, твае словы мусяць быць *слушнымі*. А гэта ўжо ня колькасная, а якасная характарыстыка, і ці ня тут — зародак элітарнасьці наагул і „цяжкасьці“ паэзіі Баярына ў прыватнасьці? Некалі Фэдэрыка Гарсія Лёрка тлумачыў гішпанцам, што паэт Гонгара зусім ня „цёмны“, проста, у адрозьненьне ад іншых паэтаў, якія самі прыходзяць да нас із сваім паэтычным смуткам, яго трэба шукаць, і шукаць розумам. „Цёмным“ і „сьветлым“, па вялікім рахунку, бывае не паэтычны стыль, а розум чытача. Таму той факт, што дадзеная запозьненая рэцэнзія дагэтуль актуальная, бо наклад „Вертаградара“ да сёньня не раскуплены, — гэта дакор найхутчэй не Баярыну, а некаму іншаму (здагадайся, каму!).

---



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
[image]
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 12-04-2000**

да Зьместу 2(7)-2000 **Людміла Рублеўская**

# Дапісацца да міленіюму Агляд беларускага літаратурнага друку за 1999 год

**ЛЮДМІЛА РУБЛЕЎСКАЯ**
літаратурны крытык, працуе ў тыднёвіку „Літаратура і мастацтва“.

**Агульны рэверанс чытачу**

**1999** год, апошні перад прыходам таямнічага „міленіюму“ (слоўца ўплішчылася ў нашу мову з хуткасцю інфернальнага паразіта), не стаўся мяжою якаснага пераходу беларускай літаратуры ў іншы стан. Магія лічбаў не можа каталізаваць ні культурнае, ні тым больш эканамічнае жыццё. Выпілі ў навагоднюю ноч шампанскага, спалілі пару бенгальскіх агнёў, павесяліліся і ляглі спаць. Каб у наступны панядзелак ісці да працоўных месцаў у прыватных альбо дзяржаўных установах, у тым ліку ў рэдакцыі і выдавецтвы.

Наконт апошніх можна адзначыць тую тэндэнцыю, што недзяржаўных выданняў крыху паболела, а дзяржаўных паменела. Здзіўляцца такой акалічнасці не даводзіцца. Палітыка дзяржавы цалкам дазваляе пад лозунгам эканоміі народных сродкаў зачыняць „нудотныя“ ды „клопатныя“ выданні, а тыя, што засталіся, трымаць у стане прыжывалы, які баіцца раззлаваць літасцівага гаспадара, абы захаваць

фінансаванне.
Кола беларускамоўных пісьменнікаў старэйшага пакалення шчыльна абступае спансараваныя дзяржавай літаратурныя выданні, вызначаючы іх узровень сваімі творамі, маладыя ладзяць уласныя незалежныя выданні, чый узровень няроўны, а самаацэнка аўтараў часамі завышаная.
Падобнае ж адбываецца і ў правінцыі — тамтэйшыя літаратары выдаюць і выдаюцца, бадай, больш актыўна, чым у Менску. Іншая справа, што выданні гэтыя ў рукі сталічных „экспертаў“ трапляюць рэдка, і пра гэта можна напісаць асобны артыкул. Жанр „агляду“ прадвызначае адстароненасць погляду і максімальную аб’ектыўнасць. Я тут засяроджваюся на коле літаратурна-мастацкіх выданняў, пакідаючы па-за ўвагай тыя публікацыі, дзе хаця і ёсць літаратурна-мастацкія старонкі, але асноўны накірунак якіх — публіцыстыка, навука, рэлігія, гісторыя і г.д. Не аналізую я расійскамоўных выданняў — найперш „Нёману“, дзе беларускія аўтары перакладаюць звычайна тое самае, што ўжо друкавалася ў беларускамоўных выданнях у арыгінале. Мае ўражанні пасля знаёмства з беларускімі літаратурнымі і культурніцкімі часапісамі размеркаваліся наступным чынам.

**„Крыніца“**
Ужо стала традыцыяй, што самыя „пошукавыя“ творы найчасцей з усіх дзяржаўных выданняў друкуе „літаратурна-культуралагічны“ часопіс „Крыніца“. У мінулым годзе гэты часопіс перажыў змену галоўнага рэдактара (замест Уладзімера Някляева, што эмігравaў у Польшчу, прыйшла паэтка Галіна Булыка, дачка мовазнаўцы з Акадэміі Навук), матэрыяльныя цяжкасці, з-за якіх парушылася рэгулярнасць выхаду і з’явіліся падвойныя нумары. „Крыніца“ ўсё ж надрукавала аповесць свайго сталага аўтара Юр’я Станкевіча „Бесапатам“ (№6). Яе чытач трапляе ў апакаліпсічны свет, у якім пазнаецца сучасная Беларусь. Сярод іншых тэкстаў трэба адзначыць паэтычнае апавяданне Міколы Купрэева „Палеская элегія“ (№7—8). У №4—5 „Крыніца“ друкуе вершы Алеся Разанава, якія ён называе „Пункцірамі“, і перакладзеныя Лявонам Баршчэўскім „Пакуты маладога Вэртэра“ Гётэ. У гэтым жа нумары ў рубрыцы „Яно“, куды „крынічане“

змяшчаюць звычайна тое, што або не паддаецца літаратуразнаўчай класіфікацыі, або выходзіць за межы звыклай эстэтыкі — „жорсткія рамансы“ Віктара Шніпа з цыклу „Блатныя песні нашага двара“, тэксты, якія ацэньваюцца неадназначна, але безумоўна выклікаюць цікавасць. №9 знаёміць чытача з постаццю Алега Бембеля, паэта, музыкі, адраджэнца, які пасля бурна пражытай часткі жыцця пайшоў у Жыровіцкі манастыр паслушнікам і насуперак меркаванням скептыкаў не пакідае схімы ўжо каторы год. У іншых нумарах Вінцэсь Мудроў зноў выступіў у жанры беларускай антыўтопіі, а Міхась Баярын — алюзійнай паэзіі: ён дае рэцэпт, „як стварыць Гамера“. Міхась Баярын — амаль міфічная фігура ў найноўшай беларускай літаратуры: яго некаторыя лічаць геніем, але назвы твораў генія ніхто не ў стане нават узгадаць, не тое каб цытаваць.
Што пошукі новых форм у беларускай літаратуры далёка не скончаныя, сведчыць незвычайны твор двух аўтараў, Ірыны Шаўляковай і Віктара Праўдзіна, паралельны тэкст „Мудалогія на мяжы тысячагоддзя“. Нягледзячы на прыкладзеную да тэксту „Інструкцыю“ па ягоным вывучэнні, толькі падрыхтаваны чытач можа агарaць „фундаментальны раздзел ...гуманітарных ведаў, які даследуе прыроду, сацыяльныя функцыі, эвалюцыю аднаго з чалавечых тыпаў, а таксама вынікі гэтай эвалюцыі“ (так тлумачаць тэрмін „Мудалогія“ аўтары даследавання). Рэзанансу на „Мудалогію“ няма перш за ўсё таму, што ў айчыннай крытыкі проста адсутнічае адпаведны інструментар для аналізу тэкстаў падобнага кшталту. (Гэта тычыцца і тэкстаў вышэйзгаданага Міхася Баярына.)
Фармат „Крыніцы“ зменшыўся амаль удвая (пры захаванні шэра-чорна-белай вокладкі), што стала перашкаджаць звыклай вёрстцы рубрыкаў. Наклад пад канец году складаў 700 асобнікаў. Індывідуальная падпіска ўпала да 260.

**„Наша Ніва“**
„Крыніцу“ вінавацяць у элітарнасці, такія ж абвінавачванні гучаць і на адрас „Нашай Нівы“. Планка патрабаванняў тут застаецца высокай, а па-другое, гэта газета — не столькі літаратурнае, колькі публіцыстычнае выданне, і аўтараў мусіць яднаць не столькі адзінадумства, колькі светапоглядная

тоеснасць. І чытач у газеты адпаведны. Хаця ў „Нашай Ніве“ даецца слова ўсім на старонках часта аблітаратураных „Прыватных абвестак“, паэтычных „Варштатаў“ (а раней і ўвогуле анархічных „Грамафону“-графаману і празаічнага „Эпікону“-эпігону), і там вельмі па-беларуску друкуюцца асобы ад сівога франтавіка Пятра Прыходзькі да маладафронтаўца Аляксея Шыдлоўскага, але літаратурны твар газэты вызначаюць : Сяргей Дубавец, Уладзімер Арлоў, Андрэй Дынько, Марыя Роўда, Наталка Бабіна, Віктар Шніп, Валерка Булгакаў, Сяргей Харэўскі, Зміцер Бартосік, Анатоль Прасаловіч, Андрэй Скурко, Сяргей Балахонаў ды яшчэ пара чалавек. Зразумела, немагчыма ўявіць „Нашу Ніву“ без нататак Адама Глёбуса, эгацэнтрычных і віртуозных — ад абурэння і да захаплення, без Славаміра Адамовіча. У адрозненне ад халоднай адстароненасці Глёбуса, антыэстэтыка Славаміра Адамовіча гранічна эмацыйная, нават агрэсіўная і плоцкая. Але такія матэрыялы і робяць поспех выданню.
Знайшоўся чытач і на „Сабачыя гісторыі“ Віктара Шніпа. Сабака і Граждан, героі „Сабачых гісторый“, лёгка і ахвотна расцягваюцца на цытаты.
Арганічна ўключаюцца ў кантэкст газеты прыпавесці Васіля Быкава з алюзіяй на сучасныя падзеі. Пісьменнік, якога амаль аднагалосна прызнаюць літаратурным сімвалам Беларусі, які дасягнуў вяршыні ў ваеннай прозе, у асэнсаванні лёсу свайго пакалення, спрабуе перадумаць сённяшняе жыццё. Але Быкаў ужо перастаў быць чалавекам ваеннага пакалення, і маральныя законы, паводле якіх ён жыве цяпер, моцна адрозніваюцца ад тых, па якіх жылі дваццаць, пяцьдзесят гадоў таму. Не дзіўна, што сапраўднага абмеркавання гэтых твораў не адбылося — і не адбудзецца. Выказванне крытычных заўваг у адрас Быкава ўспрымаецца як кашчунства. Хоць, зрэшты, вось паслухаць беларускае радыё і тэлебачанне — дык у панядзелак перадавалі, што Быкаў зманіў, што ў яго ў кватэры холадна, пазванілі ў кватэру, а там 22 градусы цяпла.
Наклад „Нашай Нівы“ за год вырас з 2830 да 3760 асобнікаў, газета перайшла з штодвухтыднёвага на штотыднёвы выхад. Цана вагалася ў межах 8—10 цэнтаў за асобнік (12 старонак фармату А3).

**„Полымя“**

Часопіс „Полымя“ таксама друкаваў летась творы Васіля Быкава. У першым нумары — аповесць „Ваўчыная яма“, якая раней друкавалася па частках у „Нашай Ніве“. Чарнобыльская зона, яе насельнікі — бамжы, дэзерціры, наркаманы, крайняя дэградацыя чалавека, які шукае ратавання ў бездані атручанай прыроды... Гэтая аповесць выклікае асацыяцыі не з ваеннай прозай ці трылерам, а са старонкамі раманаў расійскіх пісьменнікаў Андрэя Платонава і Віктара Астаф’ева. Новыя апавяданні Быкава друкаваліся ў №5. У №2 Аляксей Дудараў надрукаваў драматычную паэму „Чорная панна Нясвіжу“. У свой час на старонках гэтага ж выдання пабачыла свет драматычная паэма Раісы Баравіковай, напісаная на тым жа гістарычным матэрыяле — „Барбара Радзівіл“, паводле якой пастаўлены спектакль на былой „Вольнай сцэне“ — у Беларускім тэатры-лабараторыі сучаснай драматургіі.

Цыкл вершаў Рыгора Барадуліна „Псальмы Давідавы“, навеяныя біблейскімі радкамі, друкуюцца ў двух нумарах — трэцім і адзінаццатым. У №6—7 — раман Вольгі Іпатавай „Залатая жрыца Ашвінаў“, чарговы ўдалы прыгодніцка-гістарычны раман на беларускую тэматыку. Падзеі з летапіснай Беларусі пераносяцца ў Візантыю, гістарычныя рэаліі ахутваюцца эзатэрыкай. Вольга Іпатава вымалёўвае ідэалізаваны тып гераіні, даўно выпрацаваны ў сусветнай прыгодніцкай літаратуры, але практычна новы для нашай. Старажытнай гісторыяй Беларусі натхніўся і Генрых Далідовіч, аўтар раману „Кліч роднага звону“ (№9—10), напісанага ў лепшых рэалістычных традыцыях.

За год „Полымя“ „згарэла“ на 60 старонак — з 288 да 224 малафарматных, зменшыўся і наклад: ад 4381 асобнікаў першага нумару да 3760 у дванаццатым. Выгляд часопіса застаецца ўжо шмат гадоў нязменны, як і эстэтычныя прынцыпы выдаўцоў, арыентаваныя на класіку беларускай літаратуры. Ілюстрацый фактычна няма.

**„Маладосць“**

Часопіс „Маладосць“ адрозніваецца ад часопіса „Полымя“ большай колькасцю аўтараў, сярод якіх сустракаюцца і маладыя. У №5—6 надрукавана аповесць Івана Шамякіна

„Слаўся, Марыя!“. Твор незвычайны — пісьменнік прысвяціў яго памяці жонкі, Марыі Філатаўны, якая нядаўна памёрла. Іван Шамякін расказвае пра свой боль і каханне, якое вытрывала выпрабаванне 58 гадамі сямейнага жыцця. Рыгор Барадулін друкуе „Шчымлівыя рамансы“ (№10), Вячаслаў Адамчык — фрагменты новай кніжкі „Чорны адбітак на белай сцяне“(№12), Уладзімер Дамашэвіч — аповесць „Лішняе дзіця, або Амплітуда жаданняў“. Для „цэласнасці палітры“ пералічым вершы Генадзя Бураўкіна, Васіля Зуёнка, Галіны Каржанеўскай, Максіма Лужаніна, Казіміра Камейшы, Валянціна Лукшы, Міколы Мятліцкага, меладраму Георгія Марчука, прозу Янкі Сіпакова. Тут жа друкуюцца і стаўпы Бум-Бам-Літу. У кантэксце часопіса „Маладосць“ заўважаеш, што вершы тых паэтаў, што дэкларуюць сябе авангардыстамі, у сутнасці сваёй традыцыйныя. Застаецца дадаць да карціны пару штрыхоў — містычную аповесць Анатоля Казлова „Дзеці ночы — служкі зла“(№3) і апавяданне Адама Глёбуса „Прымусь сябе жыць у Лагойску“ (№11).

Сярод літаратурных часопісаў „Маладосць“ вылучаецца наяўнасцю „мастацкай часткі“ — твораў беларускіх мастакоў традыцыйнага накірунку. Успрыняццю ілюстрацый перашкаджае кепская якасць паперы. Наклад №1 за 1999 год — 2545 асобнікаў, №12 —1865. Каштуе „Маладосць“, як і „Полымя“, і „Крыніца“ — у межах 15—20 цэнтаў за асобнік.

**Бібліятэчка часопіса „Маладосць“**

Не будзе поўным аповед пра часопіс „Маладосць“ без увагі да ягонай „Бібліятэчкі“, некалі запаветнай мары аматараў „абкніжыцца“ ды „ўсаюзіцца“. У прынцыпе, гэтую функцыю „Бібліятэчка“ выконвае і сёння, але дзікі рынак падсёк філантрапічныя памкненні яе заснавальнікаў. Выдацца без спонсараў магчыма, але цяжка. Летась у „Бібліятэчцы“ выйшлі кнігі паэзіі Анатоля Кудласевіча, Юрася Жалезкі, Андрэя Мазька, Івана Пракарыны, Сцяпана Сяргея і Ніны Чарнейкі, проза прадстаўлена гучнымі імёнамі Валянціны Куксы, Таісы Супрановіч, Георга Сысоя і Міхася Хамца. З усяго вышэйпералічанага я гартала толькі зборнік Кудласевіча, так што перапрашаю, шаноўны чытачу, што не магу распавесці пра змест і мастацкі ўзровень выдадзенага падрабязней. Ды ці патрэбна табе гэта? Дадам, што апошнім у спісе значыцца

зборнік пад інтрыгоўным падзагалоўкам „Зборнік інтэлектуальнай паэзіі“. Аўтары — Толь В. і Віталь Псеўданім.

**„Літаратура і мастацтва“**

І ў коле аўтараў „ЛіМу“ — Васіль Быкаў. Яго апавяданне „На панадворку“ пра беднага бяскрыўднага пенсіянера, якога загрыз сабака „новых беларусаў“, згодна з падзагалоўкам, мусіць асацыявацца з норавамі ў айчынным літаратарскім асяродку.

Іншыя жанры літаратуры прадстаўленыя на старонках газеты досыць багата — усемагчымымі нататкамі, разважаннямі, занатоўкамі, мастацкімі і не надта. Леанід Галубовіч друкаваў свае „Зацемкі“. Ён жа паспрабаваў пашырыць рамкі абранага жанру матэрыялам „У пошуках страчанага часу з Мантэнем“, дзе часткова пераказвае, часткова інтэрпрэтуе Мантэневы „Досведы“ (на што адзін са старэйшых пісьменнікаў з’едліва заўважыў, што лічыць за лепшае ўжываць Мантэня, не пераживанага Галубовічам). Друкаваліся апавяданні Галіны Багданавай, Раісы Баравіковай, Веры Лойкі і Марыі Вайцяшонак — добрая традыцыйная проза. Прэмію за 1999 год за творы празаічнага жанру „ЛіМ“ прысудзіў апавяданню Івана Пташнікава пад мілай сэрцу назвай „Пагоня“. Праўда, у апавяданні ваўкі даганяюць лася. Друкаваўся ў „ЛіМе“ Ўладзімер Арлоў (урывак з раману „Муж спадарыні Дамінікі“), Леанід Дранько-Майсюк працягваў асвойваць Еўропу. На гэты раз ён паэтычна асэнсаваў Ірландыю, у выніку чаго з’явілася аднайменная паэма. Зразумела, паэма перш за ўсё пра айчынныя рэаліі — аналогія паміж ірландскім і беларускім крытычным становішчам нацыянальнай мовы відавочная. Паэзія ў штотыднёвіку прадстаўлена была штотыднёва — і нават цэлы адмысловы нумар быў адведзены пад яе, які называўся „Дзень паэзіі“, у памяць бясследна зніклай кніжкі-гадавіка. Вядома, нумар складаўся з прыхаванай мэтай вызваліць ад гурбаў вершаў лімаўскія шуфляды. Узгадваюцца „Апокрыфы XX стагоддзя“ Галіны Булыкі, вершы Сяргея Верацілы, Міколы Купрэева, Алеся Чобата. Новыя творы Анатоля Сыса пакідаюць моцнае і дваістае ўражанне іскраў былога агню на тле попелу былых спадзеваў.

У „ЛіМе“ былі надрукаваны і два ўрыўкі з раманаў на адну

тэму — Слуцкага паўстання. Іх аўтары — слынны малады празаік Андрэй Федарэнка і Алесь Пашкевіч, да гэтага вядомы як паэт. Ёсць інтрыга — непрадугледжаная канкурэнцыя аўтараў, якіх ёсць магчымасць параўноўваць.
„ЛіМ“ выходзіў штотыднёва, хаця ў мэтах эканоміі сродкаў некалькі нумароў было прапушчана. Наклад выдання захоўваўся нязменны — каля 3300 паасобнікаў. Цана — 5—10 цэнтаў за нумар (16 старонак фармату А3).

**„Першацвет“**
Біяграфія часопіса творчай моладзі Беларусі хаця й нядоўгая, але бурлівая. Часопіс быў створаны Алесем Масарэнкам на базе літаб'яднання „Крыніца“ пры „Чырвонай змене“ пачатку 90-х гадоў. Але час ішоў, і ад часопіса запатрабавалі змяніць імідж і перадалі расійскамоўнай забаўляльнай газеце „Переходный возраст“, што пад эгідай Дзяржаўнага Камітэту па справах моладзі. Часопіс рэфармаваўся, утварылася новае кола аўтараў і чытачоў, але ягонае становішча па-ранейшаму няпэўнае. За год у ім былі змешчаны апавяданні Андрэя Федарэнкі, Галіны Багданавай, Альгерда Бахарэвіча, вершы Ўсевалада Гарачкі, Маргарыты Фабрыкант (якую называлі адкрыццём году), Віктара Слінко і іншых. Часопіс таксама знаёміў з сучаснымі менскімі контра- і субкультурнымі асяродкамі.
Да сярэдзіны году наклад часопісу, які набыў новы імідж, уздымаўся, індывідуальная падпіска дасягнула амаль 1500 асобнікаў. Але пад канец году кошт часопісу нечакана падняўся ад 12 цэнтаў за нумар да 25. У выніку на сёння „Першацвет“, хоць і захаваў наклад у 1500 асобнікаў, мае складанасці з падпіскай. Часопіс багата ілюстраваны.

**„ARCHE“**
Бедная інтэлігенцыя не заўжды наважваецца купляць часопіс па рыначнай цане, а па льготнай яго не прадаюць. А шкада: паслядоўнае развянчанне міфалагічнага статку святарных кароваў масавай свядомасці магло б выклікаць дзе-чыё і абурэнне. На сёння выйшлі нумары „Парнаграфія“, „Постмадэрнізм“, „Вялікая айчынная вайна“, „Кабеты“, „Паталогіі грамадзтва“ і „Панславізм: думка і злачынствы“.
За год часопіс надрукаваў адборныя пераклады (Інгеборг

Бахман у перакладзе Васіля Сёмухі, Жорж Батай у перакладзе Міколы Шакеля, Ірвін Уэлш у перакладзе Аляксея Знаткевіча, Кадарэ, Борхес, Букоўскі, Эка, Гандке, Кіш, Джонг, Сонтаг, Мілаш, Грабал), адкрыў шэраг новых беларускіх імёнаў у літаратуры — Еву Вежнавец, Анатоля Прасаловіча, Прафэсара Каркарана, Міхася Шупеньку, Богу. Часопіс можна папракнуць у эклектыцы, мешаніне літаратуры і нелітаратуры, арыгіналаў і перакладаў, імёнаў і псеўданімаў, у „ненароднасці“ (Анатоль Вярцінскі) і „разліку на сярэдні клас“ (Ігар Бабкоў). Але ў ARCHE ёсць і будзе свой чытач, і гэты чытач — не горшая частка нашага грамадства.
Дзякуючы мастацкаму рэдактару выдання Уладзімеру Адамчыку і фотаздымкам Алены Адамчык часопіс вылучаецца яркімі вокладкамі. Наклад — 800 асобнікаў. Цана — 0,8—1,1 даляра.

**„Калосьсе“**
Гартаючы гэты альманах, заснаваны Таварыствам Вольных Літаратараў, мімаволі канстатуеш, што хвароба сучаснай літаратурнай беларускай прасторы — раздрабненне пры агульнай беднасці. „Калосьсе“ пры сталічнай прапісцы мела б куды большы розгалас, якога і заслугоўвае. А так наклад абмяжоўваецца магічнай лічбай 299, якая, згодна з заканадаўствам нашай блаславёнай краіны, дазваляе выдаўцам не рэгістраваць свайго дзецішча ў адпаведных органах.
Дынаміка выхаду „Калосьсяў“ вылучаецца творчай непрадказальнасцю. У 1999 годзе выйшлі два нумары „Калосьсяў“, шосты і сёмы, прычым на шостым пазначаны 1998 год. Для экзотыкі можна дадаць, што, паводле выходных звестак, часопіс надрукаваны ў Сімферопалі.
У №6 друкуецца містычнае (з вычварэнствам) апавяданне Сержука Мінскевіча „Саламяная кветка“, нізкі вершаў Віктара Шніпа „Няпэўнае жыццё“, Анатоля Брусевіча — „За дзень да смерці“. Лаўрэн Юрага — адно з адкрыццяў літаратурнага году, піша ён у традыцыйным стылі — у апавяданні „Віленская карчма“ таксама звяртаецца да гатычнай фэнтэзі. Вінцэсь Мудроў прапануе чарговую антыўтопію „Іду на таран!“, у якой паветраны шарык карантышак з Кветкавага гораду зносіць на Беларусь, Ігар Сідарук — „абсурд“ пад назвай „Бабусечкі“.

„Сучасныя апавяданні“ Сяргея Астраўца прасякнутыя адраджэнскай настальгіяй. Асаблівы настрой часопісу надае тэма смерці. І не толькі ў творах. На старонках нумара прадстаўлены дзве постаці зусім маладых творцаў, якія нядаўна памёрлі — Алега Прусава і Андрэя Пяткевіча. Незвычайную вытанчанасць і трагізм надаюць нумару малюнкі Алега Прусава, таленавітага мастака, тут жа ўпершыню друкуюцца яго апавяданні, тэма якіх — смерць.
У №7 — вершы Ігара Сідарука „Канец эпохі“, фантасмагорыя Сяргея Кавалёва „Стомлены д’ябал“, „раманец“ Вітаўта Чаропкі „Поўны керкешоз“ поўны алюзіяў і чорнага гумару.
Часопіс прадаецца на прэзентацыях і ў незалежных кнігарнях за 0,5—0,8 даляра.

**„Nihil“**
Часопіс „Nihil“ — надзея „нефармальных літаратараў“. На чале ягонай рэдакцыі стаіць Міхась Баярын. Сімвалізуючы знаходжанне па той бок рэчаіснасці, імёны аўтараў напісаныя дагары нагамі. Падбор аўтараў традыцыйны — сусветна вядомыя імёны кшталту Віславы Шымборскай побач з тымі ж імёнамі беларускіх авангардыстаў, задзейнічаных і ў іншых аналагічных выданнях — Юрасём Барысевічам, Альгердам Бахарэвічам, Галляшом Сіном, а таксама Андрэем Хадановічам.

**Сякія-такія кніжныя навінкі**
**Міхась Скобла. „Дзярэчынскі дыярыуш“.** У кнізе — яркія эсэ пра роднае мястэчка аўтара, напісаныя з гумарам і лірызмам. Ну, а паколькі сродкі дазвалялі, аўтар дадаў да эсэ свае крытычныя артыкулы ды рэцэнзіі.
**Вячаслаў Адамчык. „Развітальная аповесць“.** У зборнік увайшлі аповесць, апавяданні, дзённікі. Добрая традыцыйная проза, а таксама варыянт айчыннай нон-фікшн.
**Вольга Паўлава. „Шклоўскія страсці“.** Выдадзеная ў Маскве, у выдавецтве „Паліном“ — відавочна таму, што айчынныя выдавецтвы не захацелі „звязвацца“ з тэкстам, які апавядае пра прыватнае жыццё першай асобы дзяржавы, хаця насамрэч гэта проста шчырая гісторыя жаночага захаплення і расчаравання, расказаная аўтаркай, зямлячкай і ўдзельніцай перадвыбарчай кампаніі Аляксандра Лукашэнкі.

**Андрэй Федарэнка. „Шчарбаты талер“.** Кніга ў займальнай форме апавядае школьнікам пра гісторыю Беларусі, нязмушана прышчапляючы адраджэнскія пагляды на мінулае і рэчаіснасць. Кніжка выйшла ў выдавецтве „Юнацтва“, у серыі „Школьная бібліятэка“. Як сцвярджае аўтар, некаторыя месцы кнігі, што тычыліся беларускай нацыянальнай сімволікі, былі выразаныя цэнзурай.

Выдадзены пераклад на беларускую мову **„Дзядоў“ Адама Міцкевіча**. Перакладчык — Серж Мінскевіч. Ягоны пераклад паэмы Міцкевіча на беларускую мову — першы. Праўда, твор выдадзены ў Польшчы і беларускаму пакупніку, а таксама крытыку недаступны, таму абмяжуюся канстатацыяй сапраўды прыемнага для беларускай культуры факту.

**Максім Лужанін. „Наўздагон за падвойнікам“.** Аповесць патрыярха беларускай літаратуры, чыё дзевяностагоддзе мы не так даўно святкавалі. Займальна-псіхалагічна-гістарычны сюжэт з алюзіямі на рэальныя падзеі.

**Славамір Адамовіч. „Плавільшчыкі расы“.** Зборнік паэзіі, горача вітаны незалежнай прэсай і замоўчваны афіцыйнай крытыкай. Чытачы мімаволі шукаюць у вершах Славаміра прамых згадак пра рэальныя гучныя падзеі, а там — паэзія. Адной з актуальных тэм леташніх дыскусій было месца націску ў слове „раса“ з назову зборніка.

**Адам Глёбус. „Postscriptum. Кантамінацыі“.** Як значыцца ў анатацыі, „у сваёй адзінаццатай кнізе аўтар сабраў афарызмы, цытаты з камэнтарам, грэгерыі і максымы. Зборнік кантамінацыяў — плён дзесяцігадовай працы.“ Чытачу многае са зборніка вядомае па публікацыях у „Нашай Ніве“.

**Аляксандр Лукашук. „У фіялетавай ночы вугал крыла. Дакумэнтальная проза“.** Калаж з цытатаў звычайных беларускіх газетаў савецкага перыяду стварае застрашліва-фатальны фон для апавядання „пра фізіялёгію і норавы савецкай сыстэмы“. Досвед будзе надзвычай актуальны для нашай прышласці.

Кніжкі Адамовіча, Адама Глёбуса і Лукашука выйшлі ў Вільні, у серыі **„Вострая Брама“**, заснаванай газетай „Наша Ніва“. Кішэнны фармат, прывабныя вокладкі.

**Пятро Васючэнка, Антоні Вырвіч. „Прыгоды аднаго губашлёпа. Аповеды пра Валентага“.** Аўтары распавядаюць пра прыгоды студэнта Валентыя Круткоўскага, родам з

Заходняй Беларусі. Сумны гумар савецкай рэчаіснасці. Брашура выйшла з дапамогай газеты „Частный детектив“ накладам 1000 асобнікаў.

**Леанід Маракоў**
З’яваю 1999 году можна назваць публікацыі па гісторыі беларускай літаратуры 20—30-х гадоў Леаніда Маракова, пляменніка рэпрэсаванага ў тыя гады паэта Валер’я Маракова. Аўтар уварваўся ў айчынны літаратурны працэс з практычным імпэтам праўдзівага бізнесоўца, якім насамрэч і з’яўляўся да нядаўняга часу. Пакуль не аддаў беларускай літаратуры ўвесь свой энтузіязм. Вартая асобнага аповеду ў іншым жанры гісторыя таго, як гэтае ўвасабленне „новага беларуса“ з тэхнічнай адукацыяй і залатым ланцугом на шыі прыжывалася ў рафінаваным коле гуманітараў. Якімі толькі эпітэтамі не ўзнагароджвала яго бедная, але гордая літаратарска-навуковая эліта! Маракоў даказаў, што можна зрабіць у літаратуры многа, не будучы прафесіяналам, але маючы настойлівасць і грошы. Стосы рэдкіх дакументаў, мноства раней невядомых фактаў, дзесяткі публікацый за пару гадоў. У выдавецтве „Беларускі кнігазбор“ надрукаваная кніжка **Леаніда Маракова „Валерый Маракоў. Лёс. Хроніка. Кантэкст“**, у „ЛіМе“ — спісы загубленых беларускіх пісьменнікаў. Тамсама — першыя апавяданні самога Леаніда Маракова, сюжэты для якіх узятыя з тых жа дакументаў 20—30-х гадоў, у якіх аўтар адчувае сябе, відаць, не менш вольна, чым у сённяшніх рэаліях. Мастацкія крытэрыі, стылістыка і прыёмы запазычаныя аўтарам усё з тых жа дваццатых, што выклікае замілаванне гэткім рэанімаваным рэтра. Апошнім часам Леанід Маракоў спрабуе яшчэ і рыфмаваць на манер селькораў 20-х, бо шчыра лічыць „простую і ясную“ паэзію тае пары вяршыняй паэзіі ўвогуле, а няхітрыя дзядзькавы метафары — невымернымі азарэннямі.

**Эсэістыка**
Сярод эсэістыкі, прысвечанай гісторыі Беларусі — „Конец Горлага“ Рыгора Клімовіча, былога вязня савецкіх канцлагераў, пра паўстанне вязняў у Гарлагу. „Жыцьцё пад агнём“ Лявона Юрэвіча малюе партрэт беларускага ваеначальніка і палітычнага дзеяча Барыса Рагулі. Унікальны гістарычны

часопісны праект 90-х, ажыццёўлены Генадзем Сагановічам, „Беларускі гістарычны агляд“, выдаў, апроч сваіх чарговых нумароў, успаміны Францішка Кушаля „Спробы стварэньня беларускага войска“. „Бывай, Яршоўка“ Платона Крэня ўводзіць у пантэон беларускіх рэпрэсаваных пісьменнікаў новую асобу. Адбылося гэта дзякуючы ягонай дачцэ, журналістцы Ірыне Крэнь. Платон Крэнь прайшоў праз грамадзянскую вайну, ваенны лагер на Галіпалійскім паўвостраве і ГУЛАГ. Жыццёваму шляху і прысвечаныя ягоныя ўспаміны. Друкуюцца тут таксама вершы Платона Крэня, тое, што захавалася ад творчай спадчыны паэта, якога пры жыцці ні ў свеце, ні ў сям’і як паэта не трактавалі. Прадмову да кнігі, што цікава, напісаў Васіль Быкаў.

**Полацкае ляда**
Выдавецкая суполка „Полацкае ляда“ выпусціла зборнік аповедаў Вінцэся Мудрова „Зімовыя сны“, зборнікі вершаў Алеся Аркуша „Выбранае“ і Юр’я Гуменюка „Рытуал“. Як сцвярджае Алесь Аркуш, Юры Гумянюк „стаў заснавальнікам мастацкай плыні беларускага анархізму“, маючы на ўвазе пэўную непрадказальнасць ягонай паэзіі.

**Беласточчына**
На Беласточчыне выйшаў другі нумар часопіса „Тэрмапілы“, выданне, якое ўзначальвае паэт і навуковец Ян Чыквін. Сярод мастацкіх твораў, змешчаных у часопісе — апавяданне Анатоля Кудраўца „Бацька“, замалёўкі-ўспаміны са ссыльнага жыцця Масея Сяднёва, вершы Васіля Зуёнка, п’еса Сакрата Яновіча „Арышт“, галоўны герой якой — Браніслаў Тарашкевіч (п’еса пазбаўленая жалобнасці і песімізму, наадварот, іскрыцца гумарам), вершы Леаніда Дранька-Майсюка, эсэ Альбіны Сямёнавай. Як і ўсе беларускія выданні, што выдаюцца на Беласточчыне, часопіс дыхтоўны, прыгожы, на добрай паперы. Выйшаў на Беласточчыне і зборнік „Вяртанне да сваіх“, у якім сабраны творы Станіслава Грынкевіча, Франука Грышкевіча ды Уладыслава Казлоўшчыка — трох паэтаў родам з Беласточчыны, якія трапілі пад колы савецкай рэпрэсіўнай машыны. З’явіўся і новы зборнік паэзіі Надзеі Артымовіч „Адплывае спакойнае неба“ з прадмовамі Яўгена Мірановіча і Алеся Разанава. Кнігі, выдаваныя беларусамі Польшчы,

вылучаюцца густоўным афармленнем і якасным друкам. Гэта ж можна сказаць пра пераклады Яна Чыквіна з польскай лірыкі XX ст. „Лісце срэбнай таполі“. Лісцікі з тае таполі сашчыкваліся хаатычна, але вянок стагоддзя атрымаўся класічны: Баляслаў Лесьмян, Леапольд Стаф, Юльян Тувім, Чэслаў Мілаш, Віслава Шымборска і многія імёны, беларускаму чытачу незнаёмыя. У серыі бібліятэкі Беларускага літаратурнага выдання „Белавежа“ выйшла дваццаць шостая кніга — „Запісы веку“ Сакрата Яновіча з пасляслоўем менскае літаратуразнаўцы Галіны Тычкі.

**Піншчына літаратурная**

З рэгіянальных зборнікаў тыпу „тут усе, хто тут пісаў і піша“, да Менску дайшла „Піншчына літаратурная“. На прыкладзе гэтага выдання можна схарактарызаваць і іншыя, якія, вядома ж, выходзяць амаль у кожным рэгіёне. Напачатку стаіць традыцыйны краязнаўчы артыкул, пасля ўперамежку — вершы і проза праўдзівых класікаў і відавочных дылетантаў, маладых і старых, на расійскай і беларускай мовах. Тэксты падабраныя таксама па краязнаўчай тэматыцы. Падобныя зборнікі заўсёды знаходзяць свайго чытача — сярод знаёмых і ў сваім рэгіёне — і ўяўляюць вялікую цікавасць (для іх жа).

**На свабодзе**

Напачатку 1999-га ў „ЛіМе“ быў змешчаны „навагодні прагноз“ магілёўскага аўтара Васіля Аўраменкі на год, які пачаўся. Аўтар прадказаў наступнае: „Большасць чытачоў „Навінаў“ застанецца на „Свабодзе“, і амаль усе чытачы „Народнай волі“ — таксама“. Што ж, прагноз спраўдзіўся. Пажадаем сабе таго самага й на наступны год.

У цэлым жа можна сказаць, што дзяржаўныя беларускамоўныя выданні перажываюць перыяд стагнацыі. Прыкра не тое, што падае наклад, а што змяншаецца колькасць індывідуальных падпісчыкаў. Значыць, тыя, хто раней выпісваў беларускія выданні, сёння або расчараваўся ў іх, або не мае магчымасці падпісацца. У сённяшняй сітуацыі бессэнсоўна заклікаць пісьменнікаў „пісаць лепш“ ці спадзявацца, што камусьці з авангардыстаў удасца так эпатаваць публіку, што адродзіцца мода на літаратуру. Літаратура так цесна звязаная з нацыянальным пытаннем, што пры ўсёй бравадзе асобных літаратараў нявырашанасць апошняга не можа не ўплываць на

пісьменства.

*ІІ зьезд ТБМ. Фота з архіву газэты „Наша слова“.*
*Уладзімір Някляеў на сьвяце паэзіі ў Жупранах.*
*Фота Віктара Жыліна з архіву газэты „Наша слова“.*

---



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 12-04-2000**

да Зьместу 2(7)-2000 **Кшыштаф Чыжэўскі**

# Босьнія становіцца нашаю, пакуль ёй баліць

*Roger Cohen. Hearts Grown Brutal: Sagas of Sarajevo. — New York. 1995.*

**КШЫШТАФ ЧЫЖЭЎСКІ**
польскі культурны дзеяч, падарожнік па Сярэдняй Эўропе. Галоўны рэдактар часопіса *Krasnogruda*, што выдаецца ў Сэйнах і, паводле апошняй інфармацыі, увайшоў у пачэсны сьпіс 40 найважнейшых польскіх культурніцкіх часопісаў, якім гарантаваная сталая падтрымка Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы. Вялікі сябар Беларусі. Апошняя ягоная публікацыя на беларускай мове — „Косаўскія варыяцыі“ (ARCHE—Панславізм). Эсэ „Босьнія становіцца нашай...“ перададзенае ў рэдакцыю аўтарам.

> Аб’ектыўнасьць у Босьніі ня
> можа быць нэўтральнасьцю,
> і галава — у Босьніі — нічога ня
> значыць бяз сэрца.
> *Роджэр Коэн*

**1.**

**Я** чытаю кнігу Роджэра Коэна „Жорсткасьць, што ўзрасла ў сэрцах: сагі Сараева“ ў аўстрыйскім Грацы, у старой вежы з гадзіньнікам: краявід зь яе працягнуўся далёка, аж да мяжы з Вугоршчынай ды Славеніяй. Ніжэй, на Закштрасэ 18,

знаходзіцца будынак, які называлі раней домам Конрада ды ў якім 13 сакавіка 1863 году зьявіўся на сьвет Франц-Фэрдынанд, нашчадак трону Габсбургаў. Тут зараз музэй, у якім выстаўленыя фотакарткі з эрцгерцагавага жыцьця. 28 чэрвеня 1914 году — забойства ў Сараеве. У натоўпе хапаюць сэрба Гаўрылу Прынцыпа. На наступны дзень целы Франца-Фэрдынанда і ягонае жонкі былі пакладзеныя для разьвітаньня ў адкрытыя труны ў пахавальнай капліцы Сараева. Затым пачалося іх падарожжа празь Сяроднюю Эўропу. Яны спускаюцца па рацэ Нэрэтве праз Мостар да Адрыятыкі, плывуць морам да Трыесту, затым кіруюць уздоўж Дунаю, да замку ў Артштэтэне, да Вены. Паўсюль натоўпы заплаканых людзей, а вось стары, зьнямоглы імпэратар Франц-Ёзаф у брычцы. Тымчасам — хваляваньні ў Сараеве. На антысэрбскай дэманстрацыі — найбольш мусульманаў. Фотаздымкі з працэсу над „Маладою Босьніяй“, арганізацыяй, да якой належалі Прынцып ды Нэдэлька Чабранавіч, хлапец, што кінуў бомбу: у іхных вачох — змоўніцтва, наканаваньне, упартасьць, выразная гатовасьць змагацца да сьмерці. Надпіс, высечаны на Косавым полі, чытаецца і на тварах гэтых хлапцоў: „Хай ніколі ня будзе дзяцей — ані сына, ані дачкі — у таго, хто сэрб альбо мае сэрбскія карані, ды не прыйшоў змагацца ў Косава. І няхай усё, што гадуе ён, не дае плоду. Хай ня будзе ён мець ані віна, ані пшаніцы. І няхай усё перавернецца ў пыл яшчэ да таго, як ён памрэ“.

Калі існавала Югаславія, мэмарыяльная дошка на мосьце Гаўрылы Прынцыпа, якую павесілі як напамін аб той падзеі, лічылася ўшанаваньнем гераізму. Сёньня малады сэрбскі нацыяналіст не зьяўляецца больш героем Сараева, і месца, на якім вісела тая дошка, шчэрыцца пустэчай. „Гісторыю тут ніколі не пакінуць у спакоі“, — піша Коэн. Дзень, калі забілі эрцгерцага, калі было разьдзьмутае вугольле першай сусьветнай вайны, — гэта дзень сьвяткаваньня ўгодкаў вялікае бітвы на Косавым полі.

28 чэрвеня 1989 году, стоячы перад мільённым натоўпам, які сабраўся ў месцы паразы, што сталася месцам славы, лідэр нацыі Мілошавіч казаў аб нацыі, „адной з тых нешматлікіх, што і ў паразе заставаліся непераможаныя“. Ужо тады было відавочна, што людзі, якія, паводле вызначэньня Коэна, „у самагубстве знайшлі вызваленьне“, былі гатовыя „пахаваць

сябе пад абломкамі Югаславіі, каб толькі скінуць зь сябе нейкае ярмо, сапраўднае або ўяўнае — цяжка зразумець“.

Сярод лістоў і камэнтароў, напісаных у сувязі з забойствам у Сараеве, маю ўвагу прыцягнуў яшчэ адзін водгук, падпісаны адным маладым нацыяналістам — Мусаліні, і апублікаваны ў *Popolo d’Italia* 10 ліпеня 1915 году: *Heil dem Revolver des Princip und der Bombe des Cabranovic!*
Гісторыя паскорылася. З вышыні маёй вежы ў Грацы можна было стацца сьведкам некалькіх надзвычайных падзеяў. Я знайшоў старую паштоўку з выявай палёту „Цэпэліна“ ў нябёснай вышыні 1931 году. Гэта выглядае зусім нерэальным і нагадвае вобраз НЛА, якім яго ўяўляюць дзеці. Аднак зусім скора споўненыя жахам вочы зьвярнуліся да бясспрэчна рэальнае постаці. Захаваліся дакумэнтальныя стужкі, на якіх зьняты трыюмфальны марш Гітлера па Грацы пад авацыю жыхароў места. На паштоўцы з 1938 году — сьцягі са свастыкай, што зьвісаюць з маёй вежы, ды людзі, што бягуць усьлед за фюрэрам. Хто жыў у гэтай вежы да мяне? Надыходзіць час абедаць. Пах, што так добра мне знаёмы з Босьніі, пах смажаніны з гароднінай. Гэта, відаць, мая суседка, спадарыня Сарыч, гатуе басьняцкую дагару. Ёй ды ейнаму мужу ўжо няма куды вяртацца. Грац стаўся іхным часовым прытулкам. Мой сябра з Сараева Джэвад Карагаджан таксама жыве тут са сваёй жонкай. Ён зьбіраецца назад. Я запытаўся, ці можна мне паехаць разам зь ім. „Ты ведаеш, — адказаў ён, — калісьці, пад час вайны, мне хацелася ўзяць туды розных людзей: штосьці сапраўднае адбывалася там, там яны былі патрэбныя, там было жыцьцё й барацьба. Сёньня я нікога не хачу браць з сабой у Сараева. Сёньня там горш, чым было ў вайну“. Я падумаў пра сынагогу, якую дашчэнту спалілі ў Крыштальную ноч. Хутка яна ўжо будзе адбудаваная зноў: нават у мірным Грацы тое, што ў сьляпой нянавісьці аддалі на зьнішчэньне, мусіць чакаць больш за шэсьцьдзесят год, каб зноў вярнуцца да жыцьця. Вечарэе. Праз вакно я назіраю за спадаром Сарычам, які выбраўся на шпацыр. Аб чым думае гэты заўжды ціхі басьніец, былы вязень канцлягеру? Люты 1999 году. Я бяруся чытаць „Жорсткасьць, што ўзрасла ў сэрцах“.

**2.**

Ці мае сэнс вяртацца ў Босьнію праз колькі год пасьля падпісаньня ў сьнежні 1995-га Дэйтанскай мірнай дамовы? Пасьля ўсяго, што мы бачылі на тэлеэкранах і чыталі ў газэтах — ці можна сказаць пра Босьнію штось новае? Мы адклалі яе ў шуфляду, „закрылі пытаньне“, хопіць. Жыцьцё ідзе далей, зьявіліся іншыя праблемы, больш надзённыя. Чаму Роджэр Коэн вяртаецца да Босьніі? Кніга таўстая. Яна нібы кажа: „Давайце распавядзем гісторыю яшчэ раз, ад пачатку“. Храналягічны адлік у прадмове пачынаецца ад 395 году — ад падзелу Рымскае Імпэрыі, калі па рацэ Дрыне пралегла мяжа паміж Усходам ды Захадам. Фактаў ды датаў становіцца значна болей пачынаючы з 1918 г.: утварэньне Каралеўства Сэрбаў, Харватаў і Славенцаў, якое ў 1929 годзе ператвараецца ў Югаславію. Тут, на думку Коэна, і хаваюцца карані драмы, тут, а не ў адвечных крывавых канфліктах, як даводзілі некаторыя заходнія палітыкі, прыкладам, амэрыканскі дзяржсакратар Уорэн Крыстафэр. Ён заяўляў у 1993 годзе: „Нянавісьць паміж усімі трыма групамі — басьнякамі, сэрбамі і харватамі — амаль не паддаецца ўяўленьню. Яна жахлівая, яе гісторыя вымяраецца стагодзьдзямі. Гэта сапраўдная праблема, што йдзе з самага пекла“. Не. Праблема існуе ў самой Югаславіі, у яе сямідзесяцітрохгадовай выкрыўленай гісторыі, што ад пачатку выклікала нацыянальную і рэлігійную варажнечу, праявы якое душыліся ўладаю, ці то каралеўска-дыктатарскаю, ці то камуністычнаю.

Такім чынам, „расказваць гісторыю ад пачатку“ паводле Коэна значыць расказваць яе з таго моманту, калі ўпершыню паўстала Югаславія. З таго моманту, як у 1991 годзе шуганула полымя вайны ў Харватыі, а пасьля ў Босьніі ў 1992 годзе, у храналёгіі пачынаецца нагрувашчваньне датаў. Ці ня кожны месяц вылучаны асобна. Мы мусім шчэ раз прайсьціся па ўсіх стадыях тых войнаў, яшчэ раз прыгадаць назовы тых мясьцінаў, на якія хацелася б хутчэй забыцца: Ясэнавац, Омарска, Срэбрэніцэ... Другая назва кнігі — „Сагі Сараева“ — сталася сымбалічнаю ад таго часу, як падзеі пачалі разгортвацца і ў Бялградзе, Косаве, Тузьле, Біхачы, Кніне, Загрэбе...

Ва ўсялякім разе, Коэн не зьбіраецца вяртаць нас у Босьнію часоў вайны дзеля таго, каб мы шчэ раз перажылі гісторыю.

Гэтая кніга павяртае нас тварам да Босьніі сёньняшняе. Рана яшчэ не загаілася. Ня толькі таму, што ў Дэйтане не знайшлі канчатковага вырашэньня басьнійскае праблемы. Гэта была ня толькі вайна. У ейным люстэрку, як прыклад для заходняга сьвету, бачны адбітак сапраўднага стану рэчаў пры канцы XX стагодзьдзя. „Я хацеў сягнуць далей за самую вайну, — піша Коэн у сваёй прадмове, — бо адчуваў, што гэты дагэтуль трываючы басьнійскі боль не ў пралітай крыві, а недзе глыбей. Тыя твары, што працягвалі ўспыхваць у памяці, зьбітыя ды невідушчыя твары, былі адной суцэльнай ранай, якая сягала нібы ў нетры нашага стагодзьдзя“.
Коэн павяртае нас тварам да сёньняшняе Босьніі, не дае нам уцячы ад яе, нягледзячы на ўсе нашы спробы. Пасьля прачытаньня гэтае кнігі Босьнія ізноў становіцца нашаю — пакуль ёй баліць.

**3.**

Да вайны з Сараева да мора было зусім блізка, руку выцягнуць — тры гадзіны на машыне. Пад час вайны мора значна аддалілася. Падарваныя масты, аб’езды, што залежалі ад палажэньня лініі фронту, КПП.
Па дарогах езьдзіць вельмі цяжка. Некаторыя едуць на трактарах абрабляць зямлю, іншыя — у бронеаўтамабілях, несучы мір у месца, дзе яго не было ўжо ж надта доўгі час, за імі — трэція, што вядуць гандаль запасамі зброі ды амуніцыі. Грузавікі з гуманітарнай дапамогай, аўтобусы з зацемненым шклом, што вязуць чарговую групу замежных удзельнікаў перамоўнага працэсу, „Мэрсэдэс“ мясцовага мафіёзі і „хуткія дапамогі“ Чырвонага Крыжа... Тут вы сустрэнеце людзей, якія жывуць выключна з натуральнага абмену; нехта шукае сваю сям’ю, іншыя шукаюць новае жытло; тыя, што жывуць з вайны, і тыя, што празь яе паміраюць; нішчымныя, скалечаныя, параненыя, і палітычныя турысты з камэрамі; тыя, хто выстаўляе на паказ сваю нацыянальнасьць, і тыя, хто хацеў бы на яе забыцца. Вы прамінаеце руіны мусульманскіх, каталіцкіх і праваслаўных сьвятыняў, дашчэнту спаленыя будынкі, разьбітыя вокны, бальконы, на якіх ляжаць дровы на зіму, нацыянальныя сьцягі: басьнійскія, харвацкія й сэрбскія (вы

ніколі ня ўбачыце, каб два розныя сьцягі луналі над адным і тым домам). І магілы, магілы паўсюль, сьвежыя, асьляпляльна белыя. Нейкая атупелая цішыня пануе па-над пылам й шумам, яна цісьне на цябе і рэжа вочы пустэчаю.

Басьняцка-харвацкі памежны пункт у Мэркавіцы, і раптам, літаральна ў пары соцень мэтраў далей — іншы сьвет: бесклапотная фэерыя сьвятла ў Спліце, порце на Адрыятыцы; вада, за якую там, за мяжой, ты можаш налажыць галавою, тут б'е з фантанаў. І спакойнае гарманічнае харасто Дыяклетыянавага палацу, абмыванага марскімі хвалямі, які бы абмінуў бег стагодзьдзяў; пары закаханых, пары паўсюль; крамы з файнымі таварамі і бестурботнасьць на тварах. Кожны, хто прабыў колькі часу тады, у вайну, у Босьніі, а пасьля рушыў у Спліт, ня можа забыцца на тое сутыкненьне пекла і раю, цяжару й лёгкасьці, поцемкаў ды сьвятла, складанасьці й відавочнае простасьці, спакусы сьмерцю й спакусы жыцьцём. А пасьля ўсяго — пачуцьцёвае ўражаньне, што застаецца з табою да скону: ты адчуваеш пах свабоды. Так, свабода мае свой пах, свабода — гэта мора, па якім тужыць кожны ў Сараеве, Тузьле, Баня-Луцы, Мостары.

Крыху пасьля зьяўляецца адчуваньне, якое пасьпяхова мкнецца выціснуць папярэдняе, — адчуваньне таго, што ты ня можаш доўгі час бавіцца сярод гэтых уцехаў жыцьця, калі радасьць твая спалучаецца з пачуцьцём шызафрэнічнага, дзіўнага непакою. Дык што ж ёсьць рэальным? З кожнай прамінулаю хвіляю Босьнія, у якую мы былі акунуліся з галавою, пачынае аддаляцца ад нас, губляцца ў ірэальнасьці... Ці сапраўды адбылося ўсё тое, што адбылося? Усёабдымная, амаль фізычная прага дазволіць сабе спакусіцца прынадамі іншага сьвету, нават ня пахам, а ўсяго толькі простым выкладаньнем падзеяў у мас-мэдыях, лепшымі ўмовамі жыцьця, згодай у грамадзтве ды іншымі „аб'ектыўнымі рэаліямі". Што можа збавіць нас ад гэнай спакусы і вярнуць да таго, што цёмнае, цяжкае і балючае?

У гэты момант ты зноў можаш убачыць твары людзей, зь якімі давялося сутыкнуцца ў Босьніі, і сэрцу твайму стане скрушна ад усьведамленьня таго, як самотна сябе пачуваюць тыя, хто застаўся там, ззаду. Няма нікога, хто б засьведчыў іхную праўду, іхную трагедыю, іхны нявыказаны жаль. Быўшы сярод іх, часам ты адчуваў, што больш за ўсё іх хвалюе не галаднеча,

заняпад альбо жорсткасьць у абыходжаньні, а суцэльны недахоп разуменьня з боку іншых. Як можна замірыцца з думкай, што гэтая складаная, шматгалосая драма магла прывесьці да міжпляменнае бойні? Кінуць тых людзей альбо разам зь імі змагацца за справядлівасьць? І тут гаворка ідзе не аб справядлівасьці для аднаго з бакоў канфлікту, дзеля аднае дзяржавы, да чаго заклікаў адзін з аўстрыйскіх пісьменьнікаў, а аб справядлівасьці дзеля народу былое Югаславіі, усіх яе насельнікаў.

**4.**

„Маё стаўленьне да вайны сфармавалася пад уплывам сям'і". Родтэр Коэн напісаў сагу аб югаслаўскіх сем'ях, нягоды і пакуты якіх найглыбей выяўляюць драму вайны, бо Югаславія не была толькі штучным утварэньнем, спраектаваным у калідорах улады. Супольнасьць людзей розных нацыянальнасьцяў насамрэч існавала ў жыцьці, культуры, мове і, самае галоўнае, у сем'ях, дзе ніхто не зважаў на нацыянальную адрознасьць. „Няма ніводнага харвата, які мог бы сказаць, што ён чысты харват, ні сэрба, які скажа, што ён чысты сэрб, няма такіх і сярод мусульманаў... Мы ўсе перамяшаліся", — кажа Война Адамавіч, чый муж — славенец, дзед быў сэрбам, а бабуля — аўстрыячкаю. Гэта і было асновай трывалага пераканаьня ў тым, што да кровапраліцьця ня дойдзе. Аблога або напад на любы горад у Босьніі прывялі б да забойства „сваіх людзей". І вось — гарады былі абложаныя, зброя пачала страляць, і „свае людзі" пачалі гінуць ад рук сваіх жа. Тэорыя Радавана Караджыча аб тым, што сэрбы ня могуць жыць разам з харватамі і мусульманамі гэтак жа, як вада ня можа зьмяшацца з алеем, аказалася мацнейшаю за жыцьцё. Сусьветная супольнасьць прыняла гэтую лёгкую для разуменьня лёгіку басьнійскіх сэрбаў і паспрыяла правядзеньню дакладных памежных ліній у скрываўленых ды падзеленых на часткі гарадах і сем'ях. Што было намалявана на мапах, пачало ўрывацца ў жыцьцё, пакуль, як кажа Война, „урэшце межы не былі праведзеныя ў людзкіх галовах". Мусульманскае кіраўніцтва ў Сараеве распачало кампанію супроць зьмяшаных шлюбаў, павесіўшы на іх таўро „збольшага

нетрывалых шлюбаў“. Вайна ў Босьніі сталася „вайною асабістых здрадаў“, як назваў яе Коэн у адной з частак сваёй кнігі.
Сямейныя гісторыі, з такім літаратурным майстэрствам апісаныя ў „Жорсткасьці, што ўзрасла ў сэрцах“, сталіся мэтафараю шырэйшай зьявы, чым проста гісторыя нечага лёсу. Гісторыя пошукаў Сэадам Мэхмэдавічам свайго бацькі, якія дапамаглі яму вывучыць абставіны ўтварэньня югаслаўскае дзяржавы ды трагічных падзеяў другое сусьветнае вайны, — гэтае падарожжа сына да свайго ўласнага бацькі сымбалізуе прагу павяртаньня сваёй ідэнтычнасьці, прагу здабыцьця сталага даху ў тым сьвеце, сутнасьць якога — выкарчоўваньне. Яскравым прыкладам эўрапейскае маралі зьяўляецца прысутнасьць у Босьніі міжнародных сілаў, якія і вызначылі, паводле Коэна, лёс Бішэры Закавіч, чыя мусульманска-сэрбская сям’я жыве ў Сараеве ды Бялградзе. Пасьля таго, як яна згубіла сына, што змагаўся ў басьнійскім войску, Бішэра вырашыла выбірацца з абложанага Сараева. Улетку 1993 году заставаўся адзіны шлях для выхаду — празь незаняты сэрбамі аэрапорт. Пяцідзесяцісямігадовая жанчына выбралася на ўцёкі ўночы, разам зь сябрам ейнага сына, які згадзіўся дапамагчы ёй. Затым, калі з таго боку аэрапорту, што быў пад кантролем войскаў ААН, моцнае сьвятло пражэктараў высьвеціла дзьве постаці ўцекачоў, з боку, кантраляванага войскамі Караджыча, пачалося вельмі трапнае страляньне. Усё адпавядала вызначаным правілам: салдаты ААН, згодна з сваім „нэўтральным“ статусам, выконвалі рытуальны абавязак, тады як любое іншае дзеяньне — як тлумачыла ім кіраўніцтва — магло быць патрактаванае як парушэньне прынцыпу неўмяшальніцтва, як зрыў пагадненьня з Караджычам; сэрбскія салдаты, са свайго боку, выконвалі свой сьвяты абавязак абароны роднага краю, які пакутаваў ад праяваў ісламскага фундамэнталізму. „Калі Бішэра Закавіч павалілася, стаўшы гэткім чынам ці то ахвяраю, ці то аб’ектам гуманітарнае дапамогі, ААН прыйшла ёй на паратунак“. Пад’ехаў бронегрузавік і адвёз яе ў шпіталь. На наступны дзень ейны муж Асім ужо ня змог яе там адшукаць. „Запакаваную ў плястыкавы мех, яе даставілі ў морг без адзежы, безь пярсьцёнкаў і іншых каштоўнасьцяў, і нічога з гэтага ўжо не вярнулася. На мяху было напісана адно слова: НЕВЯДОМАЯ“.

Роджэр Коэн разглядае крывавую драму, што разыгралася ў самым сэрцы Эўропы, праз прызму асобы, асобнае сям'і. Гэта, аднак, ня значыць, што кніга гэная ёсьць прыватнай сямейнай сагай з апісаньнем чыіхсьці дробных драмаў, якія падаюцца мізэрнымі на невыразна акрэсьленым тле гісторыі. Коэн ня хоча цалкам аддаляць нас ад сьвету палітыкі, бо йнакш сьвет станецца ў нашых вачох незразумелым, бясколерным, ледзь не бесчалавечным. Усё наадварот: ён выкрывае гэты сьвет, каб выявіць агульны мэханізм югаслаўскае трагедыі. Прэзыдэнты заходніх дзяржаваў, лідэры сусьветных арганізацыяў, вайсковыя кіраўнікі, пасярэднікі, палітыкі, верхаводы супрацьлеглых бакоў — гэта ўсё жывыя *dramatis personae* кнігі. Коэн, углядаючыся ў твары шматлікіх ахвяраў, імкнецца да бязьлітаснай праўды і не зважае на так званыя „аб'ектыўныя рэаліі". Як кажуць басьнійцы: „Дрво нэ растэ с нэба". Кожнае рашэньне альбо нерашучасьць, што спрычыніліся да лёсу людзей, названыя ў гэтай кнізе, кожная падзея знаходзіць свой выток. Колькі ж тут здрады, баязьлівасьці, крывадушнасьці, хцівасьці... Босьнія адкрывае нам вочы на тое, чым ёсьць сёньня Амэрыка з Эўропаю. Зусім не няўхільны лёс, не непадуладная людзям злая сіла вінная ў тым, што адбылося. Коэн паказвае, як шмат магло б зьмяніцца толькі дзякуючы сьмеласьці, людзкой годнасьці і рашучасьці асобных афіцэраў і пасярэднікаў, напрыклад, генэрала Філіпа Марыёна альбо Рычарда Голбрука. Але якраз яны былі альбо адкліканыя з пасадаў, альбо зьявіліся на сцэне надта ж позна.

**5.**

У кнігарнях Граца цяжка знайсьці кнігу аб Босьніі альбо аб былой Югаславіі. Лёгка знайсьці кнігу Пэтэра Гандке. Гэты альбом з фатаграфіямі Лісьль Понгар і тэкстамі Гандке, названы „Ein Wortland. Eine Reise durch Kdrnten, Slovenien, Friaul, Istrien und Dalmatien"[1], выйшаў у мінулым годзе. Спакойны роздум над штодзённым жыцьцём, прыязная прырода, усё звычайнае, калі ня нуднае. Быццам нічога й ня здарылася. І сапраўды, дакладным вызначэньнем настрою гэтае кнігі было б: „Нічога не адбылося. Не хвалюйцеся, мае даражэнькія. Жывеце звычайна й ня слухайце тых, хто кажа аб

гістарычнай трагедыі“.
Гандке зарабіў сабе славы, заявіўшы, што — для яго самога — Сярэдняя Эўропа „мае выключна мэтэаралягічную вартасьць“. Такім чынам, ён дыстанцыяваўся ад трагічнага кляйма, што ляжыць на гэтай частцы Эўропы. Гэта было ў 1987 годзе. Славенскі пісьменьнік Драга Янчар, увайшоўшы зь ім у асьцярожную палеміку, скіраваў увагу на той факт, што „надта добра пазіраць на аблокі, што плывуць у нябёсах, але някепска глядзець і пад ногі, прынамсі, пакуль у Сярэдняй Эўропе ёсьць мінныя палі, калючы дрот ды Бэрлінскі мур“. Янчар піша знакамітае эсэ пад назваю „Аўгсбург“. „Радыё як толькі не вычвараецца, каб запэўніць замежных турыстаў у тым, што Славенія — ціхая краіна, што вайны там зусім няма. Вайна выглядае хіба з тэлевізійнай скрыні, што стаіць у куце. З гэтае дзюркі ў сьвет, празь якую ў ваш пакой няспынна ўвальваюцца новыя трупы“. Ён таксама паехаў у Сараева, пасьля чаго напісаў свой ашаламляльны „Кароткі рэпартаж з гораду ў даўгой аблозе“. Гандке, зразумела, таксама вырашыў туды зьезьдзіць, з той адно розьніцай, што калі вайна ў Босьніі ўжо скончылася. У пачатку 1996-га ён надрукаваў свой рэпартаж, сваю „Справядлівасьць для Сэрбіі“. Гандке стаў героем. Сэрбскі нацыяналіст Міларад Павіч, які разам зь ім езьдзіў у Косава, піша: „...файна мець Пэтэра Гандке. Але Пэтэра Гандке могуць мець толькі вялікія нацыі“. Але пакінем пакуль гэты нацыяналістычны экскурс убаку. Што сапраўды займае Гандке, дык гэта імкненьне падставіць пад сумнеў басьнійскую трагедыю, якую мы назіралі па тэлевізіі, аб якой чыталі ды якую бачылі на свае вочы. Усё гэта нерэальнае, усё гэта — вынік змовы сусьветных мас-мэдыяў. Ці існуе іншая рэчаіснасьць? Пісьменьнік не дае адказу, пісьменьнік затушоўвае карціну, кажа, што сапраўды незразумела, хто каго атакаваў, задаецца пытаньнем, а што ж насамрэч адбывалася ў Дуброўніку, і ці могуць мусульмане, якія паходзяць ад сэрбаў, лічыцца сапраўднаю нацыяй? Адказ ня мае значэньня, галоўнае — гэта датушоўваньне, падмена рэальнасьці. Гэта эўрапейскія пілюлі для тых, магчыма, хто адчувае згрызоты сумленьня, ня могучы заставацца безуважным да трагедыі, якая адбываецца так блізка, што нельга проста заплюшчыць вочы ці затыкнуць вушы. „Не хвалюйцеся, мае даражэнькія, — нібы паўтарае нам „мэтэароляг“. — Калі ўсё такое незразумелае ды сумнеўнае,

чаго ж непакоіцца ды спрабаваць у гэта ўлезьці? Не давайце веры журналістам, што намагаюцца зьнепакоіць вашае сумленьне, бо ўсё гэта толькі вынік сусьветнае змовы“.
Адзін з тае „арды журналістаў“, як кліча іх Гандке, — гэта Роджэр Коэн, карэспандэнт *New York Times*. Болей за пяцьдзясят ягоных калегаў былі забітыя пад час вайны ў былой Югаславіі. Коэн не дазваляе нам заставацца спакойнымі, ён ня згладжвае рэчаіснасьці, ён дае адказы на пытаньні. „Справядлівасьць для Сэрбіі“ імкнецца абысьці факты, „сягнуць у самыя глыбіні“ ды закляйміць барбарства „палітычнае літаратуры“. „Жорсткасьць, што ўзрасла ў сэрцах“ — рэалістычны, ангажаваны твор, у аснове якога ляжаць факты. Дастаткова прачытаць назвы абедзьвюх кніг, каб адчуць розьніцу.
Магчыма, Роджэр Коэн ня ўлез гэтак глыбака ў „духоўную сутнасьць рэчаў“, да якой заклікае Гандке; тым ня менш, ён, відавочна, дапяў да „самых нетраў нашага стагодзьдзя“. Зараз час зірнуць, як пад уплывам басьнійскага досьведу зьмяніўся заходні сьвет. „Гэта была ня толькі вайна, гэта была крывадушнасьць плюс крах маральных прынцыпаў“.

[1] „Слова пра зямлю. Вандроўка паўз Карынтыю, Славенію, Фрыюль, Істрыю й Далмацыю“ (ням.)

**6.**

Прафэсар Марыя Тодарава, чытаючы лекцыі ў Інстытуце гісторыі штату Флёрыда, сутыкнулася са стэрэатыпам „балканізацыі“. У 1998 годзе яна выдала кнігу пад назваю „Балканскі адбітак“ — адну з найбольш цікавых працаў, прысьвечаных гэтай тэме. У інтэрвію зь Анджэем Маравецкім, дадзеным у Чарнагорыі (*Tygodnik Powszechny*, 13.09.1998), яна выяўляе аб'ектыўнасьць сваіх навуковых поглядаў і крытыкуе амэрыканскіх журналістаў ды мас-мэдыі за антысэрбскія настроі, за стварэньне стэрэатыпаў ды маніпуляваньне імі. Калі прафэсар Тодарава распавядае аб сэрбскай жанчыне, якая жыве ў Бостане й сябруе зь немцам, — гісторыю аб тым, як яны абое пачалі заўважаць, як недарэчна зьмяніліся адносіны да іх некаторых студэнтаў у сувязі з тым, што хтосьці абвясьціў іх нацыстамі, — тады мы ўсе сымпатызуем бязьвінным ахвярам стэрэатыпізацыі (хаця ці можна ўскласьці віну за гэты выпадак на мас-мэдыі?). Нашыя сумненьні, аднак, вырастаюць, калі

прафэсар Тодарава сьцьвярджае, нібыта манера камэнтаваньня вайны ў былой Югаславіі амэрыканскімі мэдыямі залежала ад запатрабаваньняў грамадзтва, і кемлівасьць журналістаў дазваляла ім дакладна вызначаць, „куды вецер дзьме“. Гэта значыць, калі б „накірунак ветру“ быў іншы — а ён вызначаецца ў нейкім сьвецкім салёне групаю падазроных асобаў, якія рухаюць фігуркі на сусьветнай шахматнай дошцы, кіруючыся сваімі ўласнымі інтарэсамі, — тады, напрыклад, мы б маглі назіраць па тэлевізары за шматгадоваю аблогаю Бялграду, дый зусім ня з боку ісламскіх фундамэнталістаў, што прагнуць хрысьціянскае крыві. Хіба я перабольшваю? Але ж мэдыі могуць усё, асабліва такія адораныя людзі, як рэжысэр найпапулярнейшага „Шоў Трумэна“. Таму што стварыць геройскі вобраз Радавана Караджыча, які вядзе абараняльную бітву ад імя сваёй нацыі, якую мардуе ўзброенае да зубоў басьнійскае войска, зусім проста. У любым выпадку, як мяркуе прафэсар Тодарава, адлюстраваньне вайны ў амэрыканскіх мэдыях не было аб’ектыўным (чытай: было антысэрбскім). Гэта погляд гісторыка, які ўважлівым (чытай: аб’ектыўным) вокам глядзіць у тэлеэкран і бачыць там выяву закасьнелых адвечных стэрэатыпаў. „Я заўсёды лічыла, — кажа прафэсар Тодарава ў інтэрвію, — што да журналістыкі трэба ставіцца як да навуковай дзейнасьці“.

Якіх жа поглядаў прытрымліваюцца людзі па той бок экрану, тыя ж амэрыканцы, што ваявалі ў Сараеве? Джон Джордан (цытаваны Коэнам), паслухаўшы навіны *CNN* аб грамадзянскай вайне і тое, як ягоны прэзыдэнт выказвае задаволенасьць з нагоды паляпшэньня становішча ў Босьніі, што, маўляў, у 1994 годзе загінула людзей менш, чым у 1992, — пасьля такога „інфармацыйнага дазьняку“ гэты ваяка з Род-Айленду абурана выбухнуў: „Гэта ўсё падобна да жарту. Я табе скажу: у мяне там бы вочы раскрыліся, і я ўбачыў, на чым трымаецца Амэрыка... Гэта эўрапейскі горад, аперазаны бруднымі траншэямі ды людзьмі са зброяй у руках, якія штодня забіваюць дзяцей, і гэта нармальна... Гэта не грамадзянская вайна, гэта злачынства Мілошавіча“.

Але галоўнае ў высновах прафэсара Тодаравай датычыць ня мэдыяў. У рэшце рэшт, ніхто ня мае сумневу ў тым, што сродкі масавай інфармацыі патураюць стварэньню стэрэатыпаў, і я ўпэўнены ў тым, што, пашукаўшы антысэрбскіх настрояў сярод

журналістаў, сапраўды знойдзеш далёка не адзіны выпадак значнага адыходжаньня ад чыста прафэсійнага падыходу. (Гандке, напрыклад, адцемлівае, што ахвяры-мусульмане паказваліся пярэднім плянам часьцей за ахвяраў-сэрбаў). Але важнейшым ёсьць крыху іншае. Надыходзіць канец дваццатага стагодзьдзя — гэта пэрыяд, калі навука ўжо ня так занятая глыбокім вывучэньнем аднае этнічнае групы і доказам яе першынства сярод іншых. Яшчэ для ранейшае генэрацыі навукоўцаў дыскусія наконт анты- альбо прасэрбскасьці нечага прыцягвала надзвычайную ўвагу. На думку сучаснага навукоўцы прафэсара Тодаравай, галоўная прычына спрэчкі палягае зусім ня ў гэтым. У сьвеце, найвялікшымі вартасьцямі якога прагалошваюцца аб'ектыўнасьць, нэўтральнасьць, тэорыя сьціраньня адлегласьцяў, шматбаковасьць ісьціны, адноснасьць каштоўнасьцяў, — у гэткім сьвеце ніхто ня чуе голасу, які заклікае павярнуцца да маральных прынцыпаў: у літаратуры гэта вызначаецца як заангажаванасьць, у журналістыцы — як перадузятасьць, а на мове вайны гэта азначае падзяленьне на вінаватых і бязьвінных.

Марыя Тодарава, якая вывучала праблему з розных бакоў, прачытаўшы не адну кнігу, аб'ектыўным вокам разглядаючы дзейнасьць мэдыяў, ведае адно: „Праўда ў тым, — кажа яна ў інтэрвію, — што няма „чорнага" ці „белага". Гэта і зьяўляецца крэдам навуковае бесстароннасьці, якая рэкамэндуецца для журналістаў.

Роджэр Коэн, які быў у Босьніі пад час вайны, які размаўляў з прадстаўнікамі ўсіх бакоў канфлікту, які стаўся сьведкам людзкое трагедыі па ўсе бакі лініі фронту, таксама ведае толькі адно: ёсьць белае і ёсьць чорнае. Болей за тое, ад пачатку вайны палітыкі — а зь іх падачы й некаторыя мас-мэдыі — зрабілі ўсё дзеля таго, каб перакруціць праўду аб існаваньні „белага" і „чорнага". Словы „праўда ў тым, што няма „белага" й „чорнага", становяцца найвялікшым стэрэатыпам, найвялікшым цяжарам для Босьніі, альбо, хутчэй, падзеі ў Босьніі выкрылі адзін з найбольш шырока распаўсюджаных і безыменных стэрэатыпаў канца нашага стагодзьдзя. Як экспэрт у гэтых пытаньнях, прафэсар Тодарава відавочна пагаджаецца з тым, што стэрэатыпы спрошчваюць, вызваляюць ад адказнасьці, робяць лягчэйшым жыцьцё тых, хто ўвекавечвае іх — і, у выпадку Босьніі, найвыразьнейшым азначэньнем гэткай

сытуацыі было б: „Праўда ў тым, што няма ані „чорнага“, ані „белага“.
Улетку 1995 году, пасьля трохгадовае аблогі Сараева, адна жанчына адцягнула Роджэра Коэна ўбок і зірнула яму глыбака ў вочы. „Тут усё альбо чорнае, альбо белае, — сказала яна. — Так, ёсьць добрае і ёсьць злое. Злое — уверсе, на ўзгор’ях. Гэтак, калі ты кажаш, што ты журналіст і таму мусіш быць аб’ектыўным, і нешта напісанае табою можа ня быць добрым для нас, але добрым для тых злых людзей, я разумею цябе, але адначасова і ненавіджу. Так, я ненавіджу цябе. Кожны пытаецца аб тым, як нам тут жывецца. Яны пытаюцца ў нас. Што гэта такое — быць без электрычнасьці, бяз газу, без заробку, без жыцьця, урэшце? Што гэта значыць — стаяць у чарзе па ваду? Што гэта значыць — быць аб’ектам лябараторных дасьледаваньняў? Яны пытаюцца, пытаюцца, зноў пытаюцца. Але каб зразумець, вам, магчыма, трэба схадзіць на той бок. Там яны дадуць вам стрэльбу, вы зможаце выглянуць з-за будовы, уперыцца ў прыцэл і ўбачыць у ім чалавека. Тады вы зьведаеце, што гэта такое — быць *паляўнічым*. Вы націснеце на гачак, убачыце, як чалавек гэты падае, і тады вы зразумееце, што забілі яго. Гэта і ёсьць рэчаіснасьць. Рэчаіснасьць. І тады, магчыма, вам ня трэба будзе так шмат ведаць пра нас, вам нецікава будзе ведаць, ад каго мы там паходзім, чаму мы перайшлі ў ісьлам, ці ёсьць такая нацыя — мусульмане, ці існуе Босьнія, альбо хоць што-небудзь увогуле“.

**7.**

Размываньне адрознасьці паміж чорным і белым, атаесамленьне аб’ектыўнасьці зь бесстароннасьцю, недахоп адказнасьці і абыякавасьць да трагедыі — вось толькі некалькі сымптомаў нашага духоўнага стану, які Роджэр Коэн выводзіць з „самага нутра стагодзьдзя“. Босьнія сталася бязьлітасным выпрабаваньнем для палітыкі гуманітарнай дапамогі — апошняе, магчыма, духоўнае ілюзіі заходняга сьвету напрыканцы дваццатага стагодзьдзя. Гуманітарызм пачаў набіраць абароты ў Эўропе пасьля падзеньня Бэрлінскага муру. Канец халоднае вайны, падзеньне савецкае імпэрыі, стварэньне новых нацыянальных дзяржаваў — усё гэта прынесла з сабою

пагрозу новых канфліктаў, якія ў большасьці выпадкаў былі толькі на час прыпыненыя за часамі камуністычнае дыктатуры. Адказам на гэтыя пагрозы мусіў быць гуманітарызм, які стаўся прыцягальным зь некалькіх прычынаў. Коэн: „...Бясспрэчна, штодзённая дастаўка ў сярэднім амаль тысячы тонаў харчовае дапамогі для 2,7 мільёнаў жыхароў Босьніі выратавала не адно жыцьцё. Гэта стварае ўражаньне, быццам робіцца нешта, каб пазьбегнуць рызыкі ўзброенага ўмяшальніцтва. Гэта файна пасавала да палітыкі „шматбаковасьці“ — яшчэ аднаго выдатнага мэханізму для зьніжэньня ступені рызыкі... Ахвярнасьць прыцягвае эмоцыі і засьціць розум. Як якая непагадзь, гэтая невычэрпная крыніца разгортваньня драмы сучаснасьці надта лёгка ўспрымаецца тэлегледачамі“.
Так „мэтэаралёгія“ ізноў уздымае голаў, гэтым часам не ў публікацыях пісьменьніка, што спрачаецца з фактамі, а ў дактрынах міжнароднае палітыкі. Гэтак, як і тады, калі назіраньні за аблокамі, што плылі ў небе, адцягвалі ўвагу ад балючае рэчаіснасьці, цяпер там „змагаюцца з голадам сярод пацярпелых замест таго, каб спыніць дзеяньні мясьнікоў“.
Тое, што здарылася ў Босьніі, у вачох сусьветных кіраўнікоў было не вайною, а „гуманітарнай катастрофай“, нават „стыхійным бедзтвам“, бо карані міжпляменнай варажнечы сягалі ажно „з самое геены вогненнае“. Гэтыя тэорыі прывялі да стварэньня „зонаў бясьпекі“ і да ўвядзеньня эмбарга на пастаўку зброі ў сытуацыі, калі адзін з бакоў быў узброены да зубоў, а ў другога не было амаль нічога. Маргарэт Тэтчар назвала краіны Эўрапейскага Саюзу „саўдзельнікамі бойні“. Гуманітарызм таксама мае свой „адваротны бок“, у нечым пераклікаючыся з патасам Косавага поля, дзе параза абарочваецца перамогаю, а напад — абаронаю. Напрыклад, у адзін і той жа час яны гавораць пра абаронцаў барбарскае Босьніі і пра нэўтральных супрацоўнікаў гуманітарнае місіі; аблога Сараева была не сапраўднай аблогай, а „стратэгічна абгрунтаваным абкружэньнем“ з боку сэрбаў і „тактычна невыгоднай дыспазыцыяй“ басьнійскага войска; афіцэры UNPROFOR (кантынгенту ААН. — **Перакл.**), гледзячы, як Сараева гіне пад агнём цяжкое артылерыі, звычайна казалі: „Мы ня можам кантраляваць сытуацыю, але мы назіраем за ёю“; рэкамэндацыя „прадухіленьня атак“ на прыкладзе „абароненых зонаў“ даводзілася перш як „адбіцьцё атакаў“,

затым — як „гуманітарная дапамога“, а ў той самы час, калі армія генэрала Младзіча брала Срэбрэніцэ, з боку войскаў ААН не пачулася ніводнага стрэлу. Мала што зьмянілася з тых часоў, калі былы Генэральны сакратар ААН У Тан казаў, што ягоная арганізацыя — гэта „парасон, які складаецца, калі пачынаецца дождж“.

Роджэр Коэн сярод шматлікіх галасоў людзей, што былі шакаваныя выяўленым у Босьніі маральным заняпадам заходняе эліты, прыводзіць меркаваньне амэрыканскага дыплямата Чарльза Томаса: „Замежная палітыка — гэта як старая формула пацалунку: „Ідыёт, гэта ж так проста“. Мы павінны былі сказаць ім, калі вайна толькі пачалася: „Вы прыходзіце да згоды, вы спыняеце разбурэньне Сараева, альбо мы вас заб’ем“. Такое сьцьвярджэньне на пачатку вайны ў былой Югаславіі не магло зьляцець з вуснаў аніводнага дыплямата, палітыка альбо кіраўніка дзяржавы. Гэта было б цалкам відавочнай адмовай ад гуманітарысцкае рыторыкі і надта б ужо рэзала цывілізаваны слых, звыклы да выказваньняў у абарону правоў чалавека і чалавечых жыцьцяў. У 1995 годзе, пасьля буйнога паветранага налёту на войскі Караджыча і Младзіча, стала ясна, што толькі сілай можна спыніць злачынцаў і ўсталяваць мір. Пакуль тое — загінула 200 тысяч чалавек. Пытаньне аб тым, чаму спатрэбілася тры гады, каб спыніць гэтую бойню, чорнаю хмараю завісла над нашым сумленьнем.

Мірная дамова была падпісаная ў Дэйтане 14 сьнежня 1995 году. Калі Роджэр Коэн спытаўся ў Асіма, мужа тае жанчыны, якую застрэлілі ў аэрапорце, што ён адчувае, ягоны адказ гучаў прыкладна так: нічога. У тую зіму ў Сараеве не было радасьці. Дзіўнае заканчэньне вайны: вораг ня быў пераможаны, але й зло не перамагло. Я прыехаў у Сараева наступнай зімою, калі там перабываў Папа Ян Павал II. Папу ледзь ня зносіла ветрам на адкрытым стадыёне, пад несупынным сьнегападам. Ці пачуў хтосьці ягоныя словы: „Ністэ самі. Бог е са вама?“ (Вы не адныя. Бог з вамі). І вось ізноў зіма. Тут шукаюць работнікаў для адчысткі цэглы з даўным-даўно ўзарванага будынку гестапа. Цэгла тая паходзіць са спаленае сынагогі. У тым месцы, дзе калісьці была сынагога, зямлю ўжо разьвярнулі і паклалі фундамэнт. Джэвад паехаў на поўдзень. Я застаўся ў Грацы з Босьніяй.

*Пераклаў з ангельскае*
*Міхась Шупенька*
*паводле тэксту, дасланага аўтарам*

---

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima
[image]



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** [image] Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 12-04-2000**

да Зьместу 2(7)-2000 **Лоўрэнс Уэсклер**

# Жыццё і смерць героя

*Scott Anderson. The Man Who Tried to Save the World: The Dangerous Life and Mysterious Disappearance of Fred Cuny. — New York. Doubleday, 1999.*

**ЛОЎРЭНС УЭСКЛЕР**
супрацоўнік часопіса *New Yorker*. Аўтар кнігі *Boggs: A Comedy of Values* (1999). Артыкул пра Фрэда К'юні мы перадрукоўваем паводле *The New York Review of Books*, 1999 з ласкавай згоды часопіса.

**Я** вячэраў з Фрэдам К'юні ў ягоны апошні вечар у Нью-Ёрк-Сіці. Была сярэдзіна тыдня і сярэдзіна сакавіка 1995 году. Як потым высветлілася, вячэраў ён у той дзень не з адным мною. Праз некалькі месяцаў на памінальнай сустрэчы ў Вашынгтоне прысутныя нібыта спаборнічалі ў пошуку самай трапнай характарыстыкі К'юні: нехта называў яго добрым анёлам, нехта — постімперскім, посткаланіяльным Лоўрэнсам Аравійскім, нехта — гаспадаром над Катастрофамі. На той сустрэчы я спаткаў яшчэ прынамсі двух ці трох чалавек, што з ім у той дзень павячэралі. Успамінаючы, мы ўзнаўлялі ў галаве маршрут ягонага пераезду з аднога такога абеду на другі перад чарговай паездкай у далёкі свет — ці, дакладней, у самы, самы далёкі свет. Бо праз некалькі тыдняў яго забілі ў Чачэніі.
Ён быў вялікім чалавекам з вялікімі жаданнямі. „Чалавечыска-гара", як апісаў яго на памінках Арыя Нэер, кіраўнік сорасаўскага Інстытуту Адкрытага Грамадства, па чыёй просьбе К'юні распачаў сваю місію дапамогі ў Сараеве, што стала ўжо

легендарнай[1].
„Ён здаваўся вялізны, — казаў Нэер, — але не таму, што быў чалавек гучны (ён быў ціхі), не таму, што быў грубы (ён быў вельмі культурны), але дзеля розуму і адданасці, якімі ён проста свяціўся“.

Розум і адданасць — так, безумоўна, але было ў яго яшчэ неверагодна абаяльнае пачуццё гумару, якім ён іскрыўся заўжды, не толькі на той развітальнай вячэры. Я тады спытаўся ў К’юні нешта накшталт таго, што ім рухае на гэтым свеце, што прымушае ісці наперад. А ён у адказ узгадаў гісторыю, якая здарылася з ім у час адной з першых ягоных місіяў, у Біяфры на пачатку семідзесятых, дзе ён працаваў пілотам — там пад час грамадзянскай вайны арганізавалі паветраны мост для дапамогі насельніцтву. Аднойчы ён вывеў свой іржавы, нагружаны пад завязку самалёт на прабітую ў балоце ўзлётную паласу і выйшаў на сувязь з дыспетчарам, просячы дазволу. Яму адказалі: „Чакайце, пакуль не прызямліцца самалёт“. Ён назіраў, як той самалёт заходзіць на пасадку, і раптам заўважыў, што адзін з яго рухавікоў нешта задыміў. „Потым я пабачыў, што й другі загарэўся, — распавядаў К’юні, — потым трэці, і, урэшце, спалахнулі ўсе чатыры. Самалёт ірвануўся да ўзлётнай паласы, зрабіў віраж, накрэніўся... І з грукатам выбухнуў, і толькі кавалкі металу паляцелі ды шуганула полымя. Клубок лютага агню праляцеў якраз над маім бездапаможным аэрапланам і грымнуўся пры канцы паласы. У гэты самы момант у слухалках раздаўся пранізлівы голас дыспетчара: „Усё ў парадку, паласа свабодная для ўзлёту“. Нічога не спынілася — вы проста працягваеце рух; і гэтага нямала — проста працягваць рух“.
К’юні тады толькі-толькі вярнуўся са сваёй першай паездкі ў Чачэнію. Ён вывучаў сітуацыю там на замову Інстытуту Адкрытага Грамадства, і, як толькі размова зайшла пра гэтую апошнюю ягоную выправу, ён, здаецца, цалкам перамяніўся. „Чачэнія — самае жудаснае месца, якое я калі-кольвек бачыў“, — адназначна заявіў ён. Калі ўлічыць, што ён прайшоў праз Біяфру, Бангладэш, Шры-Ланку, Гватэмалу, Камбоджу, Самалі, Курдыстан і Сараева, дык гэтыя словы сапраўды нешта значылі. Ён распавядаў пра жахлівую разню, неверагодную жорсткасць гвалту, яго сляпы характар. К’юні толькі што падрыхтаваў

беспараўнаны па сваёй цвярозасці аналіз сітуацыі — выбітны прыклад халоднага, пераканаўчага, па-майстэрску празрыстага стылю, якім ён славіўся. Але ў той вечар К'юні распавядаў пра ўражанні з апошняй паездкі хутчэй сцішана, амаль узрушана, ці не без унутранага трымцення.

Ён апісваў тры лініі расійскага акружэння вакол чачэнскай сталіцы, Грознага. Вышэйшае расійскае камандаванне пагнала на штурм цэнтру Грознага тысячы зялёных салдатаў, зашуганых падлеткаў без аніякай падрыхтоўкі, без адпаведнай вывучкі. Не маючы ніякага ўяўлення пра тое, што трэба рабіць, яны сталі лёгкімі цэлямі для загартаваных абаронцаў гораду, байцоў-партызанаў з чачэнскіх вызваленчых сіл. Расійцы панікавалі, палілі ў роспачы па ўсім, што рухаецца. Другое кола акружэння, за некалькі дзесяткаў кіламетраў ад Грознага, складалася з малодшых і сярэдніх афіцэраў. Сведамыя агіднасці сваёй місіі, яны нічога не маглі зрабіць. Яшчэ ў некалькіх дзесятках кіламетраў далей стаяла трэцяе кола: элітныя ўдарныя войскі, рэзервы вышэйшага камандавання. Гэтыя ўжо лавілі не столькі чачэнскіх партызанаў, колькі тых сваіх суайчыннікаў, каму заманулася дэзерціраваць.

І праз гэтае патройнае кальцо — распавядаў мне К'юні ў той вечар — праточваўся няспынны паток згорбленых старэнькіх *бабушек*, расійскіх маці й бабуляў, што папрыязджалі выцягваць сваіх хлапчукоў з гэтага пекла дахаты. Салдаты ўдарных падраздзяленняў разгублена назіраюць за гэтым — а што яны яшчэ могуць рабіць? Далібог, не будуць жа яны страляць у сухенькіх расійскіх бабулек! К'юні распавёў мне, як ён неяк прысутнічаў на нарадзе сярэдняга афіцэрскага складу ў адным з расійскіх аддзелаў у другім эшалоне аблогі і раптам у пакой уварвалася нейкая старая, уся ў чорным, падбегла да свайго сына-лейтэнанта, схапіла яго за вуха і проста пацягнула на двор. Пры гэтым яна ўвесь час крычала. „Ну, і сорамна, мабыць, было ж афіцэрам за свайго калегу", — вырвалася ў мяне. „Магчыма, ім усім карцела, каб і іхныя мамкі прыехалі ды забралі іх", — заўважыў К'юні.

Яму ўдалося пабываць там скрозь, а аднойчы нават схітрыўся ў суправаджэнні групы чачэнскіх партызанаў аб'ехаць каналізацыйныя трубы й калектары ў цэнтры Грознага, каб ацаніць патрэбы зляканых, стэрарызаваных жыхароў гораду, што хаваліся там. Любы, хто чуў ягоныя вусцішныя расповеды

пра барыкады і бамбёжкі, засады і блокпасты, любы б сказаў: „Я ўпэўнены, ён ніколі туды больш не паедзе“. Але не быў бы то К’юні, каб ён не завершыў сваю жахлівую гісторыю бесклапотным: „Ну, трэ будзе туды яшчэ раз падскочыць“. Яму было толькі пяцьдзесят.

**2.**

Неадступнае і пакутна нявыснае пытанне пра тое, што менавіта адбывалася з Фрэдам К’юні на працягу наступных тыдняў, — галоўная і ці не адзіная тэма падрабязнай і інтрыгоўнай кнігі Скота Андэрсана „Чалавек, які спрабаваў выратаваць свет“, што нядаўна выйшла. У працы Андэрсана, якая мае падзагаловак „Небяспечнае жыццё і таямнічае знікненне Фрэда К’юні“, гаворка ідзе ў асноўным пра знікненне. Незвычайнае, творчае жыццё ўплішчанае ў сотню з гакам змястоўных, але непазбежна сціслых старонак на пачатку кнігі.

Гэта зразумелая стратэгія. Андэрсан — ветэран вайсковай журналістыкі, суаўтар (разам са сваім братам Джонам Лі Андэрсанам) праслаўленых *War Zones*, а пазней аўтар *Triage* — раману пра ваеннага фатографа, што перажыў кантузію, твору, які летась так ускалыхнуў чытацкую аўдыторыю. Праз месяц пасля знікнення К’юні *New York Times Magazine* даручыў Андэрсану расследаваць тое, што адбылося.

Пабачыўшы, на якую рызыку ішоў К’юні, вяртаючыся ў Чачэнію, адважваючыся паўтарыць тое, чаго ніхто ў цвярозым розуме не рабіў бы й разу, Андэрсан хвіліну вагаецца, разважае („Ці быў такі момант у Фрэда К’юні? Такі момант, калі ён урэшце пабачыў, з якой небяспекай ён сутыкаецца, але не здолеў гэта прызнаць? Тое крытычнае імгненне, калі ён не знайшоў у сабе мужнасці сказаць: гэта немагчыма, мусова адступіцца“?), а потым адкідае ўсе свае трывогі і ідзе далей.

Сярод самых моцных старонак кнігі тыя, дзе ён апавядае пра выключную бесчалавечнасць чачэнскай бойні, здраднасць нетрывалых сяброўстваў і поўную няяснасць матываў амаль усіх удзельнікаў гульні. Але шалёная прысутнасць аўтара крыху збівае чытацкую ўвагу ўбок, ці, дакладней, заблытвае галоўнае пытанне кнігі: што ў жыцці Фрэда К’юні вяло яго да гібелі? Паколькі аўтар нібыта імкнецца дакладна ісці па слядах

К’юні, то й мы не перастаем задаваць сабе пытанне: што магло рухаць Фрэдам К’юні?

Калі чытаеш перанасычаны падрабязнасцямі расповед Андэрсана, у пэўныя моманты кніга пачынае здавацца кашмарным сном, у якім няправільныя ніці разгадкі змяняюць адна адну, і ўсё цяжэй сачыць за імі[2].

Апроч таго, стратэгія канцэнтрацыі ўвагі на тым, што магло здарыцца з Фрэдам К’юні ў Чачэніі, небеззаганная, бо найхутчэй мы гэтага так ніколі й не даведаемся. Як адзначае раней сам Андэрсан: „Сярод усіх сур’ёзных памылак, якія можна зрабіць у адносінах да гэтага месца (Чачэніі), найпершая — гэта меркаванне, што яго можна з нечым параўноўваць, што там ёсць нейкая логіка“. Андэрсан піша, што „магчыма, самая смяртэльная“ памылка, якую можна зрабіць у дачыненні да Чачэніі і якую зрабіў Фрэд К’юні, „гэта думаць, што Чачэнію можна нейкім чынам уратаваць“. Андэрсан трапляе ў пастку сваёй уласнай версіі „Выратавання салдата Раяна“ — у пастку слабенькага спадзявання на тое, што, хоць К’юні ўжо сапраўды не ўратуеш, але яшчэ можна дакладна зразумець, што з ім папраўдзе здарылася. Памкненні зразумелыя і нават пахвальныя, але не больш за тое. Бо, як адзначае сам Андэрсан на пачатку, у дадзеным выпадку яны не маюць шанцаў на поспех.
І ўсё ж такі Андэрсан даволі пераканаўча апісвае матывы, што рухалі Фрэдам К’юні. Ягоныя амбіцыі як спецыяліста па бедствах, асабліва па барацьбе з наступствамі рукатворных катастроф (напрыклад, войнаў), на працягу апошніх пяці год рабіліся ўсё больш маштабныя. Калі быць дакладным, то некаторыя схемы, якія ён меўся ажыццяўляць па вяртанні ў Чачэнію пры канцы сакавіка 1995 году, ужо былі паспяхова выпрабаваныя ім раней. Ён хацеў арганізаваць дастаўку ў Грозны набораў інструментаў, якія б дазволілі рэшце гараджанаў самастойна аднаўляць пашкоджанае жытло. Ён хацеў арганізаваць спецыяльную радыёстанцыю, каб з яе дапамогай прасцей было адшукваць людзей, якія зніклі. Але сітуацыя была такая, што гэтых звычайных гуманітарных мераў ужо было замала.
За той апошняй вячэрай у Нью-Ёрку ён распавёў мне, як

пазнаёміўся з кіраўніком суседняй Інгушэціі, вайскоўцам. К'юні ён здаўся добрым чалавекам. У апошнія дні існавання савецкай імперыі той кіраваў адной з вышэйшых вайсковых вучэльняў, і такім чынам выйшла, што сярод ягоных вучняў былі як сярэднія афіцэры чачэнцы, так і расійцы. (Дзякуючы пасярэдніцтву генерала Аўшава камандзіры сярэдняга звяна рэгулярна дамаўляліся пра спыненне агню, але іхныя дамовы пра перамір'е гэтаксама рэгулярна зрываліся ў выніку жорсткіх паветраных атак, загады на якія аддавалі з Масквы.) К'юні дакладна не казаў, але я думаю, што ён меў планы паспрабаваць па вяртанні стаць пасярэднікам пры ўсебаковым вырашэнні гэтага канфлікту, ці, прынамсі, дабіцца такога спынення агню, пры якім можна было б эвакуяваць усё мірнае насельніцтва, што заставалася ў Грозным. Апавяданне Андэрсана ў цэлым пацвярджае маю здагадку.
На жаль, вярнуўшыся ў Чачэнію, К'юні трапляе пад удвая мацнейшы агонь падазрэнняў і контрпадазрэнняў, чым гэта нават было ў ягоны першы прыезд пару месяцаў раней (гэтыя падазрэнні ў яго асабістым выпадку ўзраслі пасля ягонага артыкулу ў *New York Review of Books*, дзе вельмі жорстка ацэньвалася роля Масквы ў гэтай трагедыі — артыкул з'явіўся якраз перад другім ад'ездам).

Андэрсан аналізуе магчымыя матывацыі ўсіх шматлікіх удзельнікаў трагедыі — перакладчыка К'юні, ягонага кіроўцы-чачэнца і двух расійскіх дактароў, што суправаджалі іх у апошняй паездцы (з пяці чалавек выжыў толькі кіроўца). Ён апісвае паводзіны калег К'юні з ягоных штабоў у Інгушэціі і Маскве, а таксама калег у Нью-Ёрку; шматлікіх чачэнскіх палявых камандзіраў і звычайных баевікоў, што часта смяротна варагавалі са сваімі начальнікамі; камандзіраў расійскай арміі і высокіх чыноў расійскай спецслужбы ФСБ і іхных падначаленых. Прычым у поле ягонага зроку трапляюць не толькі асабістыя мэты кожнага з іх, але і тыя падазрэнні, якія гэтыя людзі мелі наконт мэтаў іншых людзей (пытанне, ці сапраўды нехта быў ці мог быць шпіёнам нават і блізка не мае таго значэння проці пытання, ці ён альбо яна маглі ўспрымацца астатнімі як шпіёны).
Андэрсан заўважае, што К'юні, са свайго боку, на працягу ўсёй сваёй кар'еры сістэматычна разбураў кожнае раней

распаўсюджанае ўстойлівае ўяўленне пра сябе, што стварылася на папярэднім адрэзку жыцця. Аўтар бярэ сцвярджэнне, што К'юні забілі расійцы, і паслядоўна даводзіць, што гэта зрабілі не яны, а чачэнцы, а пасля робіць адваротнае. Урэшце Андэрсан усё ж прыходзіць да высновы, што пераважаюць доказы таго, што ўсё ж людзьмі, якія расстралялі К'юні і ягоную групу, былі чачэнцы — прынамсі, адна з іх „адмарожаных" груповак — але гэтая выснова фармулюецца толькі пасля жорсткага кола расследаванняў. Хоць галоўным пытаннем застаецца „як" і „чаму".

Андэрсан разглядае таксама версію, на якой урэшце спынілася сям'я К'юні. Згодна з ёй, другой місіі К'юні ў Чачэніі папярэднічала шырокая кампанія дэзінфармацыі, разгорнутая расійскімі спецслужбамі, якая мела на мэце пераканаць чачэнскае кіраўніцтва ў тым, што нязграбны замежнік — насамрэч антычачэнскі агент. Але Андэрсан лічыць, што гэтай версіі бракуе доказаў[3].

Ён прыходзіць да высновы, што К'юні і ягоная група былі забітыя па непасрэдным загадзе чачэнскага лідэра Джахара Дудаева. Але нашто Дудаеву трэ было забіваць чалавека, які адкрыта спрабаваў дапамагчы чачэнцам? Андэрсан адзначае, што К'юні разам са сваёй групай з невядомых прычынаў затрымаўся ў стратэгічна важным селішчы Бамут, дзе некалі месцілася савецкая ракетная база. (Магчыма, проста таму, што гэтая вёска была радзімай кіроўцы К'юні, а можа К'юні хацеў патрапіць туды, каб праверыць некаторыя дзіўныя гісторыі, што хадзілі пра гэтае месца.) У любым разе, Дудаеў гуляў на тым, што падтрымліваў цьмяныя чуткі пра тое, што ў яго недзе ёсць нейкая яшчэ савецкая атамная сыравіна. Андэрсан выказвае здагадку, што чачэнскі лідэр, безумоўна, не мог дазволіць, каб К'юні выехаў з Чачэніі або маючы пацверджанне гэтага факту, або доказы таго, што Дудаеў блефуе. Таму чачэнскі лідэр загадвае забіць К'юні 14 красавіка ў маленькай вёсцы Стары Ачхой каля Бамуту. (Сам Дудаеў загіне праз год, калі расійская ракета, выпушчаная з самалёта, накрые ягоны бункер, з якога ён гаварыў па тэлефоне.)

Апошняя версія Андэрсана здаецца імавернай, хоць сам ён, падобна, не вельмі ўпэўнены ў ёй. А мне падаецца, што тыя самыя факты вельмі добра складаюцца такім чынам, які пацвярджае версію сям'і К'юні. У любым разе, сам Андэрсан тут

вельмі дэталёва паказвае, што ў Чачэніі немагчыма нічога даведацца напэўна.

**3.**

Працу Андэрсана можна з поўным правам лічыць выніковай справаздачай па пытанні „знікнення К'юні". На жаль, кніга пра „з'яўленне К'юні" застаецца ненапісаная[4].

А што да жыцця, якое вёў К'юні, рызыкаў, на якія ён ішоў, і таго, наколькі яны павялічыліся, калі ён перанёс сваю ўвагу з прыродных катастроф на рукатворны „крытычны комплекс", вайну, і паколькі гэтыя надзвычайныя сітуацыі станавіліся ўсё больш і больш некіраваныя і небяспечныя, пазбаўленыя ранейшых стрымак эпохі халоднай вайны, то сапраўды славутай нітцы ўдачы К'юні судзілася калісьці абарвацца. Пытанне „як" з гадамі можа стаць усё менш і менш важным, асабліва калі ўзяць пад увагу погляды К'юні і тое, што ён рабіў, каб як мага паўней ажыццявіць свае прынцыпы.
Таямніцай застаецца пытанне пра тое, што рухала ім у жыцці. На памінальнай цырымоніі ў Вашынгтоне іншы стары калега К'юні, ангелец Марк Браўн, які цяпер працуе ў „Сусветным Банку, што Фрэд лічыў жудасным рэнегацтвам", як ён сябе прадставіў, згадаў, як аднойчы вечарам шмат гадоў таму, на рысавым полі на мяжы Таіланду і Камбоджы ён і К'юні спрабавалі вырашыць, што рабіць з сотнямі тысячаў камбаджыйскіх уцекачоў, якія кінуліся ў тамтэйшыя лагеры. „Мы сядзелі каля вогнішча, — успамінаў Браўн, — і я спытаўся Фрэда, як ён прыйшоў у гэтую справу. Ён глыбока ўздыхнуў, а потым распавёў, як аднойчы, некалі даўно, працаваў інжынерам. У ягоныя функцыі ўваходзіла кантраляваць работу брыгады з пяцідзесяці мексіканцаў, якія працавалі пры вялізнай машыне-асфальтаўкладчыку на будоўлі таго, што некалі стане *Dallas-Fort Worth Airport*. Было пад трэцюю ночы, цёмна, хоць на воўка ўзлезь. І вось ён паварочваецца, а на асфальце засталося толькі сорак дзевяць мексіканцаў. А асфальтаўкладчык катаецца далей. „Мігель, — раву я, каб перакрычаць гул, — Мігель!" І ніхто мне ўжо не адказвае. „Гэта ж капіталізм, — распавядаў ён мне, — і мы проста працягвалі працаваць —

такое было правіла, што нам нельга было спыняцца. На раніцу я звольніўся і вырашыў прысвяціць рэшту жыцця дабрачыннасці“. Пасля гісторыі, якую паведаў Браўн, хвіліну ўсе разгублена маўчалі, а потым усе, хто быў там, разрагатаціся. Але, Фрэд быў такі.
Дакапацца да сапраўдных каранёў паклікання К’юні крыху складаней, і ягоная няспынная самаміфалагізацыя тут нам толькі замінае. Усе гэтыя тэхаскія байкі былі важнай часткай ягонай натуры, хоць часта здавалася, што і байкі, і выхваленні — проста тактычны прыём: рэпутацыя чалавека, здольнага рабіць немагчымае, паўсюль ляцела папярод яго і моцна дапамагала цярэбіць шлях праз усе магчымыя бюракратычныя сітуацыі, у якіх ён часта пачуваўся як чужынец, бо, па сутнасці, быў фрылансерам-адзіночнікам. У мяне часта складалася ўражанне, што гэтыя байкі яму патрэбныя таксама, каб падтрымаць самога сябе — каб валодаць сабой у часта безнадзейных і страшэнна неспрыяльных умовах. Яму мусова было верыць у гэтыя гісторыі, і, больш за тое, ён прымушаў іншых людзей, часам нават тых, хто гэтыя падзеі бачыў на свае вочы, паверыць у сваю версію гісторыі.

Адно з найбольшых дасягненняў Андэрсана — у тым, што ён здолеў аддзяліць многія з выдумак К’юні ад не менш фантастычных фактаў. Для пачатку: К’юні нарадзіўся не ў Тэхасе — ён родам з Канэктыкуту, а ў Тэхас пераехаў яшчэ дзіцем разам з бацькамі. У маладосці ён быў тыповым амерыканскім кансерватарам (рэспубліканцам, прыхільнікам Галдуотэра) і меў юнацкую цягу да лётнай справы (а пазней нават яшчэ больш моцную цягу да планерызму). З малых гадоў ён адчайна прагнуў стаць пілотам авіяцыі флоту. Насамрэч, як распавядае Андэрсан, тое, што яму не ўдалася дасягнуць гэтай мэты, стала, магчыма, вызначальнай падзеяй ягонага юнацтва. Сам К’юні казаў, што ягоныя беды пачаліся, калі ён схітрыўся вылецець з марскога *Reserve Officers’ Training Corps* у тэхаскім сельскагаспадарча-тэхнічным коледжы і з самога коледжу таксама з-за нейкай дурноты (нешта, звязанае з пажарам у студэнцкім інтэрнаце. Паводле ягоных словаў, яго выкінулі не таму, што ён быў вінаваты ў пажары, а таму, што адмовіўся даказаць на вінаватых). Потым, распавядаў К’юні, ён, пераходзячы вуліцу, папаў пад таксі, што ехала са страшэннай

хуткасцю. У выніку яму раструшчыла нагу ў некалькіх месцах і ён стаў непрыдатны да вайсковай службы. Андэрсан жа сцвярджае, што цягнік К'юні па дарозе да станцыі-афіцэрства ўзброеных сілаў ЗША сышоў з рэек з-за акадэмічнай непаспяховасці, а менавіта (што здаецца іроніяй лёсу, калі ўзяць пад увагу далейшае жыццё К'юні) з-за трывалай няздольнасці выканаць патрабаванні курсу замежнай мовы. Тое, што К'юні не ўдалося стаць пілотам марской авіяцыі, мучыла яго ў сярэдзіне. Невымоўны сорам запёк яшчэ мацней, калі ягоныя калегі-кадэты і лепшыя сябры праз пару гадоў сапраўды сталі пілотамі, адправіліся ў В'етнам і пачалі адзін за адным гінуць у баях. Што ён рабіў, не падзяліўшы іхнага лёсу? Як ён увогуле збіраўся дасягнуць свайго? Пасля выключэння з першага коледжу ён паступіў у іншы тэхаскі коледж, „A&I" у Кінгсвіле, дзе падпаў пад уплыў вельмі моцнай асабістасці свайго выкладчыка паліталогіі, які змусіў яго пабачыць свет такім, якім ён ёсць насамрэч, — у прыватнасці, адкрыў яму вочы на становішча нелегальных імігрантаў, работнікаў-мексіканцаў, што працавалі ў раёне Кінгсвілю. Тое, што раней прыцягвала К'юні, цяпер стала яго жахаць. Гэта змяніла ягонае жыццё і прывяло яго ў палітыку. Яго захапіла вучоба. Студэнцкія гады скончыліся атрыманнем дыплому ў галіне горадабудаўніцтва ва універсітэце Х'юстану. (На гэтыя ж гады прыпаў кароткі і адзіны ў ягоным жыцці шлюб. У яго нарадзіўся сын; пасля разводу К'юні ўзяў на сябе апеку над ім, хаця ў выніку аказаўся не вельмі добрым бацькам, і хлопчыка выхоўвалі збольшага дзед з бабаю.)

Некалькі гадоў ён рабіў амаль тыповую для маладога архітэктара кар'еру, працуючы над праектам гіганцкага аэрапорту *Dallas-Fort Worth*. Але думкі ў яго ў галаве наўрад ці былі тыповыя: пры канцы лета 1969 году ён вырашае адправіцца ў заходнеафрыканскую краіну Бэнін рыхтаваць пляцоўкі для паветранага моста дапамогі насельніцтву Біяфры. Андэрсан выявіў, што, нягледзячы на знакамітую гісторыю пра катастрофу самалёта, па ўсёй верагоднасці К'юні ніколі не пілатаваў самалётаў з гуманітарнымі грузамі ў Заходняй Афрыцы, хоць на працягу некалькіх месяцаў працаваў, арганізуючы гэты паветраны мост. Яшчэ праз год К'юні наведаў Бангладэш, дзе аказвалі дапамогу ў ліквідацыі наступстваў аднаго з самых бязлітасных цыклонаў у гісторыі краіны. Там ён

сапраўды многа лётаў.
У гэтым і іншых незлічоных падарожжах К'юні паступова назбіраў уласны арыгінальны досвед і прыйшоў да справядліва крытычнай ацэнкі традыцыйных падыходаў да дапамогі ў ліквідацыі наступстваў катастроф. У 1971 годзе ён заснаваў *Intertect Relief and Reconstruction Corporation* са штаб-кватэрай у Даласе. Асноўным заказчыкам ягонай арганізацыі была ААН.
„Мне падабалася назва IRRC, гладкая і чыста тэхнічная, — сказаў ён аднойчы ў інтэрв'ю *The Wall Street Journal*. — Не якая-небудзь „Выратуем сялян..." Гэта было камерцыйнае прадпрыемства, хаця на нечым падобным наўрад ці заробіш вялікія грошы. У гэты час К'юні прыйшоў да высновы, што большасць дзяржаўных, недзяржаўных і міжнародных інстытуцый слухаюцца толькі тых парадаў, за якія яны плоцяць.

**4.**

„Катастрофы прыносяць людзям пакуты", — так праз многа год пачне ён сваю навуковую працу „Катастрофы і развіццё", адну з найбольш значных кніг апошняга часу на тэму ліквідацыі наступстваў катастроф[5].
„Яны раняць і забіваюць. Яны вядуць да стрэсаў і псіхічных траўмаў. Яны разбураюць дамы і прадпрыемствы, становяцца прычынай эканамічных цяжкасцяў і згалення многіх людзей. Найбольш церпяць ад катастроф беднякі".
Аднак другі параграф пачынаецца словамі: „Тыя, хто выжыў пад час прыроднай катастрофы, могуць сутыкнуцца з іншай трагедыяй". Гэта трагедыя ліквідацыі наступстваў трагедыі — такой ліквідацыі, якая яна звычайна практыкуецца.
Неразважныя наступствы гэтага „бедства" К'юні неаднаразова назіраў і выкрываў. Напрыклад, ён асуджаў памкненне дастаўляць харчаванне ў раёны, дзе толькі што адбылася катастрофа, бо відавочна, што такая дапамога можа выклікаць банкруцтва фермерскіх гаспадарак у раёне трагедыі. Ён звяртаў увагу на рамантычную схільнасць накіроўваць у такія раёны дактароў і медыкаменты, а не, скажам, банальных інжынераў з камплектамі трубаў, каб пачаць аднаўляць каналізацыйныя сеткі, што прадухіліла б непазбежныя ўспышкі халеры. Ён жахаўся, бачачы недарэчную ежу — вэнджаныя вустрыцы альбо

поўныя мяхі распушчальнага бульбянога пюрэ невядомага паходжання і невядомага ўжытку, якое мясцовыя жанчыны часам без задняй думкі выкарыстоўвалі замест пральнага парашку. Кароткачасовая інтэнсіўная дапамога часта прыводзіла да інфантылізацыі пацярпелага насельніцтва, у той час як на ягоныя сапраўдныя патрэбы ніхто не зважаў. А потым зацікаўленасць у далейшай дапамозе раптам знікала, між тым пад гэты момант мясцовая эканоміка была ўжо падарваная і залежная ў большай ступені, чым у тым выпадку, калі б ніякай дапамогі не аказвалася.
Але К'юні непакоілі і палохалі не проста недарэчнасці традыцыйнай мадэлі ліквідацыі наступстваў катастрофы, а самая філасофія. Па сутнасці — і гэта было проста рэвалюцыйнай тэорыяй — ён разглядаў катастрофы як удалыя магчымасці, як шанец на перамены ў грамадстве, і асабліва шанец, дадзены найбольш бяспраўным членам гэтага грамадства, знайсці ў сабе новы патэнцыял дзейнасці і новыя здольнасці. Ён хацеў распрацаваць метады дапамогі, якія б спрыялі рэалізацыі такіх магчымасцяў, а не перашкаджалі б ёй, ставячы людзей у перыяд пасля катастрофы ў становішча, калі яны то перасычаюцца, то галадуюць. Ён стаў спецыялістам у вынаходніцтве новых спосабаў аказання гуманітарнай дапамогі.

Гэта не заўжды давалася лёгка. У 1976 годзе пасля разбуральнага землятрусу ў Гватэмале К'юні адразу прыбыў на месца, апярэдзіўшы некалькі грузавых самалётаў з падоранымі краіне коўдрамі. Такую дапамогу паслалі ў краіну, палова экспарту якой складалася з ваўняных коўдраў! Ён хутка зразумеў, што Гватэмала патрабавала неадкладнага аднаўлення дарог, каб непацярпелыя раёны краіны маглі распачаць дапамогу пацярпелым (такім чынам паляпшаючы агульны эканамічны стан усяго рэгіёну). Але для аднаўленчых працаў трэ было наняць і навучыць як мага больш мясцовых (і на той момант беспрацоўных) работнікаў. У Гватэмале землятрусы здараліся часта, і краіна патрабавала напрацоўкі ўласнага досведу пераадоленьня іх наступстваў, які б прыдаваўся пасля шчэ доўгі час. Гватэмала таксама мела патрэбу ў праектах танных дамоў, лёгкае будоўлі і максімальна сейсмастойкіх. К'юні і ягоныя тамтэйшыя памочнікі

распрацавалі праекты такіх дамоў, якія лёгка можна было дэмантаваць і транспартаваць у аддаленыя вёскі.
Спачатку здавалася, што ягоная праграма мела вялізны поспех. Аднак бадай што яна была занадта ўдалая, бо прывяла да з'яўлення цэлага новага пакалення мясцовых лідэраў, прыхільнікаў самадастатковасці і самачыннасці; лідэраў, што потым пачалі пагражаць істэблішменту краіны, які, у сваю чаргу, адрэагаваў падрыхтоўкай батальёнаў смерці для барацьбы з канкурэнтамі. Далейшая бойня стала для К'юні жахлівай навукай і халодным душам. У сваіх далейшых аперацыях ён ужо ўлічваў і палітычную сітуацыю, і магчымае супрацьдзеянне магутных апанентаў.
Геній К'юні быў здольны схапіць спецыфічныя, складаныя мясцовыя асаблівасці любой новай сітуацыі. Напрыклад, ён ненавідзеў невядома кім прыдуманую сеткавую мадэль большасці палатачных лагераў для ўцекачоў. Яму падабалася больш чалавечая структура: круглыя лагеры, якія б па форме нагадвалі вёскі. Ён валодаў масай практычных ведаў у галінах будаўніцтва, гідраўлікі і медыцыны, ён разбіраўся таксама ў асаблівасцях розных тыпаў транспартных сродкаў, ён ведаў, як размесціць сховішча прадуктаў так, каб туды не праніклі ніякія даўганосікі, ён проста выпраменьваў досьвед. І пры ўсім гэтым фантастычная, амаль нялюдская вынаходлівасць. Аднойчы яму ўдалося спыніць голад, які пагражаў адному з рэгіёнаў Эфіопіі, маніпулюючы курсамі абмену валют на рынку гораду, што знаходзіўся за пару соцень кіламетраў ад галоднага краю.

На пачатку дзевяностых, калі К'юні ўсё больш засяроджваўся на непрыродных катастрофах, у прыватнасці, войнах, яго напаткаў, безумоўна, самы значны трыюмф і самая вялікая няўдача. Спачатку трыюмф, пасля няўдача. Пры канцы зімы 1991 году, пасля вайны ў Персідскім заліве і курдскага паўстання, што выбухнула пасля яе (да якога падштурхоўваў і якое пасля нібыта выпадкова прадказаў Захад), сотні тысяч курдаў у страху пакінулі свае вёскі, шукаючы паратунку ад наступаючых войскаў Садама Хусэйна ў цяжкадаступных горах на поўначы Іраку — менавіта там магла адбыцца самая буйная гуманітарная катастрофа стагоддзя. Пазней спецыяльныя амерыканскія сілы былі накіраваныя ў гэтыя горы для стабілізацыі сітуацыі, але, як хутка зразумеў К'юні, прыбыўшы

туды (па кантракце з Дзяржаўным дэпартаментам ЗША), наўрад ці ў тых гарах можна было нешта зрабіць з той простай прычыны, што там, наверсе, няма вады.
На той момант сотні курдаў ужо памёрлі ад неспрыяльных кліматычных умоваў, тысячам пагражалі хваробы. К'юні хутка распрацаваў дзёрзкі план бяспечнага вяртання амаль паўмільёну людзей у свае вёскі, што й было рэалізавана ўсяго за два месяцы. Усё, што ён мусіў дзеля гэтага зрабіць, — гэта стаць неафіцыйным камандзірам амерыканскіх ваенных аддзелаў і ажыццявіць серыю абсалютна несанкцыянаваных маланкавых захопаў тэрыторыі. На кожным этапе рэалізацыі свайго плану яму прыходзілася гіпнатызаваць Садамавы войскі ці то проста пустымі пагрозамі, ці то абсалютна гіпатэтычнай перспектывай прыбыцця падмогі.
Гэты план, здавалася, працаваў, іракскія войскі каціліся назад, напалоханыя тактычным блефам К'юні, а ў Вашынгтоне панавала разгубленасць. „Дзе вы цяпер ёсць?" — крычаў па спадарожнікавым тэлефоне ўяўны кіраўнік К'юні з Дзяржаўнага дэпартаменту. „У Дахуку", — адказваў К'юні, нічтожэ сумняшэся. „Але Рада Нацыянальнай Бяспекі вырашыла, што мы не будзем накіроўваць войскі так далёка ў глыбіню тэрыторыі Ірака", — раз'юшана пратэставаў дэпартаменцкі чыноўнік. „Мы толькі што, — адказваў К'юні, — прынялі стратэгічнае рашэнне наступаць. Вашынгтон у хуткім часе яго ўхваліць". І неўзабаве, калі паўмільёну курдаў сапраўды вярнулася ў свае хаты на працягу двух месяцаў, Вашынгтон сапраўды ўхваліў гэтае рашэнне.
Натхнёны гэтым трыюмфам, К'юні адправіўся ў зморанае голадам Самалі. Там фактычна ўся дазвання гуманітарная дапамога раскрадалася бандамі ўзброеных да зубоў марадзёраў яшчэ на дарозе ў сховішчы, з якіх яе мелі размяркоўваць. Вярнуўшыся ў Вашынгтон, К'юні яшчэ раз выступіў за жорстка спланаванае і дакладна разлічанае ваеннае ўмяшанне. З увагі на ягоны на той момант поспех у Курдыстане, пра які ўжо хадзілі цэлыя легенды, яму далі выказаць сваю пазіцыю ў адміністрацыі прэзідэнта Буша. Канечне, ягоны голас быў ці не наймацнейшы сярод тых, што выступалі за амерыканскае ўмяшанне, але К'юні дабіваўся зусім не такога ўмяшання, якое адбылося на самой справе. К'юні перасцерагаў і ЗША, і ААН, каб тыя ні ў якім разе не спрабавалі арганізоўваць базы ў

буйных гарадах. Лёс гарадоў няхай вырашаюць камандзіры варагуючых самалійскіх груповак. Базы гуманітарнай дапамогі трэба размесціць у правінцыі; тады зоны міру і парадку стануць разрастацца вакол іх, як толькі самалійцы пачнуць штодня наведваць гуманітарныя цэнтры і ўключацца ў абмен таварамі. Тыя, хто прымаў рашэнні, пабралі пад ногі парады і засцярогі К'юні. Штурм самалійскай сталіцы Магадыша глядзеўся нашмат больш тэлегенічна, чым лагеры ў глухой бязлюднай пустэльні. Вынікі аказаліся катастрафічныя, акурат такія, як К'юні і прадказваў. Але з правалам гуманітарнай місіі ў Самалі свет стаў баяцца распачынаць любыя іншыя гуманітарныя інтэрвенцыі ў іншых рэгіёнах свету.

Не маючы магчымасці даць рады ў Самалі, К'юні ляціць у Боснію (у гэты раз на запрашэнне Джорджа Сораса, які выдзяліў 50 мільёнаў даляраў на арганізацыю дапамогі абложанай баснійскай сталіцы). Нейкім чынам здарылася так, што сітуацыя ў Сараеве зрабіла на К'юні глыбейшае ўздзеянне, чым любы з ягоных ранейшых досведаў, — прынамсі, так ён часта сцвярджаў. Там у ягоным жыцці з'явілася жанчына, хаця пасля ў яго будуць іншыя жанчыны. Ён прасякнуўся пакутамі больш касмапалітычных, проці іхных суседзяў, баснійцаў-мусульманаў (больш за два гады ён дзяліў з імі нягоды). І ён проста шалеў ад злосці, што свет аказаўся такі палахлівы перад абліччам жудасцяў, чынёных на Балканах. К'юні прыказваў: „Калі б у 1939 годзе існавала ААН, мы б цяпер усе гаварылі па-нямецку".

Аднойчы К'юні сказаў мне: „Гэтае правіла дзейснае для любой катастрофы буйнога маштабу: калі ты здолееш вылучыць тую частку бедства, якую разумееш, значыць, урэшце ты, як правіла, пачнеш разумець усю сістэму". Гэта значыць, калі ты зможаш паспяхова вырашыць нейкую малую частку праблем, якія спарадзіла катастрофа, значыць, потым ты зможаш паспяхова выратаваць усю сітуацыю. У Сараеве К'юні хутка скмеціў, што сербскія снайперы рэгулярна абстрэльваюць жыхароў, калі тыя выходзяць з дамоў па ежу, дровы, ваду. У адказ ён увесь час кантрабандай завозіў насенне, каб гараджане маглі вырошчваць гародніну проста ў дварах ці кватэрах. Ён завёз 24 кіламетры пластыкавых труб, каб можна было падлучыцца да магістральнага газапроваду, што праходзіў праз горад (а потым ішоў у Бялград, значыць, яго не

павінны былі адрубіць). Такім чынам ён забяспечыў цяпло і агонь для дзесяткаў тысячаў людзей. Апошняя і самая смелая задумка К'юні — завоз зробленай на заказ сістэмы ачысткі вады даўжынёю дзве сотні ярдаў, сканструяванай у Тэхасе, а потым прывезенай у выглядзе модульных сегментаў самалётамі С-130 і схаванай у старым дарожным тунелі. Гэта быў стрыжань бліскучага плану наладжвання водазабеспячэння дамоў у большай частцы гораду. Апошні праект сутыкнуўся з упартым супрацьдзеяннем з самага нечаканага боку: працівіліся карумпаваныя элементы ў самім баснійскім мусульманскім урадзе, ненажэрныя камандзіры, што мелі сваю выгаду з продажу вады. Апроч таго, былі й чыноўнікі, якім надта не хацелася ахвяраваць відавочным прапагандысцкім эфектам таго, што кожны дзень камеры замежных журналістаў буйным планам фіксавалі, як мірных жыхароў забіваюць у той момант, калі яны так кранальна бягуць да грамадскіх калодзежаў. Не адзін месяц К'юні дабіваўся магчымасці адкрыць кран. Нарэшце яму дазволілі, і тое, што ягоная сістэма сапраўды была для гораду збавеннаю, прызналі праз год, калі сербы зрабілі апошнюю і самую жорсткую спробу задушыць Сараева. Але, як адзначае Андэрсан: „Бяздушная пасіўнасць баснійскага ўраду — „ахвяраў" — паставіла пад сумненне адно з самых важных для К'юні ўяўленняў пра гуманнасць, якое вяло яго і якім ён кіраваўся на працягу ўсяго свайго жыцця: а менавіта ідэю, што людзі добрыя па сваёй прыродзе".
У сярэдзіне дзевяностых ствараласа ўражанне, што К'юні згубіў духоўную раўнавагу. Андэрсан прыводзіць словы, якімі асцярожна характарызуе К'юні яго сараеўская сяброўка: „Звышскладаны чалавек, якім рухалі адначасова спагада і ўласная неспатоленая прага прызнання", а таксама дзёрзкасць, якая была, як яна сказала, „своеасаблівай хваробай". Яму здавалася, што тое, што ён робіць — не дае эфекту, і гэта ўсё больш мучыла яго, ён пакутаваў ад сваёй няздольнасці пераканаць Вашынгтон у неабходнасці больш прынцыпова рэагаваць на гуманітарныя катастрофы. Андэрсану К'юні тых апошніх месяцаў бачыцца чалавекам, прагненні якога не здзейсніліся і які гатовы адважыцца на новую мэту — вельмі няясную місію ў Чачэніі, у гэтым самым жахлівым месцы ў свеце.

Ягоная смерць была сама па сабе невымернай трагедыяй. Ён жа літаральна ратаваў дзесяткі, а можа і сотні тысячаў жыццяў. За чатыры гады, што прайшлі пасля ягонай смерці, тысячы людзей заўчасна загінулі з-за таго, што яго болей няма, што ён больш не можа дапамагчы. Часта можна пачуць, што, каб ён быў жывы, усё было б па-іншаму ў лагерах уцекачоў на межах Косава, Усходняга Тымору ці Анголы. Сёння К'юні было б пяцьдзесят пяць год. Ён быў неабходным, незаменным чалавекам не толькі дзеля поспеху сваіх бліскучых гуманітарных акцый. Зараз увесь гуманітарны рух у крызісе, сутнасць якога К'юні нібыта прадчуў задоўга да таго, як гэтае самае ўсвядомілі астатнія. Гэтаксама ён адчуваў і сутнасць многіх іншых рэчаў. І трудную няпэўнасць „бесстаронняга" ўмяшання ў канфлікт, падчас якога адзін бок яўна катуе другі; і часта супярэчлівыя мэты ваенных і гуманітарных місій, і маніпуляванне шчырама клопатам з дапамогай прапагандысцкімх махінацыяў. Цяпер, калі мы спрабуем пераадолець гэтыя складаныя крызісы, магчыма, самая вялікая нашая страта заключаецца ў тым, што рабіць мы гэта вымушаныя без дапамогі ўласцівага К'юні яснага, выключна арыгінальнага разумення таго, як можна дапамагаць людзям у бядзе, і таксама таго, што многія спосабы дапамогі ім зусім не прыносяць карысці.

*Пераклала з амерыканскай Аляксандра Андрыеўская*
паводле *The New York Review of Books*.

[1] Я й пазнаёміўся з К'юні, апісваючы ягоныя подзвігі ў Сараеве ў сваім артыкуле „*Talk of the Town*" у часопісе *The New Yorker*.

[2] А да таго ж рэдактар кнігі надзіва непатрабавальны і няўважлівы, асабліва гэта тычыцца паўтораў. Возьмем толькі адзін прыклад. Апошнія словы, што сказаў Фрэд К'юні сваёй асістэнтцы ў Маскве ў „душэўнай" размове па тэлефоне перад выездам у Чачэнію — „Проста думай пра мяне", — упершыню сустракаюцца на старонцы 23; потым, на старонцы 214, аўтар цытуе наступнае: „Было доўгае маўчанне, а пасля ён мне вельмі мякка адказаў: „Проста думай пра мяне". Далей пры

апісанні гэтай самай сітуацыі на старонцы 348 К'юні ўжо адказвае „прыцішана, спалохана".
[3] Андэрсан даказвае, што ФСБ проста не меў патэнцыялу й вопыту, каб правесці настолькі складаную і майстэрскую кампанію: амаль усе расійскія дзеянні ў Чачэніі вылучаліся крайняй тупасцю. Гэтая ж аргументацыя, цікавым чынам, гучыць у супрацьлеглым кантэксце: аўтар аргументуе тое, што К'юні, хутчэй за ўсё, не быў агентам CIA, хоць, несумненна, меў кантакты з амерыканскімі і іншымі ваеннымі выведкамі і спецслужбамі, рэгулярна звяртаючыся да іх па дапамогу дзеля рэалізацыі сваіх уласных праектаў, а наўзамен перадаючы ім тую інфармацыю, якую меў. У пацверджанне гэтага Андэрсан цытуе наступны кавалак з газеты *Dallas Morning News*: „На самым пачатку аперацыі дапамогі курдам (1991) вакол Фрэда К'юні трымаўся арэол таямніцы... Здавалася, што гэты высокі сівавалосы чалавек з Даласу ў сініх джынсах і важных каўбойскіх ботах прысутнічае скрозь. „Мабыць, CIA, — выказаў здагадку адзін журналіст. — Не, гэты не з CIA, — адказаў другі. — Гэты ведае, што робіць..."
[4] Яшчэ адной важнай крыніцай гэтай патэнцыйнай біяграфіі будзе кранальны і змястоўны дакументальны фільм Шэры Джонз (1997, *PBS Frontline*) *The Lost American*. Мне здаецца, што Джонз выбрала лепшую структуру для свайго твору: больш як на тры чвэрці ён прысвечаны жыццю і менш як на чвэрць — знікненню. Джонз і яе група таксама прыйшлі да думкі, што К'юні і яго калег забілі чачэнцы, хаця яны не маюць такой упэўненасці адносна прычынаў гэтага. Фільм апраўдана дапускае магчымасць звычайнага рабаўніцтва (у К'юні была каля сябе добрая сума даляраў гатоўкаю). Далей у сваім артыкуле я грунтуюся і на матэрыяле Андэрсана, і на матэрыяле Джонз, а таксама на асабістых размовах з К'юні за

некалькі год.

[5] Гэтая кніга (*Oxford University Press*, 1983), на жаль, болей не перавыдавалася. З самых апошніх выданняў, блізкіх па духу да ідэяў К'юні, гл. *Rimberley Maynard „Healing Communities in Conflict: International Assistance in Complex Emergencies"* (*Columbia University Press*, 1999).

*Фота Дмітра Дэйнова.*

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
[image]
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **12-04-2000**